ISBN 978-985-6941-64-4

Нацыянальны інстытут адукацыі

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

ФАКУЛЬТАТЫЎНЫЯ ЗАНЯТКІ

Л. К. Цітова

# «БРАМУ СКАРБАЎ СВАІХ АДЧЫНЯЮ...»

6 КЛАС

Дапаможнік для вучняў

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ

Беларуская літаратура
Факультатыўныя заняткі

**Л. К. ЦІТОВА**

# «СЛОВА — РАДАСЦЬ, СЛОВА — ЧАРЫ...»

**6 клас**

***Дапаможнік для вучняў агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання***

*Рэкамендавана Навукова-метадычнай установай «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*

Мінск
«Літаратура і Мастацтва»
2010

УДК 821.161.3.09(075.3=161.3=161.1)
ББК 83.3(4Беи)я721
Ц74

Серыя заснавана ў 2010 г.

**Цітова, Л. К.**

Ц74 «Слова — радасць, слова — чары…»: 6 клас : дапаможнік для вучняў агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / Л. К. Цітова. — Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2010. — 136 с. — (Беларуская літаратура. Факультатыўныя заняткі).

ISBN 978-985-6941-64-4.

**УДК 821.161.3.09(075.3=161.3=161.1)**
**ББК 83.3(4Беи)я721**

**ISBN 978-985-6941-64-4.**

© Нацыянальны інстытут адукацыі, 2010
© Афармленне. РВУ «Літаратура і Мастацтва», 2010

# Дарагі дружа!

Ты прачытаў шмат цікавых твораў, напісаных па-беларуску. Героі іх, напэўна, і сёння прыходзяць табе на ўспамін, бо кнігі — нашы добрыя сябры і надзейныя спадарожнікі. Кнігі прыносяць нам радасць ад сустрэчы з літаратурнымі героямі і захапляльнымі падзеямі, даюць парады падчас жыццёвых выпрабаванняў, пашыраюць наш досвед і кругагляд. Мастацкая літаратура надзвычай моцна ўплывае на людзей, робіць іх больш мудрымі, чулымі і ўважлівымі, прымушае перажываць яшчэ не зведаныя пачуцці, разважаць над рознымі жыццёвымі праблемамі і ўчынкамі персанажаў — нездарма яе называюць чалавеказнаўствам. Чытаючы добрую кнігу, мы заўсёды задумваемся, як бы мы самі пачуваліся, апынуўшыся ў няпростых сітуацыях, якое б шукалі выйсце. Мастацкія творы спрыяюць нашаму пазнанню саміх сябе і ўсведамленню свайго месца сярод людзей.

Літаратура — яе яшчэ называюць прыгожым пісьменствам — адзін з відаў мастацтва, мастацтва слова. Яна ўзбагачае нас духоўна, фарміруе наш густ. Літаратура дае мастацкае адлюстраванне жыцця: праз мастацкія вобразы перадае найбольш значныя падзеі і стварае цікавыя чалавечыя характары. Але мастацкі твор — не дакладнае, фа-

таграфічнае адлюстраванне жыцця, а вынік яго пераўтварэння пісьменнікам — чалавекам таленавітым, творчым, з багатай фантазіяй, які добра ведае жыццё і людзей.

Факультатыў «Слова — радасць, слова — чары…» дапаможа табе ўдасканаліць свае аналітычныя ўменні, апавядальніцкае майстэрства, творчыя магчымасці, нават у пэўнай ступені паспрыяе развіццю акцёрскіх здольнасцей. Вуснае маўленне — не толькі змястоўнае і зразумелае чытанне альбо выказванне, яно абавязкова павінна быць эмацыянальным, вобразным, цікавым, пераканальным. У працэсе публічнага чытання або расказвання асаблівую значнасць мае індывідуальнасць прамоўцы, яго выканальніцкае майстэрства, развітае творчае ўяўленне, здольнасць да імправізацыі, свабоднае валоданне сваім голасам, багацце слоўнікавага запасу, веданне нормаў літаратурнага вымаўлення. Слухач жа вучыцца эмацыянальна ўспрымаць літаратурны твор, асэнсоўваць і ацэньваць пачутае, удзельнічаць у абмеркаваннях і дыскусіях.

Чытай як мага больш, удумліва аналізуй апісаныя падзеі і ўчынкі персанажаў, разважай і рабі высновы, атрымлівай асалоду ад хараства мастацкага слова. «Пасябраваўшы» з кнігамі, ты ніколі не будзеш адчуваць недахопу ў вясёлых суразмоўцах, верных таварышах, мудрых дарадцах. Набывай чытацкі вопыт, развівай свае чытальніцкія здольнасці, вучыся ўважліва ставіцца да мастацкага слова, спрабуй свае сілы і ў літаратурнай творчасці. Пашырыць веды пра сакрэты пісьменніцкага майстэрства табе дапамогуць школьны падручнік па літаратуры і гэты дапаможнік. У канцы яго змешчаны кароткі слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў, веданне якіх дапаможа спасцігнуць таямніцы прыгожага пісьменства.

# І. Слова прамаўляе...

*Генадзь Бураўкін*

## Край мой

Не залаты зусім,
не срэбны,
Быў на табе заўсёды ўбор
Звычайны самы, самы зрэбны:
Зялёны луг ды сіні бор,
Каля дарогі жыта ў полі,
Вярба старая ля ракі
Ды ў жоўтым восеньскім прыполе
Рабін даспелых аганькі.
Ты не сляпіў вачэй.
Быў просты
Ва ўсе вякі твой родны ўзор:
Гаёў бялюткая бяроста,
Густы блакіт лясных азёр,
І лён, зусім як неба,
сіні,
І ўсе ў рамонках берагі...
Мой беларускі, мой адзіны
Край, ад калыскі дарагі...

1. Якой уяўляецца паэту родная зямля? Якія карціны ўсплываюць у яго памяці? Пра што нагадалі аўтару знаёмыя краявіды?

2. Якія пачуцці абудзіла ў паэта сустрэча з мілымі сэрцу мясцінамі? Знайдзіце ў тэксце выразныя доказы таго, што аўтар з вялікай пяшчотай, замілаваннем, любоўю ставіцца да сваёй Бацькаўшчыны.

3. Якім паўстае ў вершы вобраз Радзімы? Чаму паэт называе родны край *адзіным, ад калыскі дарагім?*

4. Як вы разумееце выразы: *у жоўтым восеньскім прыполе / Рабін даспелых аганькі?*

5. Растлумачце сэнс радкоў: *Не залаты зусім, // не срэбны // Быў на табе заўсёды ўбор: // Звычайны самы, самы зрэбны...* Як вы разумееце слова *зрэбны*? Якая карціна паўстае ў вашым уяўленні?

6. Якія радкі верша, на вашу думку, найбольш дакладна перадаюць душэўны стан паэта, яго хваляванні і перажыванні?

7. Якія паэтычныя вобразы вам найбольш спадабаліся?

8. Падрыхтуйцеся да выразнага чытання твора: удакладніце выканальніцкую задачу, прадумайце інтанацыю, тэмп чытання, каб найбольш дакладна перадаць аўтарскія думкі і пачуцці і выказаць свае адносіны да верша.

## Мастацтва выразнага чытання лірычнага верша

Лірычны верш — велічны і непаўторны свет, які раскрывае нам, чытачам, багатую гаму аўтарскіх думак і перажыванняў (асалоду, захапленне, радасць, расчараванне, абурэнне, боль, смутак і інш.). Паэт давярае нам таямніцы сваёй душы, спадзеючыся на тое, што мы правільна яго зразумеем, адгукнёмся шчырасцю на споведзь яго сэрца. Мастацкае слова нікога не можа пакінуць абыякавым, яно ажыўляе ў фантазіі чытача розныя вобразы, выклікае асабістыя асацыяцыі.

Паэт дзеліцца з намі сваімі асабістымі перажываннямі і разважаннямі, імкнецца выявіць сваю любоў да прыроды,

перадаць захапленне прыгажосцю свайго краю, багаццем і мілагучнасцю роднай мовы, выказаць заклапочанасць яе сучасным станам. Яму падуладна мастацкае слова, якое стварае сапраўдны цуд.

Выразнае чытанне — гэта свайго роду мастацтва. У кожным канкрэтным выпадку пры чытанні верша будзе стаяць свая чытацкая задача. Прачытаць выразна — гэта значыць перадаць голасам усе думкі і пачуцці, якія выказаў у вершы паэт, і выклікаць у слухача сапраўднае ўзрушэнне. Каб выразна прачытаць лірычны верш, неабходна вызначыць яго настраёвасць, асэнсаваць пачуцці аўтара, абудзіць у сваім уяўленні вобразы, створаныя паэтам, і перадаць пры чытанні ўсе эмоцыі і перажыванні, выказаныя ў вершы.

Чытальнік павінен выдзеліць голасам словы, найбольш важныя для перадачы сэнсу верша. Выдзеліць — значыць зрабіць на іх лагічны націск. Вялікае значэнне пры выразным чытанні маюць правільна вытрыманыя паўзы, якія дапамагаюць акрэсліць закончанасць думкі, завершанасць намаляванай карціны, перадаць адценні пачуццяў. Асобныя паўзы супадаюць са знакамі прыпынку, іншыя расстаўляюцца чытальнікам згодна з сэнсам твора. Разгледзьце партытуру фрагмента верша «Край мой» Генадзя Бураўкіна і самастойна падрыхтуйце партытуру астатняй яго часткі:

**Не** **залаты** зусім, //
**не** **срэбны**, //
Быў на табе / заўсёды **ўбор** //
**Звычайны** самы, / самы **зрэбны**: //
Зялёны **луг** / ды сіні **бор**, //
Каля дарогі / **жыта** ў полі, //
**Вярба** старая / ля ракі //
Ды ў жоўтым восеньскім **прыполе** //
**Рабін** даспелых / аганькі.

Майстэрства выразнага чытання, як і ўсялякае іншае, прыходзіць з працай, стараннем, вопытам. Выразнае чытанне развівае наша ўяўленне, паглыбляе эмоцыі, абвастрае ўспрыманне, павышае маўленчую культуру, дазваляе перажыць радасць творчасці. Чытайце лірычны верш удумліва і эмацыянальна, імкніцеся ў чытанні перадаць аўтарскія пачуцці і свае эмоцыі.

1. Што значыць выразна прачытаць лірычны верш?
2. Як можна навучыцца выразнаму чытанню вершаў?

***Янка Сіпакоў***

* * *

Дружа мой!
Хочаш,
Я падарую табе
Самае-самае дарагое,
Што помню?
Я падарую табе
Ручаінку дыму
Над маёю роднай вёскаю,
Над маёю ціхаю хатаю,
Над нашым шаноўным комінам,
Бруйку дыму,
Якую я берагу з дзяцінства
І якая пахне і сёння мне
Толькі што спечаным
Хлебам...

1. Якія радкі верша вас найбольш уразілі? Якія паэтычныя вобразы вам запомніліся?
2. Якім уяўляецца вам паэт? Абгрунтуйце свае здагадкі.

3. Якія аўтарскія думкі і пачуцці выяўлены ў творы? Ці блізкія вам погляды аўтара на жыццё? Раскажыце пра свае адчуванні.

4. Да каго, на вашу думку, звяртаецца паэт у сваім вершы?

5. Звярніце ўвагу на будову твора, яго гучанне. Чым ён адметны?

6. Якія ўласныя пачуцці вы хацелі б перадаць пры чытанні?

7. Падрыхтуйцеся выразна прачытаць яго (вызначце моўныя фрагменты, расстаўце лагічныя націскі і паўзы, падбярыце адпаведную інтанацыю).

***Сяргей Законнікаў***

* * *

Зямля мая,
ты для мяне — як дзіва,
Як першы дотык любае рукі,
Як у спякоту млосную ільдзінка,
Як на кашулі белай васількі.
Мне б толькі быць з табой —
ну, хоць бы верасам,
Расінкай,
што пад промнямі дрыжыць.
Ты пражывеш і без мяне,
я ведаю,
А мне ніколі без цябе не жыць.

1. Вы прачыталі яшчэ адзін верш — прызнанне паэта ў любові да сваёй зямлі. З чым параўноўвае аўтар сваю зямлю?

2. Што ў вершы вас найбольш уразіла? Якія вобразы падаліся вам блізкімі?

3. Якім вам уяўляецца аўтар верша? Якія пачуцці і думкі ён выказвае?

## Кантрольныя пытанні і заданні

1. Прыгадайце творы, змешчаныя ў гэтым раздзеле. Чым узбагацілі яны ваша ўяўленне пра родную зямлю?

2. Пазнаёміўшыся з вершамі гэтага раздзела, вы пераканаліся, што кожны паэт па-свойму выяўляе любоў да сваёй старонкі, бацькоўскага краю. Які з вершаў раздзела вам асабліва спадабаўся? Абгрунтуйце свой выбар.

3. Беларуская зямля — якая яна ў вашым уяўленні? Паспрабуйце абагульніць свае ўражанні і падрыхтаваць невялікую вусную замалёўку на адну з тэм: «Мой родны кут, як ты мне мілы!», «Бацькаўшчына светлая мая…». Прыгадайце паэтычныя вобразы, якія вас найбольш усхвалявалі, былі сугучнымі вашым пачуццям і думкам. Падбярыце ілюстрацыі да сваёй замалёўкі, скарыстаўшы рэпрадукцыі карцін вядомых беларускіх мастакоў або фотаальбомы В. Алешкі «Спатканне з лесам», В. Бараноўскага «Белавежская пушча», А. Клешчука «Пад небам Беларусі» ці якую-небудзь іншую фотаілюстрацыю.

4. Правядзіце на занятках конкурс на лепшае выразнае чытанне твораў пра родны край. Прыгадайце, што значыць прачытаць верш выразна, і падрыхтуйцеся паўдзельнічаць у конкурсе з чытаннем на памяць аднаго з вершаў, які вам больш падабаецца. Падумайце, якія пачуцці вы хочаце выклікаць у слухачоў, і пастарайцеся яго выразна прачытаць.

5. Падрыхтуйце ўласныя малюнкі тых куточкаў Бацькаўшчыны, што вам найбольш падабаюцца. Наладзьце ў класе выстаўку рэпрадукцый карцін прыроды беларускіх мастакоў, мастацкіх фатаграфій з роднымі краявідамі, сваіх малюнкаў.

# II. Слова заварожвае...

## Міфы

*Міфы — народныя паданні пра паходжанне свету, жыццё прыроды і чалавека.*

Міфы ствараліся на працягу многіх стагоддзяў. Нашы продкі былі безабаронныя перад стыхіямі прыроды. Назіраючы за прыродай, яны вытлумачвалі з'явы навакольнага свету паводле сваіх уяўленняў, здагадак. У адным выпадку прыпадабняючы прыроду чалавеку, у другім — насяляючы свет незвычайнымі істотамі, багамі і духамі, людзі прыдумвалі фантастычныя гісторыі пра з'явы прыроды.

Людзі адухаўлялі прыроду, верылі, што яна можа дапамагаць чалавеку ў яго штодзённых клопатах ці шкодзіць яго жыццю. Яны баяліся сваімі размовамі, дзеяннямі, учынкамі ўгнявіць сілы прыроды і таму ўсяляк стараліся ім дагадзіць, улагодзіць іх. Нашы прашчуры абагаўлялі птушак, жывёл і звяроў, пакланяліся кветкам, дрэвам, камяням.

***Анатоль Бутэвіч***

## Перуновага племені дзеці

*(Скарочана)*

### ***Пярун***

Людзі здаўна верылі ў незвычайныя здольнасці бога маланкі і грому, апекуна нябеснай вады Перуна. Яго прасілі, каб паслаў чаканы дождж, каб не пабіў збажыну градам. Як толькі ранняй вясной Пярун адмыкае сваім залатым ключом неба, з яго падае дождж і сеецца раса, якія лічыліся нябеснымі слязамі. Выклікае гэтыя слёзы Перунова кветка плакун-трава, якую ў народзе называлі слёзнікам. Лічылася, што кветка і корань слёзніка валодаюць магічнай сілай. Каб не згубіць іх чароўных якасцяў, збіраць трэба раннім досвіткам на Іванаў дзень.

Такімі ж уласцівасцямі беларусы здаўна надзяляюць чароўную папараць-кветку, якая цвіце толькі адзін раз за год. Гэта бывае на Купалле: у поўнач 7 ліпеня на папаратнікавае кустоўе сыходзіць Перуноў агонь. Менавіта ён ператвараецца ў нябачнай прыгажосці кветкі, якія назвалі Перуновымі. Яны надзелены такой магутнай сілай, якая ўтаймоўвае нячысцікаў, знішчае чары чараўнікоў і ведзьмаў, збаўляе ад д'ябальскіх спакусаў. Таму, хто знойдзе чароўную папараць-кветку, адкрываюцца самыя таемныя таямніцы прыроды, усе злыя духі павінны яму падпарадкоўвацца. Добрым і сумленным людзям кветка паказвае, дзе ў зямлі схаваны скарбы. Але адшукаць Перунову кветку вельмі цяжка, бо служкі злога бога Чарнабога выяўляюць усе свае хітрыкі, каб перашкодзіць гэтаму. Мо таму нікому з беларусаў да гэтай пары не ўдалося знайсці тую незвычайную кветку?

Перуна малілі вешчуны — каб не наслаў на зямельку бяды. Бацькі ставілі яго ў прыклад малым — каб раслі дужымі ды смелымі, каб нікога і нічога не баяліся. Перуном палохалі нядобрых і хцівых людзей — каб не рабілі шкоды. Яго асцерагаліся неслухі — каб не пакараў пажарам альбо смерцю. А ён мог лёгка зрабіць усё гэта, ды яшчэ шматкроць больш. Бо сапраўды быў магутным з магутных, ні з кім непараўнальным. Ведама — нябесны гаспадар, уладар сусвету. Пасля Сварога ён стаў богам усіх багоў. Наймацнейшы з мацнейшых. Ваяўнічы і грозны, справядлівы абаронца пакрыўджаных. Той, хто карае і хто мілуе. Сваімі вогненнымі стрэламі забівае дэманаў і цудзішчаў, знішчае свайго галоўнага ворага — Змея, які крадзе ў людзей жывёлу, замінае дажджу, чыніць ім іншую вялікую шкоду.

Сімвалам Перуна здаўна лічыўся конь, выяву якога ў спалучэнні з сімвалам агню людзі выразалі на налічніках сваіх хат як надзейны абярэг ад злога.

Характар у Перуна запальчывы. Калі засярдуе барадаты велікан, пачынае шпурляць на зямлю свае вогненныя сякеры. З нечуваным гулам і аглушальным трэскам ляцяць яны праз усе шэсць нябёсаў, выкрасаюць маланкі ды снапы іскраў. Воблакі і хмары праліваюцца тады дажджом. Які б вораг ні трапіўся, ніхто жывым не застанецца. Сякера ж глыбока ў поле ўрэжацца, ажно зямля здрыганецца, а выбух несціханым рэхам коціцца па палях і лясах. Калі ж пашанцуе некаму знайсці тую Перунову сякеру, той на ўсё жыццё шчаслівым стане.

У гонар Перуна называлі розныя мясціны. Дагэтуль захаваліся на нашай зямлі Перунова гара, Перунова поле, Перуноў дуб, Пярун-камень. Земляробы заўсёды з нецярпеннем чакалі першага вясенняга грому, якім Пярун адмыкаў зямлю. Пасля гэтага можна было пачынаць працу ў полі. Існавала павер’е, што падчас першага грому варта пакачацца спіной па зямлі, тады ніколі не прыстануць ніякія хваробы. Людзі баяліся залішняй ваяўнічасці Перуна, але і моцна шанавалі яго найперш за тое, што абараняў дабро і караў зло. А яшчэ — што падараваў ім агонь. Таму на старажытных капішчах — так называлі даўней язычніцкія свяцілішчы — перад выявай Перуна днём і ноччу гарэў святы непагасны Зніч. Часам і самога Перуна называлі агнём. Ці не адсюль паходзіць праклён: «Каб цябе Пярун спаліў»?

Каб не сердаваў, Перуна стараліся задобрыць, яму прыносілі ахвяры, шанавалі ягонае свяшчэннае дрэва — дуб, ягоную птушку — арла. З пашанай звярталіся да ягонай жонкі Грамаўніцы, якая лічылася багіняй лета.

Калісьці ў Вільні знаходзілася самае галоўнае капішча нашых продкаў — капішча Перуна. Ягоная выява разам з выявамі іншых язычніцкіх багоў стаяла і ў Пантэоне кі-

еўскага князя Уладзіміра, які абвясціў Перуна галоўным сярод багоў.

Панаваў Пярун найбольш летам, таму ягоны дзень святкавалі 20 ліпеня. А калі на зямлю прыходзіў бог холаду Зюзя, Пярун з'язджаў туды, дзе цяплынь ды гарачыня — на сёмае неба. Але, здаралася, вяртаўся ў ранейшыя ўладанні і зімой. Страшнымі былі тады ягоныя вогненныя стрэлы, шмат бяды прыносілі.

Людзі лічаць, што Пярун апякуецца буслямі. Яны дагэтуль вераць: там, дзе паселіцца бусел, запануе згода і шчасце, а ў той дом, каля якога буслінае гняздо, не б'е Пярун з маланкай. Калі ж, крый Божа, буслы не вярталіся з выраю, трэба было чакаць вялікай бяды.

Пераемнікам Перуна пасля прыняцця хрысціянства стаў прарок Ілля. На ўсё, што ўмеў рабіць Пярун, здатны і Ілля. У вогненнай калясніцы ўзнёсся ён на неба і адтуль кіруе громам. Іллёў дзень прыпадае на 2 жніўня. У гэты час бывае шмат шумных навальніц з гулкімі грымотамі і бляскам маланак. Каб не гнявіць нябеснага жыхара, людзі ў гэты дзень не працавалі на полі. Ілля так прыйшоўся даспадобы, што ягоныя дзеянні часам не адрознівалі ад Перуновых.

## ***Вялес***

Далёка за межамі Беларусі вядомы горад Брэст. Легенда сведчыць, што заснавальнікам яго стаў адзін багаты купец. Вёз ён свой тавар праз тутэйшыя балоты. Ды збіўся з дарогі, трапіў у такую багну, што вось-вось з жыццём развітаецца. Але не разгубіўся, пачаў масціць дарогу бяростаю ды бярозамі. Так і ўратаваўся разам з таварам. А каб

аддзячыць вышэйшай сіле за спагаду, заснаваў капішча ў гонар бога Вялеса, прынёс яму ахвяры. Неўзабаве на гэтым месцы вырас старажытны горад, названы Бярэсцем.

Хто ж быў шанаваны і спагадлівы Вялес, якога называлі яшчэ Воласам? Гэта адзін з самых старажытных дахрысціянскіх багоў. Нароўні са Сварогам і Перуном належаў да вярхоўных багоў дахрысціянскага пантэона. Свята Вялеса адзначалі 5 ліпеня па старым стылі. Вялесавым нябесным палацам было сузор'е Вялікай Мядзведзіцы, што на Млечным Шляху. Калі галоўны бог багоў Пярун лічыўся богам князя і ягонай дружыны, дык Вялес — богам усяго іншага люду.

Вялеса называлі вялікім падземным богам, апекуном багацця, валадаром мудрасці, знаўцам чараў. Як уладар падземнага гаспадарства і трыдзесятага царства, ён загадваў таемным светам памерлых, дзе горы і дрэвы былі з чысцюткага золата. Меў статус вышэйшага суддзі, пераносіў душы памерлых з рэальнага свету ў небыццё, узважваў іх на шалях і абвяшчаў свой прысуд: накіроўвацца ім у рай ці ў пекла.

Волас — значыць, валахаты, касматы. Як магутны мядзведзь альбо чалавек у мядзведжай скуры. Высокага росту, плячысты — сапраўдны волат. Меў доўгія валасы і бараду. Часам, аднак, яго ўяўлялі старым згорбленым дзядком, кудлатым і трохвокім. У загадках называлі лысым валом, ягоныя выявы часам былі з бычынымі рагамі і місай малака ў руцэ. Паляўнічыя, калі збіраліся на мядзведзя, пераапраналіся ў скуру гэтага звера. Верагодна, спачатку Вялес быў богам паляўнічай здабычы — «богам мёртвага звера». Але ўжо ў бронзавым веку, калі пачаліся перасяленні пастухоў, Вялес-мядзведзь стаў апекуном і свойскай жывёлы.

Галоўным багаццем тады і нават грашыма лічылася свойская жывёла. Людзі з яе дапамогай апрацоўвалі зямлю. З яе атрымлівалі воўну, скуру і футра для адзення. Дзякуючы ёй сяляне мелі малако, сыр, масла, а майстры ды ўмельцы — рогі і косці. Лічыцца, што першапачаткова нават слова «багаты» азначала «мае бога», «карыстаецца заступніцтвам бога». А вось «убогі» значыла «пазбаўлены бога». З усіх усходніх славян найбольш шанавалі Вялеса беларусы. Дрэнных гаспадароў ён караў бедным ураджаем, а дбайных заахвочваў багатым. Сяляне ахвяравалі яму апошнюю жменю нязжатых каласоў. Іх завязвалі вузлом і пакідалі на ржышчы — Вялесу «на бародку». Часам побач ставілі апошні сноп — «дзедаву бараду», пазней ён цэлы год захоўваўся на покуці ў сялянскіх хатах. Мо менавіта адтуль пайшла традыцыя спраўляць дажынкі?

Вялесавымі дрэвамі лічыліся арэх і елка. У іншых месцах свяшчэнным быў і ясень, з якога рабілі абярэгі. А яшчэ імя Вялеса звязана з культам камянёў. Яму належалі камяні-краўцы і камяні-шаўцы, вужыныя і змеевы камяні, камяні, якія называліся Вол, Валы, Быкі. Днём Вялеса лічыўся чацвер масленічнага тыдня. На Масленіцу пяклі аладкі і частавалі імі свайго апекуна.

Вялес быў для людзей такім «свойскім» богам, што ягонае апекаванне ўвесь час пашыралася. Неўзабаве ён стаў богам магіі, чараўніцтва і мудрасці. Пасля — апекуном музыкаў і паэтаў, спевакоў і ўсіх творчых людзей. Паслугоўвалі Вялесу чарадзейныя птушкі Гамаюн і Воран. Яго даручэнні выконваў кот Баюн.

Аднак і гэта не ўсе іпастасі Вялеса. Лічылі, што Вялес апякуецца таксама вытокамі рэк, крыніцамі і вадой наогул, але толькі той, што ў зямлі. Мо за гэта ў яго гонар назвалі азёры, якія знаходзяцца на Браслаўшчыне, — Во-

лас Паўднёвы і Волас Паўночны? Ля аднаго з іх у старадаўнасці было капішча Вялеса.

Вялеса называлі богам закаханых, яму адводзілі ролю спрыяльніка ў прыбаўленні сям'і. У дзень Вялеса можна было ўкрасці будучую жонку, праўда, з яе згоды. Калі праз тры дні «злодзей» вяртаўся да цешчы, каб забраць падушкі, яму даравaўся гэты грэх. Маладая сям'я атрымлівала благаславенне бацькоў і пачынала жыць у згодзе ды ладзе, пад зычлівай апекай Вялеса нараджаючы дзетак.

З тых далёкіх часоў захавалася традыцыя адзначаць свята Аўласа, альбо Уласа, Валоссе. У некаторых месцах удзельнічалі ў ім толькі жанчыны. Над мужчынамі пацяшаліся, жартавалі, іх бралі ў палон. Каб вызваліцца, трэба было адкупіцца…

У гэты ж дзень жанчыны прымалі ў сваё грона нядаўніх замужніц. У іх гонар спявалі песні, частавалі прысмакамі, выказвалі спадзяванне, што неўзабаве яны стануць добрымі іхнімі супольніцамі. Жанчыны пакеплівалі з непаважлівых ды няздатных кавалераў. Халасцяку, які доўга не мог ажаніцца, завальвалі дзверы вялізнай калодай, якая лічылася сімвалам бясплоддзя.

## ***Жыжаль***

— Не чапай, сынок, там Жыжа, — просіць мама сваё дзіцятка. Малое няўцямна пазірае на агонь і не разумее, дзе Жыжа і хто гэта? Там жа адно вугалькі свецяцца, звабліва падміргваюць трапяткім полымем, дакрануцца да іх запрашаюць. Але акурат гэтыя светлячкі і пагражаюць небяспекай: апячы могуць. Такім чынам нядрэмны Жыжаль ахоўвае сваё жытло.

Не ведае хлапчаня, што Жыжа, Жыж, Жыжаль — гэта даўні бог агню, якога шанавалі нашы далёкія продкі. Акрамя таго, Жыжаль быў богам кавальскай справы — ці бачылі вы, якія снапы іскраў шугаюць, калі за працу бярэцца майстравіты волат-каваль? Іменна Жыжаль выкаваў для Сонца залатую калясніцу, а для Месяца — сярэбраную. І гуляюць Месяц з Сонцам на небе ў даганялкі — сабе на забаву, людзям на пацеху. Гэта Жыжаль пастаянна куе богу грому Перуну вогненныя стрэлы. Калі ж натоміць Жыжаль рукі і захоча адпачыць, то нябесны грамавержац не мае чым палохаць людзей, аціхае Перуноў запал. А над Жыжалевай кузняй заўсёды непагасны агонь свеціцца. Днём — гэта Сонца, ноччу — Месяц, а іскры зоркамі мігцяць. З даўняга часу ад пакалення да пакалення перадаюцца легенды пра «цёплага» бога Жыжаля. Жыве ён у глыбокіх глыбінях зямлі, куды ніводнае чалавечае вока не зазірала. Калі ціхенька ходзіць ён па сваім падземным царстве, тады проста сагравае зямлю. А калі пачне спяшацца ды бегаць, выбухаюць сапраўдныя пажары. Ажно на паверхню вырываецца полымя. Гараць тады лясы і нівы, загараюцца нават тарфяныя балоты, дзе чэрці з нячысцікамі ад людзей пахаваліся. Гэткім чынам бог агню Жыжаль дапамагае Перуну змагацца са злымі памочнікамі Чарнабога.

Бывае Жыжаль і ўпартым, злосным. Калі ўнадзіцца ды разахвоціцца, шмат шкоды наробіць людзям пажарамі ды засухай на палях. А як нагуляецца ўволю, калі надакучыць па свеце лётаць, супакоіцца, падабрэе, зноў у зямныя глыбіні апусціцца, каб знутры зямлю саграваць. На паверхні ж сёе-тое на памяць пра сябе пакіне. Таму і кажуць людзі, што Жыжаль пасяліўся ў кожнай хаце, спіць да пары да часу ў печы, туліцца на прыпечку. Каб сагрэць людзей, ежу згатаваць — бо добра яму і ўсцешна разам з імі.

Не адно стагоддзе жывуць людзі ў згодзе ды насцярозе з агнём. Дзеля ўшанавання Жыжаля ладзілі цікавае свята Жаніцьба Пасвета, альбо Жаніцьба Коміна. Адзначалася яно ў верасні. Каб не Жыжаль, то бог холаду Зюзя памарозіў бы не адно малых дзетак, а і дарослых людзей, хатнюю жывёлу звёў бы са свету, выстудзіў бы жыллё. Жыжаль не дазваляе Зюзю разгуляцца, бо з кім жа тады застанецца бог цяпла? Так дагэтуль і барукаюцца Жыжаль з Зюзяй. Ніхто нікому не паддаецца, ніхто канчатковую перамогу не святкуе. Толькі на вясну ды лета выпраўляецца Зюзя ў свае халодныя краіны, каб там сілы набрацца, а марознай зімой разам з мяцеліцамі ды завірухамі на запрэжанай ваўкамі брычцы вярнуцца назад.

А вось Жыжалю ніколі няма адпачынку — днём і ноччу шчыруе ахоўнік цяпла і жыцця, не спіць ні зімой, ні летам, ні на хвіліну вачэй не зводзіць. Ведае, што калі засне, то Зюзя адолее яго, і запануюць тады на свеце холад і смерць. Без цяпла, вядомая рэч, нішто жыць не можа. А дзе цяпло — там радасць, там згода, там жывое жыццё віруе. Таму людзі навучыліся шанаваць і падтрымліваць Жыжаля, паважаць ягоную старасць, моц і магутнасць. Шмат казак, песень, легенд, прыказак, замоў, выслоўяў, загадак складзена пра агонь, пра Жыжу. Лічылася, што агонь валодае незвычайнай ачышчальнай сілай. Таму купальскай ноччу палілі вогнішчы, скакалі праз агонь, а пасля шукалі чароўную папараць-кветку, збаўчы агеньчык якой павінен прынесці шчасце.

Людзі ведалі аберагальную моц святога агню. Мо таму ад магчымага пажару засцерагалі сябе таксама агнём. Каб падчас навальніцы гром з маланкай не нарабілі шкоды, у хаце запальвалі грамнічную свечку. Лічылася, што найбольш карысны «жывы» агонь. Гэта агонь, здабыты трэн-

нем дрэва аб дрэва. Ён найлепш лечыць хворых, яшчэ дужэйшымі робіць здаровых, спрытна праганяе з хаты нячыстую сілу, надзейна разганяе цемру і холад. Таму лічылася вялікім грахом пляваць у агонь — бо засярдуе Жыжаль і пакарае. Хто гэта зробіць, у таго губы папухнуць альбо вогнік нападзе — хвароба такая. Нельга было кідаць у агонь нічога дрэннага, нячыстага, бо гэта знявага бога агню, і таму на целе з'явяцца балячкі. Няможна было заліваць агонь вадой.

Некалі нашы продкі нястомна зберагалі агонь на язычніцкіх капішчах. Каля яго ачышчаліся ад благога і нядобрага, з ім дзяліліся сваімі жаданнямі, надзеямі ды спадзяваннямі. Туды быў забаронены ўваход не адно чужынцам, а людзям без веры, без спагады, без душы. Гэты незгасальны агонь называўся Знічам, ён стаў для беларусаў своеасаблівым сімвалам, які вёў за сабой да лепшага жыцця. Ва ўсе часы прывабна і прыветна свяціўся ён для змагароў за волю і шчасце народа.

Сёння ва ўсіх храмах, пад абразамі на покуці ў многіх дамах гарыць свечачка альбо лампадка — свяшчэнны агонь нашай веры, сведка неўміручасці жыцця і заклік берагчы і шанаваць жыццё як найвышэйшы Божы дар. Згарае свечачка, а цяпло яе ўзносіцца да неба, дзе былі шаты магутнага Пяруна — першастваральніка агню.

Ласкавы агонь заўсёды дадаваў чалавеку радасці, добрага настрою, святочнасці. Нездарма так вабяць да сябе купальскае вогнішча, турысцкі касцёр, пастухова цяпельца, прыветны агеньчык у начным акне… А людская радасць, выкліканая агнём, дагэтуль жыве ў каляровых ілюмінацыях, квяцістых феерверках, маляўнічых салютах.

## *Зюзя*

Даўным-даўно нашы прашчуры пакланяліся язычніцкім багам. І калі іншых багоў шанавалі многія славяне, то бога зімы і холаду Зюзю ведалі толькі на беларускіх землях. Як зазначае вядомы даследчык П. Шпілеўскі, імя «халоднага» бога паходзіла ад слова «зюзець», гэта значыць, мерзнуць, калець ад марозу.

Ад гэтага, відаць, пайшло яшчэ адно слова — «акалець», што значыла памерці, ахалодаць, страціць жыццёвую сілу. Лічылася, што зіма з усім сваім воінствам прыязджае на зямлю на пярэстых кабылах альбо на ваўках. Пасля яна становіцца на ногі і пачынае сваю сцюдзёную справу: скоўвае зямлю, будуе на рэчках ледзяныя масты, ажно да неба дабіраецца, дзе ад холаду дрыжаць нават зорачкі.

Па-рознаму ўяўлялі людзі Зюзю. Але ўсе, бадай, сыходзіліся, што гэта стары тоўсты дзед. Нізенькага росту. У яго белыя, як снег, валасы і такая ж белая і доўгая барада. Паназірайце калі-небудзь, як апускаюцца з неба мяккія сняжынкі, як кружацца яны ў бясконцым танцы. Гэта бог зімы Зюзя ціхім снегавеем плыве над зямлёй. Здаецца, нябачны дзед сваёй пушыстай барадой замятае ўсе сцежкі і дарожкі, атуляе снегам дрэвы ў лесе і садзе, насыпае высокія гурбы, выраўноўвае палі і лугі.

І вось дзіва, гэты стары не зважае на мароз: чым ён мацнейшы, тым яму лепш. Ходзіць па сыпкім снезе босы, без шапкі — і радуецца. Апрануты Зюзя ў доўгае белае футра. Блукае па белым свеце з вялізнай жалезнай булавою ў руцэ. Калі нехта раззлуе яго, так стукне булавою ў пень, што несціханы гул да неба далятае, а пень на дробныя трэсачкі рассыплецца. Вось тады і пачынаюцца

самыя маразы. Таксама траскучыя. Калі ў такім настроі Зюзя з’явіцца ў вёсцы, то і там наступае халадэча. Ходзіць Зюзя дзе хоча, пагруквае булавою па дрэвах, па платах, а то возьме і з усёй сілы смальне ў сцены хаты.

Асабліва любіць гэткія забавы светлымі зорнымі начамі. Бярвенне ў сценах тады пачынае трэскацца з такім гукам, як быццам нехта страляе. На рэках і азёрах, на самых багністых балотах разам з ледзяным Дзедам Марозам будуе Зюзя масты. Каб праверыць іхнюю надзейнасць, у абдымку ходзяць пасля па лёдзе, Зюзя стукае па ім булавою: ажно крэхча ды стогне пад імі тоўсты лёд, але вытрымлівае.

Здараецца, цэлай зграяй лютых ваўкоў рассыпаюцца па зямлі Зюзевы служкі — завея ды мяцеліца, кудаса ды завіруха, дзікім завываннем да жаху даводзяць малых і старых, а вецер такі, што не зразумець — гэта ён у комінах падвывае ці чэрці скуголяць. Найбольш моцныя маразы нахопліваліся перад Новым годам і Калядамі. Яшчэ раз лютаваў Зюзя напрыканцы зімы. Ці не таму апошні зімовы месяц назвалі лютым: «Пытаецца люты, ці добра абуты»?

Любімым месцам побыту для Зюзі з’яўляецца лес. Утульна яму тут, весела і звыкла, паветра марознае і здаровае, ёсць з кім забавы ладзіць. Зайчыкі, якія змянілі шэрае адзенне на белае — гэткае ж, як і ў Зюзі, у хованкі з ім гуляюць. Вавёркі займальныя казкі расказваюць, а самі смачныя арэхі лускаюць, сухімі грыбамі ласуюцца. Загуляецца Зюзя ў лесе і забудзецца пра людзей, не даймае іх сцюжай.

Кажуць, што ў вёсцы Зюзя з’яўляўся толькі дзеля таго, каб папярэдзіць сялян пра суровую зіму. Шанаваў, выходзіць, бог холаду добрых людзей, не меў ахвоты дарма пацвельвацца ды насміхацца. Каб падвесяліць іх, возьме і ўпрыгожыць дрэвы бялюткім іскрыстым інеем, а пасля

папросіць вецер, каб патрос іх. І сам радуецца, калі мірыяды яркіх блёсткаў плаваюць у паветры, ззяюць на сонцы каштоўнымі крышталікамі.

Калі ж на некага засярдуе, то можа адмарозіць палец, нос, руку ці нагу, можа выстудзіць хату. Часам да самых костачак прабярэ, усю кроў застудзіць, а тады адпусціць небараку, каб помніў пра Зюзеву дабрыню. Апамятаецца чалавек, а Зюзі ўжо і след прастыў.Ператворыцца тады ў вялікага снежнага мядзведзя, нападзе на чалавека, сцісне ў абдымках, паваліць на зямлю і прыцiскае, пакуль той не зледзянее.

Каб не злаваць «халоднага» бога, людзі стараліся задобрыць яго. Асабліва любіў Зюзя куццю. Цёмнымі марознымі калянднымі начамі прыходзіў у вёску, зазіраў праз шыбы ў хату, шукаў на сталах свой любімы наедак. Яму і дагэтуль пакідаюць на стале трошкі куцці. Пры гэтым прыгаворваюць: «Зюзя на дварэ — куцця на стале». Часам кідаюць першую лыжку каляднай кашы за акно і клічуць ягонага служку: «Хадзі, мароз, куццю есці». Падсілкаваўшыся, у падзяку за чалавечую шчодрасць пакідаў на аконным шкле прыгожыя ўзоры, вымалёўваў розныя зімовыя кветкі.

Але на Грамніцы, 15 лютага, бог Сонца Ярыла разганіць хмары, выпусціць на волю цяпло. Не вытрымае тады Зюзя, пралье першую слязу, якая дробнымі кропелькамі асядзе на аконным шкле. Людзі ж сачылі: калі на Грамніцы певень нап’ецца вадзіцы, то на Юр’я (6 мая) вол наесца травіцы. У дзень веснавога сонцавароту — 21 сакавіка — на сваю вахту заступае «цёплы» бог Ярыла, а Зюзя пачынае змятаць з нябесных палацяў апошні снег, збірацца ў далёкую дарогу, каб да наступнай зімы сілы набрацца.

## *Жыцень*

У самай даўняй даўніне нашы прашчуры верылі ў магічную сілу агню, ветру, сонца, пакланяліся дрэвам і святым камяням. Калі ж сказаць коратка — жылі ў добрым суладдзі з прыродай, бо ад яе залежаў іхні лёс, з літасці нябачных прыродных сіл мелі яны багацце, здароўе, дабрабыт і ўсё, што патрабавалася для жыцця.

На кожную пару года даўнія людзі мелі сваіх багоў. Калі наступала вясна, на зямлю прыходзіла маладзенькая прыгажуня Ляля, альбо Лёля.

На змену ёй з'яўлялася багіня лета Цёця — мажная і дзябёлая кабета, убраная каласамі. Марознай зімой панаваў бог холаду Зюзя.

У пладавітай і шчодрай восені таксама быў свой бог. Называўся ён Жыцень, лічыўся богам жніва.

Мо ад слова «жыць» паходзіла ягоная назва? Бо менавіта ён спрыяў сялянам назапашваць хлеб — незаменны атрыбут бязбеднага жыцця. Паданні засведчылі, што Жыцень быў худзенькім дзядком малога расточку. Меў суровы выгляд твару. На галаве — доўгія раскудлачаныя валасы. Загадкай заставалася, чаму ў гэтага бога ажно тры вокі на лбе. Праўда, у легендах захаваліся сведчанні, што трэцяе вока знаходзілася часам на патыліцы. Відаць, каб пільна сачыць за тым, як людзі спраўляюцца з ураджаем, якім дагэтуль апекаваліся іншыя багі.

Багіня вясны Ляля спрыяла ўсім земляробчым працам на полі. Пярун паліваў ніўку дабрадзейным дажджом, які людзі называлі божай расой. Бог урадлівасці і сонечнага святла Дажбог не даваў пасеяным зернейкам спрахнуць у цёмнай зямлі. Адным словам, кожны з добрых і спагадлівых язычніцкіх багоў дбайна выконваў свае абавязкі,

каб не страціла зямля сваёй пладавітасці, каб не надта пакутаваў чалавек ад розных бед ды нягод, каб не халадаў і не галадаў.

Калі сваю справу заканчвалі ўсе іншыя багі, наступаў час Жыценя. Нізка сагнуўшыся, хадзіў ён па палях, зазіраў на агароды. Цікавіўся, ці няма дзе-небудзь нядбальства, ці годна пакарысталіся сяляне спрыяннем усіх іншых багоў і добрых духаў? Радаваўся, калі бачыў парадак ды багаты вынік сапраўднай гаспадарскай рупнасці. Але і суровасць сваю праяўляў напоўніцу. Караціей, судзіў суд над нядбайнымі, заахвочваў і дадаваў багацця руплівым.

Бывала, заўважыць на ржышчы нязжатыя альбо апалыя каласкі, ажно скаланецца ўвесь, вочы слязамі зойдуцца, валасы на галаве натапырацца. Крыўда бярэ руплівага бога, сэрца заходзіцца ад жалю. Збярэ ён усе каласкі, складзе адзін да аднаго і ў снапы пазвязвае. А тады прабяжыць па ўсіх суседскіх палетках, каб знайсці самы дагледжаны, і давай снапы на зжатае поле насіць. Каб дагадзіць руплівому гаспадару, падахвоціць яго працаваць яшчэ лепш. Парадуецца тады селянін і скажа сваім сямейнікам:

— Гэта Жыцень нам даў, каб будучым годам яшчэ лепш шчыравалі.

Аднак на гэтым не заканчваецца суд Жыценя над марнатраўствам. Мала таго, што адбярэ частку ўраджаю ў нядбаліцы, калі аднясе збажыну іншаму, дык і на будучыню пакарае. Зробіць так, каб у негаспадарлівага хлебароба на наступны год не ўрадзіла ніўка.

А вось руплівы ды старанны, працалюбівы і акуратны — той, каму Жыцень восенню снапы зносіў, збярэ яшчэ большы ўраджай, шмат жыта з пшаніцай намалоціць. А ў каго багаты ўраджай, у таго і дастатак у хаце. Пра такога кажуць, што ад яго пахне ветрам і дажджом,

а ад рук — зямліцай ды збожжам. Такім вось чынам Жыцень заахвочваў быць на зямлі сапраўдным гаспадаром, караў тых, хто не прытрымліваўся гэтага.

Мае Жыцень і іншы клопат. Часам ператворыцца ў беднага жабрака. Перакіне праз плячо кайстру і выйдзе на дарогу. Сустрэне там мужыка і паківае яму пальцам, нібыта дакарае за нешта. А селянін, вядома, пазнае Жыценя і раскажа ў вёсцы пра сваю сустрэчу. Бядуюць тады сяляне: гэта ж Жыцень пагражае бедным ураджаем. Нашы продкі казалі: «Жыцень з торбай — голад на двор». Гэткім чынам Жыцень папярэджвае гаспадара аб маючым быць голадзе, падказвае, каб не дапусціў да гэтага.

Сваю дбайнасць і гаспадарлівасць, любасць да кармілецы-зямліцы выяўляе Жыцень і падчас асенняй сяўбы. Калі сеюць азімыя, Жыцень тут як тут. Але не хоча паказвацца на вочы, сваю добрую справу таемна робіць. Калі здарыцца, што нейкае зернейка не прысыпана зямлёй, абавязкова прытопча яго, каб не прапала, каб аддзячыла важкім коласам. Там раллю параўняе, там баразну паправіць. Гаспадар, адным словам.

Восенню людзі падсумоўвалі вынікі сваёй земляробчай працы. 21 верасня ладзілі свята ўраджаю — Багач, альбо Багатуху. Насыпалі зерне новага ўраджаю ў кош ці сявеньку, ставілі туды свечку і з дажынкавымі песнямі абносілі гумны, двары. Але не толькі цешыліся сабранаму ўраджаю, а дбалі пра будучы. Трэба было паспець поле заараць, пасеяць азімую збажыну. Таму сяляне і казалі: «Прыйшоў Багач — кідай рагач, бяры сявеньку ды сей памаленьку».

А праз тры тыдні пасля Пакроваў адзначаюцца Асяніны, альбо Вялікія дзяды, Змітраўскія дзяды — дзень памінання продкаў. Паколькі яны адбываліся пасля за-

канчэння палявых работ, калі ўраджай ужо ў свірне, то і абрадавы стол быў багаты. Казалі: «На Дзяды шмат яды». І сапраўды, гаспадыні гатавалі ажно да 19 страў. Здаўна павялася звычка ўспамінаць у гэты вечар продкаў, адчуваць яднанне з імі, згадваць іхняе жыццё, ухваляць працавітасць, ставіць у прыклад іхняе дбайнае гаспадаранне на зямлі — каб нашчадкі сталі спадкаемцамі і прадаўжальнікамі добрых спраў. Каб не перапынялася повязь пакаленняў і не забываліся людзі пра свайго спрыяльніка — Жыценя.

### *Ляля*

Вядома, кожнаму з нас даводзілася бачыць лес ранняй вясной, на самым яе пачатку. Нейкая незвычайна прыязная і прыветная атмасфера пануе там. Дзівоснымі колерамі расквечаны лясныя шаты. Нават само паветра, здаецца, афарбавана незямнымі адценнямі. Як бы нейкая таямнічая палярына ахутвае дрэвы. У танюсенькія зялёныя ўборы прыбраліся бярозкі. Чароўны водар плыве ад жоўтых коцікаў вярбы. Ледзь чутным перазвонам агучваюцца кусты арэшніку, увешаныя карычняватымі прадаўгаватымі званочкамі-катышамі.

Хто ж гэта так пастараўся? Хто надаў небывалую святочнасць выстуджанаму Зюзем і пачарнеламу ад холаду лесу? Дык гэта ж прыгажуня Ляля парупілася — юная багіня вясны і дзявоцтва, зіхоткая, бліскучая, светлая. Таму і кажуць людзі, што лес стаў прыгожым, як Ляля. А сама яна нябачна ходзіць між дрэў, мякка ступае па пазелянелых імхах, па востранькіх піках маладзенькай травы і радуецца таму, што зрабіла прыемнасць людзям.

Такі ўжо характар у прыгажуні Лялі — добры, памяркоўны, шчыры і адкрыты. За гэта любяць і паважаюць яе людзі. Бо, кажуць, што яна дачка багіні прыгажосці і кахання, апякункі шлюбаў і сямейнага жыцця Лады. Маці і дачку называлі багінямі прыроды, якая ажывае і якая нараджае.

Калі вясна добра ўбярэцца ў сілу, калі мінецца першае з вясновых свят — дзень прылёту жаваранкаў (22 сакавіка), тады Ляля вырашае адкрыцца людзям. Яна з'яўляецца перад імі маладзенькай дзяўчынай. Прыгожая, прыветная, высокая і стройная, апранутая ў доўгі белы ўбор. Вочы — колеру яснага нябеснага блакіту. Радасна сустракалі самую добрую багіню зямляне. У яе гонар 5 мая спраўлялі вясёлае дзявочае свята Ляльнік. Святкаванне адбывалася за пяць дзён да свята Ярылы і напярэдадні святога Юр'я — вельмі важнага для славян дня, калі ўрачыста адзначаўся прыход вясны і ўпершыню выганялі ў поле хатнюю жывёлу. Усе вясковыя дзяўчаты збіраліся на зялёным і расквечаным рознымі красками лузе. Хлопцам з'яўляцца на Ляльніку, гэтым свяце першай зяляніны, забаранялася.

Удзельніцы свята выбіралі са свайго асяроддзя самую найпрыгажэйшую дзяўчыну. Вядома ж, абранніца павінна быць прыгожай, як Ляля. Апраналі яе ў доўгую белую кашулю. Упрыгожвалі стройны стан і рукі зялёнымі галінкамі. На галаву ўскладалі разнаколерны вянок з першых вясновых кветак. Калі дзяўчына гэткім чынам ператваралася ў сапраўдную багіню Лялю, саджалі яе на ўзвышэнне з дзірвану, каб усім была відна. З аднаго боку на гэтую своеасаблівую лаўку ставілі збанок з малаком, смятану, клалі сыр, масла, яйкі, тварог, а з другога — хлеб. Каля ног узвышалася гурбачка вянкоў.

Затым дзяўчаты браліся за рукі і вадзілі вакол Лялі карагод, славілі яе як карміліцу і даравальніцу ўраджаю, спявалі песні ў гонар вясны, ладзілі скокі. Ляля за гэта шчодра частавала іх. Дзяўчаты садзіліся каля яе і смакавалі Ляліны прыпасы. Пасля зноў уставалі і працягвалі карагод. А Ляля кідала танцоркам вянкі — хай ловяць, каб шчаслівымі быць. Вянкі захоўваліся ў хаце да наступнага свята, а ў некаторых і пасля шлюбу — як напамінак пра незваротныя гады маладосці.

І сапраўды: усе дзяўчаткі, што паспелі злавіць чароўны вянок, станавіліся яшчэ прыгажэйшымі. Ну проста Лялечкі — вачэй не адарваць. Так і казалі пра іх мамы, калі бачылі сваіх дачушак. А яшчэ гэтак жа — Лялямі, Лялечкамі — называлі мамы сваіх маленькіх дзетак, калі забаўлялі іх і цешыліся імі.

Напрыканцы свята дзяўчаты бралі Лялю пад рукі, падымалі з яе пасада і адводзілі дамоў. Пазней гэтае свята было спалучана з Тройцай — Сёмухай. Да гэтай пары захаваўся звычай упрыгожваць цэрквы, хаты, сялібы, нават вуліцы маем — так называлі даўней бярозу. Ноччу перад Тройцай упершыню вялі коней на папас. Начлежнікі палілі кастры, пяклі яечню, ладзілі скокі.

Ляля, альбо Лёля, бо і так яе называлі, — самы светлы міфічны вобраз у пантэоне дахрысціянскіх багоў. Яна нікому не робіць зла, не аддаецца разгулу, характар у яе спакойны і зычлівы. Ляля не шкадуе для людзей ні багацця, ні дастатку, яна падтрымлівае ўрадлівасць, ухваляе прыгажосць.

Згодна з паданнямі і міфамі, культ Лялі звязаны з вясеннім адраджэннем прыроды, абнаўленнем свету, пачаткам работ на полі. Нездарма, відаць, Ляля з'ўлялася на зямлі амаль адначасова з Ярылам у сярэдзіне вясны

і сыходзіла разам з ім у канцы вясны. На змену багіні вясны прыходзіла Цёця — багіня лета. У адрозненне ад маладзенькай прыгажуні Лялі, была яна мажнай, паўнацелай кабетай, убранай у спелыя каласы. У руках трымала розныя спелыя плады.

Ды і само імя Ляля, Лёля мела шырокі сэнс, ад гэтага слова паходзіла шмат іншых. Давайце згадаем некаторыя. Ляля — немаўля, дзіця, лялька, цацка. Рускае слова «лелеять» — беражліва адносіцца, мілаваць, песціць, лашчыць. Люляць — калыхаць. Люлька — калыска.

Шмат дзе бусла, пра якога кажуць, што ён прыносіць малых дзетак, называюць лялекай. Мо таму птушкай Лялі лічыўся белы бусел. А дрэва Лялі — гэта бяроза альбо рабіна, метал — серабро.

## *Ярыла*

Ці ведаеце вы, калі ў беларусаў пачынаўся даўней новы год? А калі веснавы дзень раўняецца ночы? А з якога часу можна было араць зямлю? Аказваецца, усе гэтыя падзеі звязаны між сабой. Да ўсіх іх мае непасрэднае дачыненне адзін з багоў дахрысціянскага пантэона беларусаў — бог Сонца, урадлівасці і пачуццёвага кахання — Ярыла. Ягонай спадарожніцай па жыцці была багіня вясны прыгажуня Ляля.

Трапяткім і нецярплівым было чаканне прыходу Ярылы. Пасля веснавога сонцавароту — 21 сакавіка — пачынала выходзіць з зімовай спячкі прырода, усё жывое прачыналася, набіралася сілы, дужэла. Штораз даўжэйшы дзень перамагаў цёмную ноч, светлавокая вясна пазбаўлялася чараў халоднай і панурай зімы. Усё гэта яшчэ раз мусіла пера-

канаць людзей, што жыццё нязводнае і бясконцае, што яно заўсёды пануе і панаваць будзе над смерцю.

І ён прыходзіў. Напорыста і імкліва. Па-маладому радасна і весела. Сваімі чароўнымі ключамі рашуча адмыкаў да жыцця зямлю, выпускаў на волю расу і клікаў людзей на поле. Журавы трубілі ў свае гучнагалосыя трубы — абвяшчалі з'яўленне Ярылы. Гэтую радасную вестку па ўсіх палях і паселішчах разносілі няўтомныя на спевы жаўрукі. Нездарма яны лічыліся Ярылавымі пасланцамі. Набрынялая зямля толькі цяпер станавілася плоднай. Пачынала расці трава, з'яўляліся першыя кветкі. Дружна апраналіся ў цнатлівыя лісцікі дрэвы. У іхніх галінах ладзілі гнёзды і спявалі песні кахання птушкі. Лес агучвала куванне зязюлі. У кустах заліваліся недасяжныя па майстэрству салаўі. Сагрэтае ласкавым сонейкам, усё на свеце адраджалася, станавілася маладым і дужым. Такім быў спрадвечны кругаварот жыцця.

Неўзабаве з выраю прыляталі ластаўкі, якія разам з голубам лічыліся божымі птушкамі. Нельга было разбураць ластаўчыны гнёзды, бо хто зробіць гэта, у таго стане рабацiністым твар — на ім пасеюцца вяснушкі.

У гонар вясёлага бога беларусы ладзілі незабыўнае свята Ярылкі. Яго называлі яшчэ святам засевак. Адбывалася яно 27 красавіка па старым стылі. Маглі святкаваць і ў маі, чэрвені — на Сёмуху, на Купалле. Весела і займальна. Гэткі ж захоплены каханнем быў і сам Ярыла. Ягоная стыхія — забавы, гульні, скокі, заляцанні, бязмежная весялосць. Таму і стаў ён апекуном пачуццёвага кахання і пладавітасці, шчаслівага шлюбу і сямейнага дабрабыту. Толькі на гэтым свяце юнакам і дзяўчатам дазвалялася пакаштаваць віна, якое здаўна лічылася напоем багоў.

Вечарам на высокіх пагорках палілі вогнішча — каб убачыў іх сам Ярыла і завітаў у госці. Тут заканчваліся забавы і карагоды моладзі. На адыход людзі прасілі ў сонечнага бога цёплага лета, багатага ўраджаю, моцнага кахання, шчаслівага сямейнага жыцця ды здаровых дзетак.

А які ж ён быў — гэты гарэза і неўтаймоўны весялун бог Сонца Ярыла? Сын Лады і Дажбога нібыта нагадваў маладога прыгожага юнака. Кучаравы. Светлавалосы. У белым плашчы і на белым кані басанож ездзіць гэты малойца па свеце. На галаве — вянок з першых палявых кветак. У левай руцэ — жменька жыта, у правай — па́ліца. Махне Ярыла жытам — ніва коласам багацее, па́ліцай махне — гром грыміць, дождж сыплецца. Конь у Ярылы таксама малады і нястрымны. Ён такі гарачы, што на адным месцы і хвіліны не пастаіць, «капытамі камяні разбівае, хвастом зямлю падмятае, вушамі далёка ваўка чуе, вачамі зоры лічыць». Куды конь нагу паставіць — шаўковая трава сцелецца, кветкі дзівосныя расцвітаюць, растаюць ад ягонага дыхання снежныя сляды бога холаду Зюзі. А там, дзе малады прыгажун Ярыла ступаў сваімі босымі нагамі, густа каласілася жыта, прагна пілі жыццядайную сілу яравыя пасевы.

У гонар Ярылы называлі паселішчы, урочышчы, іншыя мясціны. Напрыклад, у Ваўкавыскім раёне дагэтуль захавалася вёска Ярылаўка. Вобраз Ярылы ў паэтычнай творчасці беларусаў быў звязаны з казой. Восенню ладзілася свята ўраджаю. Людзі добрымі словамі згадвалі шчодрага Ярылу, дзякавалі яму за спрыянне. Пасля гэтага ён спускаўся пад зямлю, дзе ўсю зіму змагаўся з богам цемры Чарнабогам. А ранняй вясной зноў з’яўляўся на зямлі пераможцам.

Яго свята — Юрай, Юр’е — адзначалі двойчы: 6 мая і 9 снежня. Веснавы Юрай лічыўся святам пастухоў, бо

ў гэты дзень упершыню выганялі кароў на расу. З гэтага дня і да позняй восені ваўкі не нападалі на кароў і коней, бо веснавы Юрай пазамыкаў ім раты. І толькі асенні Юрай адмыкаў іх.

1. Прыгадайце, калі і як узніклі міфы?
2. Якімі ўяўлялі з'явы прыроды і прадметы навакольнага свету нашы далёкія продкі?
3. Якіх міфалагічных багоў і духаў вы ведаеце? Якімі паўстаюць у міфах добрыя і злыя сілы? У якіх абліччах яны выступаюць?
4. Раскажыце, як, паводле міфаў, старадаўнія багі спрыялі людзям? Чым яны вас уразілі? Хто з багоў выклікаў у вас сімпатыі і чаму? Растлумачце свой выбар.
5. Параўнайце міфалагічных багоў і духаў з вобразамі, створанымі пісьменнікам Анатолем Бутэвічам. Што агульнае ў іх? Чым яны адрозніваюцца?
6. Падрыхтуйце вусную замалёўку пра аднаго з багоў (паводле твора Анатоля Бутэвіча). Апішыце яго знешні выгляд, раскажыце пра характар, заняткі, звычкі.

# III. Слова захапляе...

## Фальклор і літаратура

Мастацкая літаратура на працягу ўсёй сваёй гісторыі непарыўна звязана з вуснай народнай творчасцю. З даўніх часоў і да нашых дзён менавіта фальклор быў той асновай, на якой узнікла і развівалася літаратура пісьмовая, мастацкая. Фальклорныя сюжэты і вобразы спрадвеку ўзбагачаюць мастацкую літаратуру, а сакавітая, мілагучная, прыгожая і выразная народная мова спрыяе глыбейшаму самавыяўленню беларускіх пісьменнікаў, раскрыццю іх

таленту. Абапіраючыся на фальклорныя творы — міфы, легенды, казкі, песні, на багацейшыя абрады, майстры прыгожага пісьменства стварылі шмат літаратурных шэдэўраў, яны і сёння радуюць сваіх чытачоў непаўторнымі мастацкімі набыткамі — вершамі і паэмамі, раманамі і аповесцямі, апавяданнямі і п'есамі, — інакш кажучы, мастацкімі творамі розных жанраў. У іх расказваецца пра сівую даўніну, пра падзеі сучасныя і будучыя.

Літаратурныя легенды і казкі, у адрозненне ад фальклорных, заўсёды маюць аўтара. У гэтым раздзеле сабраны выдатныя творы беларускіх паэтаў і пісьменнікаў, складзеныя пад уплывам матываў, сюжэтаў, вобразаў вуснапаэтычнай народнай творчасці беларусаў.

***Людміла Рублеўская***

## Янук, рыцар Мятлушкі

*Дзейныя асобы*:

| | |
|---|---|
| Мятлушка | Лесавічок |
| Янук Шукайла-Залескі | Жытнічак |
| Князёўна Даратэя | Начніцы |
| Кадук | Страхі |

### *Дзея I*

*Ясная летняя ноч. На галінах лясных дрэў гушкаюцца Мятлушка — танклявая дзяўчына ў лёгкай шэрай сукенцы, з пушыстымі попельнымі валасамі і празрыстымі крыламі за спінай, і яе сябры — Лесавічок і Жытнічак.*

Мятлушка. Як хораша сёння ў лесе! Як ласкава свеціць Маці-Поўня!

Лесавічок. А на ялінах зноў выраслі зялёныя свечкі-пупышкі, духмяныя-духмяныя!..

Жытнічак. І жыта ўжо зарунела... Калі яно вырасце вышэй за мяне, пойдзем зноў на маё поле гуляць у хованкі!

Мятлушка *(мройна)*. Як мне хочацца, каб здарылася нешта незвычайнае! Можа, збегаем да русалак, паслухаем іх песні?

Лесавічок. Не, лепей падыдзем да Чорнага балота, паглядзім, як з дрыгвы ўсплываюць срэбныя ліліі!

Жытнічак. Ціха, сябры, нехта ідзе!

Мятлушка. Гэта чалавек!

Лесавічок. Давайце павяселімся!

Жытнічак. Ён зусім малады — і адзін! Зараз настрашым!

*Хаваюцца за ствалы дрэў. На паляну выходзіць малады хлапец у шляхецкай, але вельмі падранай вопратцы, з рыцарскім мячом. Гэта Янук.*

Янук *(спявае)*.

Высакародны рыцар
Нікога не баіцца.
Ён па зямлі вандруе,
Каб ратаваць людзей.
Апалая ігліца
Пад месяцам іскрыцца,
І рыцар, што вандруе,
На сцежцы не ўпадзе...

*З трох бакоў на Янука кідаюцца з жахлівымі крыкамі Мятлушка, Лесавічок і Жытнічак, стараюцца напалохаць. Янук выхоплівае меч.*

Янук. Ах вы, подлыя нападнікі! Я — высакародны шляхціц і ніколі не адступаю! Вось я вас!..

*Янук ганяецца за жартаўнікамі, але дзе дагоніш гарэзлівых юных духаў! Нарэшце ўсе стамляюцца.*

Мятлушка *(крычыць).* Перастаньце! *(З добрай усмешкай падыходзіць да Янука.)* Глядзіце, ён зусім не спалохаўся!

Янук. Вы хто такія?

Мятлушка. Я — Мятлушка, дачка Поўні.

Лесавічок. Я — Лесавічок, сын Лесу.

Жытнічак. А я — іх сябрук, Жытнічак. Мая маці — русалка, а дом — жытнёвае поле. А як завуць цябе?

Янук *(кланяецца з вялікай годнасцю, урачыста адказвае).* Пан Янук Шукайла-Залескі!

Лесавічок. Чаму ж такі высакародны пан — ды без каня?

Янук *(не паднімаючы вачэй, паўтарае завучаную байку).* Дарогай здарылася са мною страшнае няшчасце. Быў у мяне цудоўны конь з каралеўскае стайні. Але яго з'елі ваўкі...

Мятлушка. Ваўкі?! У нашым лесе?

Янук *(засмуціўшыся).* Ваўкі...

Жытнічак. А чаму такі высакародны рыцар ходзіць без капелюша?

Янук *(ужо без ранейшай упэўненасці).* Дарогай здарылася са мною страшнае няшчасце. На маім цудоўным капелюшы быў вялікі дыямент з каралеўскага куфэрка. Але магутны арол...

*Мятлушка падыходзіць да юнака і дакорліва глядзіць яму ў вочы, але той усё-такі працягвае аповед.*

...прываблены бляскам, кінуўся на гэты дыямент і знёс... разам з капелюшом...

Мятлушка. Ну нашто ты маніш? Вось дзіўныя вы, людзі! Хочаце здавацца не такімі, якія вы ёсць.

Янук *(жадаючы апраўдацца).* Мой род высакародны. Мой прадзед, дзед і бацька ваявалі за караля...

Жытнічак. І пакінулі цябе ў падраных портках!

*Абражаны Янук спрабуе злавіць гарэзніка, але той залазіць на дрэва і дражніцца адтуль.*

Мятлушка *(прымiраючыся).* Куды ж ты ідзеш?

Янук. У палац Кадука, ратаваць князёўну Даратэю.

*Слухачы ўражаныя. Нават Жытнічак злазіць з дрэва і падыходзіць да Янука.*

Лесавічок. Вар'ят! Ніхто з людзей не можа прайсці ў палац да Кадука!

Жытнічак. Кадук з'яўляецца толькі ў адну хвіліну — апоўдні, і толькі тады, калі яго паклічуць.

Лесавічок. Як пажадае хто-небудзь каму: «Кадук цябе забяры», — то Кадук з'явіцца... і забярэ...

Жытнічак. Князёўна Даратэя гэтаксама апынулася ў Кадука! Я чуў, што яе бацька, вялікі князь, так моцна на яе раззлаваўся, што і сказаў гэтыя словы... І якраз трапіў на страшную хвіліну. Пасля, канешне, шукаць кінуўся, узнагароду абвясціў таму, хто верне дачку...

Мятлушка. Не можа быць, не можа быць, каб родны бацька сказаў такое на дачку!

Янук. Канешне, ніхто не мог сказаць такое цудоўнай панне Даратэі! Я знайду гэтага подлага Кадука і заб'ю яго!

Лесавічок. Але ісці трэба праз Чорнае балота...

Жытнічак. Але палац Кадука вартуюць Начніцы і Страхі...

Янук *(дэкламуе).*

> Хай сонца паліць, хай дождж імжыць,
> Зліецца неба з зямлёй —
> А рыцар мусіць заўжды служыць
> Чароўнай Даме сваёй.
> Я знайду цябе, о панна Даратэя!

Мятлушка. Няўжо ты не баішся?

Янук. Калі хочаш служыць сваёй Даме — нельга баяцца нічога. Каб вы ведалі, якая панна Даратэя прыгожая! Аднойчы яна скінула мне з балкона кветачку...

*Янук беражліва дастае схаваную на грудзях кветку. Мятлушка бярэ яе, каб разгледзець, і палохаецца.*

Мятлушка. Ой, яна несапраўдная!

Лесавічок. Як гэта можа быць? *(Бярэ кветку.)* Ой, праўда, яна мёртвая! *(Аддае кветку Жытнічку.)*

Жытнічак. Нежывая кветка! Фу! *(Кідае яе на зямлю.)*

Янук. Што вы разумееце! *(Беражліва падымае кветку, хавае.)* Гэта штучная кветка з самага тонкага шоўку. Панна Даратэя любіць прыгожыя рэчы.

Мятлушка. Нежывыя рэчы любіць нельга!

Лесавічок. Ды ён проста хоча зрабіцца князем! Ведаем мы такіх выратавальнікаў! Здзейсніць подзвіг, а пасля яму — палову княства давай і князёўну ў дадатак!

Янук *(мройна).* Я мару толькі пра адно... Я выратую яе, стану перад ёй на калена... *(паказвае),* а яна пакладзе сваю белую ручку мне на плячо і скажа: «Высакародны Янук Шукайла-Залескі, ты добра служыў мне, і я пасвячаю цябе ў свае рыцары!»

Мятлушка. Паслухай, не хадзі да Кадука... Ты загінеш!

Лесавічок. Акрамя таго, твой меч — бяссільны. Кадука можа забіць толькі месячны прамень — нездарма ж Кадук з’яўляецца толькі ўдзень, а ў яго палацы заўсёды свеціць сонца.

Янук. Як жа можна прынесці туды прамень? Яго не зловіш...

Мятлушка. Чаму? Гэта вельмі проста! Глядзі!

*Мятлушка бярэ ў рукі месячны прамень. Янук, уражаны, спрабуе зрабіць тое самае, але ў яго не атрымліваецца.*

Жытнічак. Яна — дачка Поўні! Толькі Мятлушка можа ўзяць у рукі месячны прамень!

Янук. Рыцарскі меч адолее любога злодзея, а шляхецкая адвага вартая любой чароўнай зброі! Але ж я з вамі забавіўся.

Мятлушка. Давай я правяду цябе, Янук!

Янук. Яшчэ чаго! Не хапала, каб шляхціцу дапамагала лясное дзяўчо. Бывайце! *(Адыходзіць.)*

Лесавічок. Пабеглі да русалак!

Жытнічак. Пабеглі!

Мятлушка. Вы бяжыце, сябры, а я прылячу пазней.

*Жытнічак і Лесавічок выбягаюць.*

А я ўсё-такі прыгледжу за гэтым рыцарам... *(Накіроўваецца ўслед за Януком.)*

## *Дзея II*

*Чорнае балота. Янук з цяжкасцю прабіраецца па карчах.*

Янук. Хай... сонца паліць... Хай... дождж імжыць... Зліецца... неба з зямлёй... А рыцар... О халера! *(Ледзь не падае.)* Мусіць заўжды... служыць... Чароўнай Даме сваёй... О халера! *(Правальваецца ў дрыгву.)*

*З'яўляецца Мятлушка.*

Мятлушка. Трымайся, рыцар! *(Дапамагае юнаку выбрацца на цвёрдую глебу.)*

Янук *(адчувае сябе прыніжаным)*. Дзякуй табе... Але я б і сам выбраўся...

Мятлушка. Ты б выбраўся! Недарэка! Ты ж зусім не ўмееш хадзіць па балоце. Глядзі, бачыш — высокая белая

трава? Гэта сівец. Трэба ступаць толькі там, дзе ён расце. А ты палез проста ў багну!

Янук. Калі-небудзь я пастараюся таксама выратаваць цябе...

Мятлушка. Ну чаму ты ўвесь час ганарышся? Трэба быць простым, як гэтыя зоры, як кветкі, тады зробішся мудрым.

*Янук хоча ісці далей, але небарака зусім згубіў арыентацыю. Памкнуўся ў адзін бок, у другі, спрабуе ступіць на купіну, але зноў ледзь не правальваецца ў багну. Тады, спрабуючы захаваць шляхецкую годнасць, звяртаецца да Мятлушкі, якая з добразычлівай і крыху іранічнай усмешкай сочыць за яго дзеяннямі.*

Янук. Можа быць, добразычлівая панна падкажа мне, у якім баку знаходзіцца палац Кадука?

Мятлушка. Падкажу, калі пан Янук такі ўпарты...

Янук. Я хачу вызваліць князёўну Даратэю!

Мятлушка. Ну тады пайшлі, я цябе правяду. *(Паказвае дарогу.)* А што, князёўна Даратэя прыгажэйшая за мяне?

Янук *(узнёсла).* Яна — прыгожая, як сонца! Не, ты, канешне, таксама прыгожая... Толькі... нейкая шэрая.

Мятлушка *(з уздыхам).* Я — начны матылёк, дух месячнага лесу. Мае колеры спяць. А вось і балота скончылася. Ой, глядзі! Сюды ідуць Начніцы! Яны вартуюць шлях да палаца!

*Набліжаюцца Начніцы — прыгожыя дзяўчаты ў цёмна-сініх туніках, густа ўсыпаных зоркамі-блішчынкамі.*

Першая Начніца. О рыцар! Хадзі са мною — я зраблю цябе самым багатым у свеце! Я аддам табе сто патаемных скарбаў — ты купіш сэрцы першых прыгажунь і мячы найлепшых ваяроў! *(Перасыпае з рукі ў руку золата.)*

Мятлушка *(шэпча).* Не вер ім, яны хочуць загубіць цябе!

Другая Начніца. Хадзі са мною, рыцар! Я дапамагу табе здабыць славу! У мяне ёсць зачараваныя даспехі і зброя, ты будзеш пераможцам на ўсіх рыцарскіх турнірах! *(Паказвае залаты лаўровы вянок.)*

Трэцяя Начніца. Са мною! Толькі са мною, рыцар! Ты разумны і адважны, табе павінна належаць улада! Я зраблю цябе каралём вялікай дзяржавы, ты будзеш караць і літаваць, абвяшчаць вайну і заключаць мір. Вялікія дзеянні чакаюць цябе, рыцар! *(Працягвае Януку карону.)*

Янук. Шаноўныя пані, дазвольце мне прайсці, бо я — верны рыцар панны Даратэі і магу служыць толькі ёй.

*Начніцы круцяцца вакол Янука, нашэптваюць сваё: «Улада!», «Слава!», «Багацце!» Янук спрабуе вырвацца з іх кола, нарэшце выхоплівае меч.*

Янук. Прэч адсюль, морак начны!

*Начніцы разлятаюцца.*

Мятлушка. Малайчына, Янук! Начніцы служаць Кадуку, бо зло аднолькавае і ўдзень, і ўначы. Але гэта яшчэ не перамога! Сюды набліжаюцца Страхі — слугі Кадука. Я баюся, Янук!

Янук. Не бойся, Мятлушка, я з табою!

*Мятлушка хаваецца за Янука. Падыходзяць Страхі — пачварныя істоты. Яны стараюцца напалохаць Янука, прымусіць яго адступіць.*

Страхі *(разам).*

Мужнасць і вернасць растануць, як дым.
Страх — не ў ночы, страх — у сэрцы тваім.
Страхі ўладараць людскою душой!
Рыцар, спыніся!

*(Крычаць адзін за адным.)*

Ты мой! Ты мой! Ты мой! Ты мой!

*Янук разганяе Страхі мячом. Раптам святлее, і наперадзе паказваюцца вялікія залатыя вароты.*

Мятлушка. Вось ён, уваход у палац Кадука!

Янук. Нарэшце! Даратэя, даражэнькая, я тут! Я хутка! *(Падбягае да варот і спрабуе іх адчыніць. Яго спыняюць крыкі.)*

Лесавічок. Пачакай! Не адчыняй вароты, пакуль не адыдзе Мятлушка!

Жытнічак. Мятлушка! Мілая! Ледзь знайшлі цябе!

Мятлушка. Сябры! Як вы сюды трапілі? Як вы перайшлі праз Чорнае балота? У вас жа няма крылаў, як у мяне!

Лесавічок. Бываюць імгненні, калі ў кожнага вырастаюць крылы.

Жытнічак. Мы паспелі своечасова. Ляці хутчэй дадому, хавайся!

Янук. А што пагражае шаноўнай паненцы?

Лесавічок. Хіба ты не ведаеш, што ёй нельга паказвацца на сонцы? Сонца спаліць яе крылы! Сонца заб’е яе! А там, у палацы Кадука, увесь час — поўдзень!

Мятлушка. Праўда... А я нібыта і забылася...

Янук. Ну што ж, калі так — дзякуй табе, Мятлушка... *(Падыходзіць, пацiскае ёй руку.)* Ляці, хавайся! Толькі хутчэй!

*Мятлушка падыходзіць да Жытнічка, просіць.*

Мятлушка. Жытнічак, міленькі! Я пайду, схаваюся... Ты залацісты, як сонечны прамень, ты зможаш прайсці незаўважна ў Кадукоў палац... Прыгледзь за Януком, каб не здарылася з ім бяда. Тады раскажаш мне.

Жытнічак. Добра, Мятлушка... Толькі дзеля цябе!

*Лесавічок і Мятлушка, узяўшыся за рукі, уцякаюць. Янук адразу ж расчыняе вароты і заходзіць у палац. За ім крадком прабіраецца Жытнічак.*

## *Дзея III*

*Палац Кадука. Вельмі светла, але святло нейкае нежывое, сляпучае. Кругом блішчыць пазалота. На вялікім шыкоўным ложку спіць князёўна Даратэя, багата і ярка апранутая. Каля ложка — накрыты на дваіх столік, прыгожыя крэслы з высокімі спінкамі, трумо з усялякай парфумай. На падлозе — пушысты кілім-самалёт, прыкаваны залатым ланцугом да спецыяльнага слупка. Янук падыходзіць да Даратэі.*

Янук. Ты спіш, мая панна! Я ведаю, пракляты Кадук зачараваў цябе. Але я ведаю, як цябе пабудзіць — пра гэта напісана столькі казак! Прабачце, мая дарагая, што вымушаны скрасці пацалунак з вашых чароўных вуснаў!

*Янук схіляецца над князёўнай, хоча яе пацалаваць. Але тая раптам прачынаецца сама, пацягваецца.*

Даратэя *(сонным голасам).* Гэта ты, стары чорт? Што ты мне прынёс? *(Расплюшчвае вочы, палохаецца.)* Ой, хто гэта?

Янук *(становіцца на калена).* Шаноўная панна Даратэя, няўжо вы не пазнаяце свайго адданага рыцара? Ваша кветка заўсёды каля майго сэрца *(дастае кветку, паказвае),* а ваша імя — на маіх вуснах! Я прыйшоў вызваліць вас!

Даратэя. А, помню... Юнак пад балконам... Значыцца, ты прыйшоў вызваліць мяне? Гэта прыемна.

*Князёўна ўстае з ложка, садзіцца перад люстэркам, прыхарошваецца.*

Янук. Шаноўная панна! Хутчэй пойдзем адсюль!

Даратэя. Пойдзем? Спадзяюся, ты прыехаў у карэце? З табой многа слуг?

Янук *(разгублена).* Папраўдзе кажучы, я... *(Глядзіць на горды твар князёўны і паныла паўтарае сваю легенду.)* Дарогай здарылася са мною страшнае няшчасце. У мяне

была цудоўная залатая карэта, запрэжаная коньмі з каралеўскай стайні... Але іх з'елі ваўкі...

Даратэя. Разам з карэтай?

Янук. Карэта, пазбаўленая такім подлым чынам коней, пакацілася пад адхон і, упаўшы ў страшэнна глыбокае возера, затанула...

Даратэя. Разам з фурманам і лёкаямі?

Янук *(адчуваючы, што князёўна з яго насміхаецца, спрабуе змяніць тэму размовы).* Але я не смею больш займаць каштоўны час высакароднай паненкі. Даратэя, прашу вас, хутчэй пойдзем адсюль!

*У пакой заходзіць Кадук. Ён зусім не страшны. Таўшчэзны стары, які маладзіцца. Апрануты ў чорны сурдут і капялюш-цыліндр, відавочна, з іншай эпохі. Белая кашуля, лакіраваныя чаравікі, у пятлічцы — кветка, у руках — вялікі прыгожы букет штучных кветак і куфэрачак.*

Кадук *(здзіўлены з'яўленнем Янука).* Вось нечаканыя госці!

Янук *(выхоплівае меч).* Абараняйся, подлы выкрадальнік паненак! Я, Янук Шукайла-Залескі, выклікаю цябе на смяротны бой!

*Князёўна Даратэя ўскрыквае і падае ў непрытомнасці на ложак, што не перашкаджае ёй час ад часу прыўзнімаць галаву, каб сачыць за падзеямі.*

Кадук *(спакойна і лагодна).* Ай-яй-яй, малады чалавек! Як не сорамна! Толькі ўвайшоў у чужую хату, адразу з мячом на безабароннага старога гаспадара... А яшчэ шляхціц!

*Янук сумеўся, не ведае, што рабіць, апускае меч.*

Давай лепей прысядзем, спакойна абмяркуем усе прэтэнзіі і прапановы.

Жытнічак *(выглядвае з-за трумо).* Не слухай Кадука! Ён цябе падмане!

*Янук сядае на прапанаванае крэсла, але адчувае, што не можа з яго ўзняцца. Дарэмна спрабуе юнак вырвацца. Прыбягаюць Кадуковы слугі-Страхі, звязваюць Янука, адбіраюць у яго меч. Кадук са смехам кладзе букет і куфэрак на ложак, каля князёўны Даратэі. Ён скідвае цыліндр і сурдут, слугі падаюць яму чорны, з залатой аздобай плашч, карону і меч. Цяпер Кадук сапраўды падобны на злога чараўніка. Ён падымае меч і падыходзіць да Янука.*

Даратэя *(прыўзнімае галаву).* Кадучок, няўжо ты так жорстка абыдзешся з гэтым прыгожым маладым чалавекам?

Кадук. А што зробіш, сонца маё? У маім становішчы нельга цярпець канкурэнтаў, асабліва калі яны маладыя і прыгожыя.

Даратэя. Але ж ён такі бескарыслівы, такі аддany... *(Капрызна.)* Мне яго шкада!

Кадук *(падыходзіць да Даратэі, гаворыць напаўголаса).* Падумай сама, дыяменцік мой, калі я зараз не скончу з ім, ты можаш застацца не толькі без гэтага *(дастае з куфэрка, які нёс у падарунак, прыгожае калье),* але і без усяго гэтага *(абводзіць рукою шыкоўны пакой).* А ўспомні пра ўласны кілім-самалёт *(паказвае),* пра бурштынавы палац на беразе мора! А птушынае малачко, што спецыяльна для цябе прыносяць Мроі з Млечнага Шляху!

*Даратэя кажа сваё штучнае «Ах!» — і зноў падае на ложак.*

Жытнічак. Хутчэй пабягу за дапамогай! Мятлушка павінна нешта прыдумаць! *(Выбягае.)*

*Кадук зноў, не спяшаючыся, набліжаецца з мячом да Янука. Той глядзіць проста ў вочы свайму кату, сцяўшы вусны, спакойны і мужны.*

Кадук.

Што перад бляскам золата і сталі
Пялёсткі дабрыні, агеньчык веры?

Хто ўбачыць хараство Мятлушкі шэрай?
Хто непахіснасць рыцара пахваліць?
Чароўнай Даме дораць дыяменты,
А не ўздыханні, мой ты рыцар бедны...

*Падымае меч, але раптам чуюцца крыкі: «Мятлушка, стой, ты загінеш!» Улятае Мятлушка. Яркае святло асляпляе яе, яна прыкрываецца рукою. Кадук адступае, бачачы, што Мятлушка трымае ў другой руцэ месячны прамень. Страхі таксама адступаюцца, з бояззю паглядаючы на чароўную зброю ў руцэ дзяўчыны.*

Кадук. Не падыходзь! Табе тут не месца, дзіця ночы! Калі ты наблізішся да майго святла, загінеш! Пашкадуй сябе! Ляці назад!

Мятлушка. Мне ўсё роўна!
Лячу на прывідны агонь,
Мая любоў зямная.
Хай ночы цёмнае крыло
Мяне не захінае.
Імгненні ёсць — калі нішто
І боль, і страх, і згуба.

*Хістаючыся, набліжаецца да Кадука, з-за спіны якога зіхаціць яркае бязлітаснае святло.*

Янук. Мятлушка, ты загінеш! Стой!

Мятлушка. Жыві і помні, любы! *(Кідае ў Кадука месячны прамень.)*

*Зацямненне. Кадук падае. Сцены палаца разбураюцца, Страхі разбягаюцца. Мятлушка на хвіліну апраменьваецца яркім святлом і таксама падае...*

*Зноў святло. Але не такое сляпучае, як раней. На месцы палаца застаўся толькі прыкаваны да слупка кілім-самалёт. Ва-*

*кол — лес. Над ім узыходзіць сонца. Над Мятлушкаю схіліліся Жытнічак і Лесавічок.*

Жытнічак *(плача).* Мятлушка!

Лесавічок *(стрымлівае слёзы).* Мятлушачка!

*Янук устае. Яго нішто больш не трымае. Глядзіць на Мятлушку, на Даратэю.*

Даратэя *(азіраецца вакол).* Ну вось! Нічога не засталося! *(Глядзіць на свае пальцы, шукаючы пярсцёнкі, намацвае завушніцы.)* Ніколі, ніколі ў жыцці ў мяне не будзе больш такіх скарбаў! Гэй ты, мой рыцар!

*Янук паварочваецца да князёўны.*

Ты вызваліў мяне. Цяпер можаш правесці мяне дадому. Па меншай меры, кілім-самалёт застаўся... Не ісці ж мне пешкі! *(Змяняе тон на какетлівы.)* Урэшце, ты ж дзеля мяне столькі перанёс, праявіў такую мужнасць і вернасць! Дарогаю раскажаш мне пра свае подзвігі — ты так цудоўна расказваеш! Ну, доўга цябе чакаць?

*Даратэя сама адчэплівае кілім-самалёт ад слупка, але Янук праходзіць паўз яе да Мятлушкі, схіляецца над ёю разам з Лесавічком і Жытнічкам, становіцца на калена.*

Янук. Мая Цудоўная Дама! Прысягаю табе ў вернасці і любові! Клянуся, што ніколі не забуду цябе і ні на кога не прамяняю. З тваім імем на вуснах, у тваю светлую памяць я здзейсню мноства слаўных подзвігаў!

*Схіляецца над Мятлушкаю і цалуе яе. Раптам зноў гасне святло, а калі яно ўспыхвае, Мятлушка павольна падымаецца. З ёй адбылася дзіўная змена: яе адзенне праменіцца яркімі колерамі, вочы ззяюць, валасы зрабіліся залацістымі, вусны — яркімі, як маліны. Толькі крылы зніклі назаўсёды.*

Жытнічак. Мятлушка, ты зноў жывая!

Лесавічок. Якая яна прыгожая!

Жытнічак. У яе больш няма крылаў...

Лесавічок. Але яна зусім не баіцца сонца!

Мятлушка *(кладзе руку на плячо Янука).* Высакародны рыцар Янук Шукайла-Залескі! Ты верна служыў дабру, а значыць — мне. Я пасвячаю цябе ў свае рыцары!

Янук. Ад сёння — назаўсёды!

Даратэя. Ды што ж гэта такое — апошняе адбіраюць! Янук! Ты ж мой рыцар!

*Янук не звяртае на яе словы ўвагі, бярэ Мятлушку за руку. Мятлушка і Янук глядзяць адзін аднаму ў вочы так, што Лесавічок і Жытнічак дружна ўздыхаюць.*

Лесавічок. Эх, Мятлушка... А я думаў: будзеш ты некалі гаспадыняй майго ляснога маёнтка...

Жытнічак. А я думаў, што падару табе сваё залатое поле...

Янук. А яна будзе ўладарыць у замку маіх продкаў. Там няма золата і слуг, няма коней з каралеўскае стайні і дыяментаў з каралеўскага куфэрка, але я дару ёй сябе і сваё каханне!

Мятлушка. Дурненькі! У нас будзе ўсё зорнае неба, усё сонечнае святло, усе кветкі і крынічная вада! У нас будуць дні і ночы, песні і казкі, каханне і згода! Мы — самыя багатыя ў свеце!

Даратэя *(стоячы на кіліме-самалёце, тупае нагой).* Здаецца, пра мяне забыліся? Я не магу больш заставацца ў гэтым дзікім і пустэльным — па вашай міласці — месцы. Хачу дадому! У свой палац! *(Тупае нагою.)*

*Нечакана кілім уздымаецца. Князёўна ад нечаканасці нязграбна падае на яго і з віскам знікае разам з кілімам.*

Янук. Хай сонца паліць...
Лесавічок. Хай дождж імжыць...
Жытнічак. Зліецца неба з зямлёй!..
Усе разам.
А рыцар мусіць заўжды служыць
Цудоўнай Даме сваёй!

*Заслона.*

1. Прааналізуйце сюжэт п’есы-казкі. Што пакладзена ў яго аснову?

2. Якія героі дзейнічаюць у творы? Якімі вы іх уяўляеце? Паразважайце, чым адметныя гэтыя вобразы?

3. Падрыхтуйце чытанне п’есы па асобах. Пастарайцеся пры чытанні перадаць характар кожнага з персанажаў.

4. Паспрабуйце інсцэніраваць урывак п’есы (на выбар). Прадумайце рэплікі, позы, міміку, касцюмы дзейных асоб, дэкарацыі, музычнае суправаджэнне, асвятленне.

5. Наладзьце калектыўнае абмеркаванне інсцэніроўкі п’есы, падрыхтуйце вусны калектыўны водгук.

# IV. Слова распавядае...

***Якуб Колас***

## Даль

Зацвіла прыгожая ліпа.

Колькі шуму было тут на гэты час, колькі разнагалосага спеву! Працавітыя пчолкі, усялякія мушкі гулі так, што здавалася, нібы ліпа — гэта нейкі дзіўны музыкальны інструмент і тут адбываецца ігрышча. Але адцвіла ліпа, пачало спець насенне. Расло адно зернетка на самай вы-

сокай галінцы. Можа гэтая высачыня і была прычынаю таго, што маладому насенню захацелася кінуць тутэйшы грунт і перабрацца туды. І якое павінна быць шчасце жыць там, калі ад аднаго толькі погляду на прыволле гэтай далі рабілася светла і радасна на душы.

Бывала, ледзь толькі ўзыдзе сонца, ледзь рассцелюцца на версе лясоў і ўзгоркаў яго залатыя абрусы, як гэтае зерне ўжо не зводзіць вачэй з сіняй далі. Што было ў ёй такога, чым прывабіла яна, гэтая даль, маладое ліпавае дзіця?.. У той бок, адкуль найлепш выглядала гэтая даль, беглі разлогі шырокіх палёў, а на іх межах то там, то сям параскідаліся, як маладзіцы ў жніво, дзікія грушы. Ціхія ўзгоркі, бы хвалі рачныя, таксама, відаць, цягнуліся да нияснай і прыгожай далі. А там, дзе поле ўпіралася ў цёмную сцяну баравога лесу, на самай граніцы, ззяла, як люстэрка, пакручастая стужка вады. Яшчэ далей, там, куды беглі срэбныя загібы бліскучай рэчкі і памыкаліся ўзгоркі, баравы лес і шырокае поле, ужо нельга было разглядзець нічога паасобку, — была проста даль, якая так моцна парывае да сябе душу, — даль, над якою драмалі ў залатых марах, здавалася, нерухомыя клубочкі кучаравых хмарак.

Ёсць нейкае хараство ў гэтай няяснасці, у гэтай безгранічнай далячыні, дзе неба нізка-нізка нахіляецца над зямлёю. Якая ўлада, якая сіла цягне ў бязмежнасць сіняй далі?

— Эх, — уздыхала маладое зерне, — паляцець бы ў гэтую даль.

Пачуў вецер тыя ўздыханні, устаў з-за ўзгорка, пазяхнуў пасля салодкага спачынку і падляцеў да маладога насення.

— А я і ведаў, — сказаў ён, — што не сягоння-заўтра папросішся ты ў дарогу. Трэба, трэба пазнаваць свет!

І стала прасіць маладое насенне, каб вецер узяў яго з сабою і панёс у аблюбаваную даль.

Старой ліпе шкада было пускаць дзіця ў чужы свет, невядома куды, але што парадзіць? Можа там будзе і лепей яму? Дык што станавіцца ўпоперак дарогі? Мо гэты шлях — шлях яго шчасця? Благаславіла маці сваё дзіця.

— Ляці, мілае!

Падхапіў вецер маладое насенне і панёс. Ляцяць яны, і здаецца, самі бягуць на спатканне прыгожыя ўзгоркі, зялёныя лагчынкі. Пазірае на ўсё маладое насенне і вачам сваім не верыць: няўжо гэта тыя самыя малюнкі, на якія глядзела яно так нядаўна? А дзе ж іх хараство? Дзе тыя гладкія абрысы, дзе грабяні, што так павабна выглядалі адтуль — з ліпы? А палоскі лясоў? Нават сама рэчка не такая, якою здавалася здалёк.

Нейкі неспакой пачынаў агортваць маладое насенне. Ой, ці не жартуе з ім вецер: ці туды нясе ён, куды прасілася душа?

— А ці скора будзе тая даль, мілы вецер?

— Мы даўно мінулі яе, — адказаў вецер, — а цяпер новая даль перад намі.

1. Якое ўражанне аказала на вас казка Якуба Коласа? Падзяліцеся сваімі думкамі.

2. Якім малюе аўтар маладое насенне? Пра што яно марыла?

3. Якой паказана ў казцы старая ліпа? Як яна паставілася да мрояў сваіх дзяцей?

4. Чаму, на вашу думку, не спраўдзіліся спадзяванні маладога насення?

5. Якая з народных прыказак — «Дурная птушка свайго гнязда не шануе», «Усюды добра, а дома лепей», «Чужая старана пірагамі не накорміць» — больш падыходзіць у якасці парады маладому ліпаваму насенню? Паразважайце на гэты конт.

*Ханс Крысціян Андэрсен*

## Садоўнік і гаспадары

Пасярод старадаўняй сядзібы, прыкладна каля мілі ад сталіцы, стаяў прыгожы панскі палац з масіўнымі сценамі, вежачкамі, франтонамі. У гэтым палацы жылі муж і жонка — багатыя ды знакамітыя дваране. Праўда, яны прыязджалі сюды толькі летам, але гэта быў самы любімы іх маёнтак. Палац быў прыгожы звонку, зручны і ўтульны ўнутры. Парадны пад'езд упрыгожваў высечаны з каменю радавы герб гаспадароў. Цудоўныя ружы ўвівалі гэты герб і пляліся ўгару па сцяне, а перад палацам рассцілаўся густы дыван зяленіва. Поруч з белым і чырвоным глогам тут красаваліся рэдкія кветкі, якія цвілі не толькі ў аранжарэі, але і пад адкрытым небам.

Нездарма гаспадары сядзібы мелі добрага садоўніка. Кветнік, фруктовы сад, агарод — усё гэта было справай яго рук і радавала вока. За агародам яшчэ заставаліся рэшткі старога сада, зарослага кустамі буксу, якія былі абрэзаны ў выглядзе шароў і пірамід. А далей узвышаліся два вялізныя старыя дрэвы, амаль цалкам засохлыя. Здалёку здавалася, што раптоўны парыў урагану зверху да нізу абляпіў іх голыя сукі густымі камякамі гною. На самай жа справе гэта быў не гной, а птушыныя гнёзды.

З даўнейшай пары ў гэтых гнёздах жылі крыклівыя чароды варон і гракоў, якія змайстравалі тут сапраўдны птушыны гарадок і непадзельна валадарылі ў сядзібе. Бо яны былі першымі насельнікамі ў тутэйшых мясцінах, спаконвечнымі ўладарамі маёнтка, яго сапраўднымі гаспадарамі. Двухногімі жыхарамі маёнтка яны проста грэбавалі, хоць і мусілі змірыцца з існаваннем гэтых пастаянных

стварэнняў. А тыя іншы раз смалілі ў птушак з ружжаў, і тады чароды натапыраных перапалоханых варон і гракоў узляталі з крыкам: «Карр! Карр!»

Садоўнік не раз казаў гаспадарам, што трэба ссекчы гэтыя дрэвы, — яны псуюць садовы пейзаж, а як толькі іх не стане, знікнуць і шумныя птушкі. Але гаспадары і слухаць не хацелі пра тое, каб страціць дрэвы і птушыную гаману. У старых дрэвах і карканні птушак яны бачылі асаблівую прывабнасць — адзнаку даўніны, якую хацелі захаваць насуперак усяму.

— Дрэвы перайшлі да птушак у спадчыну ад продкаў, дык няхай птушкі і валодаюць імі, дабрамудры Ларсен! — гаварылі гаспадары. (Ларсенам звалі садоўніка, але для нашай гісторыі гэта не мае значэння.)

Садоўнік сапраўды мог распараджацца кветнікамі, садам і агародам, ён даглядаў іх і апрацоўваў старанна і захоплена. Гаспадары былі гэтым вельмі задаволены, але не хвалілі ад садоўніка, што ў іншых маёнтках іх частавалі такімі фруктамі і паказвалі такія кветкі, да якіх яшчэ вельмі далёка іх кветкам і фруктам. Гэтыя словы засмучалі садоўніка, бо ён усёй душой хацеў, каб сад у яго гаспадароў быў лепшы ў свеце, і дзеля гэтага шчыраваў без стомы. Рукі ён меў працавітыя, а сэрца добрае.

Аднойчы гаспадары запрасілі да сябе садоўніка і сказалі яму ласкава і паблажліва, як і трэба гаспадарам, што ўчора яны былі ў гасцях у сваіх знакамітых сяброў і тыя пачаставалі іх яблыкамі і грушамі, ды такімі сакавітымі, такімі пахучымі, што самі яны, гаспадары Ларсена, і ўсе іншыя госці былі ў захапленні. Гаспадары не сумняваюцца, што тыя фрукты прывезены з-за мяжы, але чаму б Ларсену не паспрабаваць вырасціць гэткія ж і ў іх сядзібе, калі толькі капрызныя плады могуць прыстасавацца

да мясцовага клімату? Як сведчылі чуткі, яблыкі і грушы, якія яны елі ў гасцях, былі куплены ў горадзе ў самага буйнога гандляра фруктамі; да яго і паслалі гаспадары садоўніка, каб даведацца, з якой краіны прывезены гэтыя плады, і выпісаць адтуль чаранкі.

Садоўнік добра ведаў гэтага гандляра, бо па загаду гаспадароў прадаваў яму лішкі фруктаў са свайго саду. І вось выправіўся ён у горад, каб спытацца ў гандляра, адкуль той атрымаў хвалёныя яблыкі і грушы.

— З вашага ўласнага саду! — адказаў гандляр і паказаў Ларсену яблыкі і грушы, якія той адразу пазнаў.

Вось дык узрадаваўся садоўнік! Ён паспяшаўся да сваіх гаспадароў і сказаў, што яблыкі і грушы, якія яны елі ў гасцях, — з іх уласнага саду.

Гаспадары не паверылі сваім вушам.

— Не можа быць, Ларсен! — казалі яны. — Калі вы хочаце пераканаць нас, што гэта праўда, прынясіце распіску ад гандляра.

І Ларсен прынёс яе гаспадарам.

— Дзіўна! — усклікнулі яны.

Пасля гэтага кожны дзень гаспадарам падавалі вялізныя вазы з цудоўнымі яблыкамі і грушамі з іх уласнага саду. Цэлымі карзінамі рассылалі гэтыя фрукты суседзям, у іншыя гарады і нават за мяжу. Гаспадарам гэта было вельмі прыемна. Аднак яны ніколі не праміналі выпадку, каб нагадаць садоўніку, што апошнія дзве восені былі вельмі спрыяльныя для фруктовых садоў і ўсе садаводы мелі добры ўраджай.

Прайшло няшмат часу. Гаспадары былі запрошаны ў палац на абед. На наступны дзень яны паклікалі да сябе садоўніка і расказалі яму, што на каралеўскі стол падавалі незвычайна салодкія і сакавітыя дыні з уласнай каралеўскай цяпліцы.

— Ідзіце да прыдворнага садоўніка, шаноўны Ларсен, і папрасіце, каб ён даў вам хоць крышку насення гэтых незвычайных дыняў.

— Але каралеўскі садоўнік сам атрымаў ад мяне гэтае насенне! — радасна ўсклікнуў садоўнік.

— Калі так, значыць, ён здолеў вырасціць з іх цудоўныя дыні, — сказалі гаспадары, — дыні, якія падавалі на стол, былі лепшыя адна за другую!

— Выходзіць, што ганарыцца трэба мне, — сказаў Ларсен. — Сёлета ў каралеўскага садоўніка дыні не ўдаліся; і вось ён убачыў, якія цудоўныя дыні растуць у садзе вашай міласці, пакаштаваў іх і некалькі штук заказаў для каралеўскага стала.

— Ці не лічыце вы, Ларсен, што на каралеўскі стол падавалі дыні з нашага саду?

— Ні кроплі ў гэтым не сумняваюся, — адказаў Ларсен.

Ён пайшоў да каралеўскага садоўніка і атрымаў у яго пасведчанне, дзе гаварылася, што дыні, якія падаваліся на абедзе ў каралеўскім замку, былі прывезены з саду, які належыць панам-гаспадарам Ларсена.

Гаспадары былі здзіўлены. Яны расказвалі пра гэты выпадак усім і кожны раз паказвалі сведчанне каралеўскага садоўніка. А насенне дыняў, як яшчэ раней чаранкі яблынь і груш, яны пачалі рассылаць у розныя краіны.

Тым часам з розных мясцін прыходзілі звесткі, што дасланыя чаранкі прыжыліся, яблыні і грушы даюць цудоўныя плады, якія названы імем радавой панскай сядзібы. Назву сядзібы пісалі зараз на англійскай, нямецкай і французскай мовах.

Хіба можна было марыць пра гэта раней?

— Каб толькі садоўнік не зазнаўся, — занепакоіліся гаспадары.

Але Ларсен думаў зусім пра іншае: ён імкнуўся захаваць за сабой славу аднаго з лепшых садоўнікаў краіны і кожны год ствараць які-небудзь новы выдатны гатунак садавіны альбо агародніны. І ён ствараў іх, але ў падзяку за працу яму часта даводзілася чуць, што першыя ўславіўшыя яго фрукты — яблыкі і грушы — былі ўсё ж самыя лепшыя, а ўсе іншыя ўжо не маглі з імі зраўняцца. Дыні, праўда, вельмі смачныя, ды ўсё ж далёка не такія, як яблыкі і грушы. Трускалкі таксама выдатныя, але не лепшыя за тыя, якія ёсць у іншых. А калі аднойчы ў садоўніка не ўрадзіла радыска, гаспадары толькі і гаварылі пра няўдалую радыску, нібыта забыліся пра ўсе іншыя гатункі садавіны і гародніны.

Можна было падумаць, што гаспадары атрымліваюць задавальненне, калі гавораць: «Сёлета ў вас усё ўрадзілася дрэнна, шаноўны Ларсен!» Яны былі проста шчаслівыя, калі сцвярджалі: «Дрэнна сёлета ў вас урадзілася!»

Некалькі разоў на тыдзень садоўнік прыносіў у пакоі свежыя букеты, падабраныя з дзіўна тонкім густам; у гэтых букетах кожная кветачка ўдала спалучалася з іншымі кветкамі і станавілася яшчэ прыгажэйшай.

— У вас выдатны густ, Ларсен, — казалі гаспадары. — Але не забудзьцеся, што гэтым талентам вы абавязаны не самому сабе, а Богу.

Аднойчы садоўнік прынёс гаспадарам вялізную крыштальную вазу, у якой плаваў ліст белага гарлачыка, а на ім, апусціўшы ў ваду доўгае сцябло, красавалася ярка-блакітная кветка велічынёй са сланечнік.

— Індыйскі лотас! — усклікнулі гаспадары. Яны ніколі ў жыцці не бачылі падобнай кветкі.

Яны загадалі днём выстаўляць яе на сонца, а вечарам асвятляць штучным святлом. І кожны, хто бачыў гэтую кветку, быў у захапленні, называў яе цудам.

Гэтак назвала яе нават знакамітая пані каралеўства — маладая прынцэса. Яна была разумная і добрая дзяўчына.

Гаспадары палічылі за гонар паднесці прынцэсе блакітную кветку, і яна забрала яе ў палац. Тады спусціліся яны ў сад, каб паглядзець, ці няма там падобнай кветкі, але не знайшлі яе. Паклікалі садоўніка і спыталі, дзе ён узяў блакітны лотас.

— Мы шукалі, але не знайшлі такіх кветак ні ў аранжарэі, ні на клумбах у садзе, — сказалі яны.

— Там іх і не было, — усміхнуўся садоўнік. — Гэтая сціплая кветка расце на градках у агародзе. Але, праўда, яна незвычайна прыгожая! Яна падобная на блакітны кактус, а на самай справе гэта толькі кветка артышока.

— Чаму ж вы не сказалі нам пра гэта раней? — абурыліся гаспадары. — Мы думалі, што гэта рэдкая заморская кветка! Вы зганьбілі нас перад прынцэсай! Яна была ў захапленні, як толькі зірнула на кветку, і сказала, што ніколі раней не бачыла гэткай расліны — а яна ж выдатна разбіраецца ў батаніцы. Але цяпер зразумела, чаму яна не пазнала яе: навуцы няма чаго рабіць у агародзе. І як вам магло прыйсці ў галаву, шаноўны Ларсен, прынесці ў пакоі падобную кветку? Пасля гэтага над намі будуць пакепліваць!

І цудоўная блакітная кветка, сарваная на градзе, была выкінутая з панскіх пакояў, дзе ёй не знайшлося месца. А гаспадары пайшлі да прынцэсы прабачацца і растлумачыць, што кветка была звычайнай агароднай раслінай, якую садоўнік захацеў паставіць у вазу, за што і атрымаў суровую вымову.

— Гэта грэшна і несправядліва! — з дакорам прамовіла прынцэса. — Ён адкрыў для нас кветку, пра якую мы нічога не ведалі, паказаў нам прыгажосць там, дзе мы і

не думалі яе шукаць! Пакуль артышокі цвітуць, я скажу прыдворнаму садоўніку кожны дзень ставіць іх у вазу ў маім пакоі.

Так яна і зрабіла.

Тады гаспадары абвясцілі садоўніку, што ён зноў можа паставіць у вазу свежую кветку артышока.

— Па-сутнасці, кветка і на самай справе прыгожая, — сказалі яны. — Так, прыгожая, як гэта ні дзіўна! — І яны нават пахвалілі садоўніка.

— Ён любіць, калі яго хваляць, — казалі гаспадары. — Ён у нас — распешчанае дзіця!

Неяк восенню пачалася бура. Да ночы яна так разбушавалася, што з карэннем вырвала некалькі дрэў на ўскраіне лесу. На вялікае няшчасце гаспадароў (яны так і казалі, што гэта няшчасце!), але і на вялікую радасць садоўніка яна павалiла абодва высокія дрэвы з птушынымі гнёздамі. Пазней слугі расказвалі, што да скавытання буры дамешваліся крыкі гракоў і варон, якія біліся крыламі ў аконнае шкло.

— Ну, зараз вы, відаць, задаволены, Ларсен, — сказалі гаспадары. — Бура зламала дрэвы, і птушкі паляцелі ў лес. Нічога тут не нагадвае больш пра даўніну; ад яе не засталося і следу. Нас гэта вельмі засмучае!

Садоўнік нічога не адказаў гаспадарам. Ён моўчкі песціў мару пра тое, як апрацуе зараз цудоўны сонечны ўчастак зямлі, да якога раней не меў права нават дакранацца, і ператорыць яго ва ўпрыгожанне ўсяго саду на радасць сваім гаспадарам.

Вырваныя бурай дрэвы, падаючы, паламалі старыя буксавыя кусты, і садоўнік пасадзіў на гэтым месцы звычайныя палявыя і лясныя расліны роднай зямлі.

Ніводзін садоўнік, акрамя Ларсена, не адважыўся б пасадзіць у панскім садзе такія расліны. А Ларсен ад-

вёў кожнай прыдатны для яе ўчастак — на сонцы або ў цені, — як каму было патрэбна. Зямлю ён апрацоўваў сумленна, і яна шчодра аддзячыла яму.

Тут вырас ураджэнец шатландскіх пустынь — ядловец, які колерам і абрысамі падобны на італьянскі кіпарыс. Расцвіў бліскучы калючы цярноўнік, які зелянеў і зімой і летам. А навокал шчодра разросся папаратнік розных гатункаў, які нагадваў то мініяцюрныя пальмы, то здаваўся продкам кволай цудоўнай расліны, якую мы называем «венерыны валасы». Цвіў тут і дзядоўнік, якога людзі звычайна ненавідзяць, але дарма, бо яго свежыя кветкі могуць упрыгожыць любы букет. Дзядоўнік рос на сухой глебе, а ніжэй, на вільготным месцы, зелянеў усімі зняважаны лопух, хоць яго буйное, магутнае лісце надае яму своеасаблівую прыгажосць. Каралеўская свечка — палявая расліна з высокім сцяблом і яркімі кветкамі — цягнулася ўгару, нагадваючы вялізны шматсвечны кандэлябр. Цвілі тут таксама ячменнік, першацвет, лясны ландыш, белакрыльнік і пяшчотная трохлістая кісліца. Люба-дорага было пазіраць на ўсю гэтую прыгажосць!

А перад усімі, ля самай драцяной агароджы, выстраіліся шарэнгай карлікавыя грушавыя дрэвы, прывезеныя з Францыі. Надвор'е было сонечнае, догляд іх быў клапатлівы, і хутка яны сталі даваць буйныя сакавітыя плады — гэткія ж, як і на сваёй радзіме.

На месцы двух старых засохлых дрэў садоўнік уваткнуў дзве доўгія жэрдкі; адну з іх увенчваў Данеброг — дацкі сцяг, а другая жэрдка летам і восенню была абвіта духмянымі парасткамі хмелю; зімой да яе падвешвалі кармушку, каб птушкам нябесным было чым паласавацца на Каляды.

— Наш Ларсен становіцца сентыментальным пад старасць, — пацiскалі плячыма гаспадары, — але ён служыць нам аддана і сумленна.

У навагоднім нумары аднаго сталічнага ілюстраванага часопіса з’явілася гравюра з адлюстраваннем старога маёнтка. На ёй быў відаць і Данеброг, і кармушка з калядным пачастункам для птушак, а подпіс абвяшчаў: «Якая гэта выдатная мэта — адрадзіць даўні звычай, уласцівы падобнай старадаўняй сядзібе!»

— Што ні прыдумаў бы наш Ларсен, пра гэта адразу ж раззвоняць па ўсім свеце! — здзіўляліся гаспадары. — Проста шчаслівчык нейкі! Глядзіш, нам, чаго добрага, давядзецца ганарыцца тым, што ён служыць у нас.

Ды яны, вядома, і не думалі гэтым ганарыцца, бо ніколі не забываліся, што яны гаспадары са знакамітага роду, а значыць — у любы момант могуць звольніць Ларсена, калі ім гэтага захочацца. Але яны яго не праганялі, — гэта былі добрыя людзі, а такіх добрых людзей, на шчасце розных там Ларсенаў, на свеце вельмі многа.

Вось і ўся гісторыя пра садоўніка і гаспадароў.

Падумай над ёю, паразважай.

1. Якія ўражанні выклікала ў вас гэта гісторыя?

2. Якім вам уяўляецца садоўнік Ларсен? Што ён быў за чалавек? Як ён ставіўся да сваіх абавязкаў? Як трымаў сябе са сваімі гаспадарамі? Як вы думаеце, ці можна на самай справе лічыць яго *шчаслівчыкам*?

3. Што вы думаеце пра гаспадароў Ларсена? Якія гэта былі людзі? Як яны ставіліся да Ларсена?

4. Як ацаніла густ садоўніка маладая прынцэса? Які ўрок атрымалі ад яе гаспадары Ларсена? Раскажыце, ці змянілася іх стаўленне да свайго садоўніка пасля гэтага выпадку.

5. Хто з герояў твора выклікаў у вас сімпатыі і чаму?

6. Перачытайце канцоўку літаратурнай казкі. Пракаменціруйце заўвагу аўтара пра тое, што гаспадары *«ніколі не забываліся, што яны гаспадары са знакамітага роду, а значыць — у любы момант могуць звольніць Ларсена, калі ім гэтага захочацца. Але яны яго не праганялі, — гэта былі добрыя людзі, а такіх добрых людзей, на шчасце розных там Ларсенаў, на свеце вельмі многа»*.

7. Якім уяўляецца вам аўтар? Як ён на самай справе ставіцца да кожнага з герояў казкі? Свой адказ падмацуйце цытатамі з тэксту.

8. Складзіце план твора, падрыхтуйце яго сціслы пераказ. Пастарайцеся перадаць думкі і пачуцці аўтара, яго эмацыянальны стан, зварот да слухача.

## Кантрольныя пытанні і заданні

1. Прыгадайце творы, змешчаныя ў гэтым раздзеле. Чым узбагацілі яны ваша ўяўленне пра літаратурныя казкі?

2. Які з гэтых твораў вам асабліва спадабаўся? Абгрунтуйце свой выбар.

3. Паразважайце, чым літаратурныя казкі адрозніваюцца ад народных? Што іх яднае?

4. Прыдумайце на занятках калектыўную казку, скарыстаўшы свой досвед пра народныя і літаратурныя казкі.

# V. Слова чаруе…

***Аркадзь Куляшоў***

### Пра восень

Замаўкаюць птушыныя звонкія спевы,
Калі восень прыходзіць у край наш лясны,
І, як свечкі, вакол ярка ўспыхваюць дрэвы
На праводзінах лета, на памінках вясны.

Там, дзе восень ідзе, лес шумлівы радзее,
Вецер гоніць хмарыны з-за цёмных ялін,
Грозны чуючы сівер, лісты, як надзеі,
Аблятаюць на дол з пачарнелых галін.

Я, улюбёны ў жыццё, не скаруся пагрозе
На праводзінах тых, на памінках старых,
Выйду з лесу і стану ў зімы на парозе
Дрэвам я, што лістоў не губляе сваіх.

Я трымаў іх з вясны, да вясны датрымаю,
Не развею па свеце, не кіну ў бяду,
Дружным пошумам іх новы май прывітаю
І з адзінаю просьбай на дол упаду:

— Адгукніся, вясна, мне зязюляй з-за рэчкі,
Дай яшчэ раз прыпасці да любай зямлі
І каштанаў сваіх незгасальныя свечкі
Над маёй адшумеўшай вясной запалі!

1. Калі б у вас запыталі, пра што гэты верш, вы, напэўна, адказалі б, што ён пра восень. І назва нібыта сведчыць пра гэта. Але верш не толькі пра восень. Перачытайце яго яшчэ раз і паразважайце над ім.

2. Якой паўстае восеньская прырода ў дзвюх першых строфах верша? Якія паэтычныя карціны ў іх намаляваны? Паспрабуйце іх уявіць і апісаць словамі.

3. Зачытайце радкі, у якіх выяўлены асабістыя пачуцці паэта, яго думкі і перажыванні, што нахлынулі ад сузірання восеньскай прыроды. Якім бачыць сябе паэт?

4. Перачытайце апошнюю страфу верша. Якая асноўная думка выказана ў ёй?

5. Падзяліцеся сваімі ўражаннямі ад верша. Паспрабуйце перадаць іх у сваім чытанні.

***Аляксей Пысін***

* * *

Не адчувае лес зямлі —
Зімою лес бліжэй да неба.
Спяваюць белыя чмялі
Аб тым, што кветак ім не трэба.
З вятрамі, з хмарай снегавой
Сасна птушыная ў палёце.
Спяць кажаны ўніз галавой
Насуперак зямной прыродзе.

Зямля замерзлая — як дом,
Хавае ўсё, чым жыць павінны,
І свеціць блізкім аганьком
Пад лёдам ягадка каліны.

1. Якім убачыў зімовы лес паэт? Які настрой пераважае ў вершы?

2. Якія паэтычныя карціны створаны аўтарам? Зачытайце адпаведныя радкі.

3. Растлумачце паэтычны вобраз: *«Спяваюць белыя чмялі // Аб тым, што кветак ім не трэба»*.

4. Якія вобразы падаліся вам больш яркімі, арыгінальнымі? Чым яны вас уразілі?

5. Якімі сродкамі моўнай выразнасці карыстаецца паэт для стварэння вобраза зімы? Растлумачце іх паэтычны сэнс.

## Выяўленчыя сродкі мовы ў мастацкім творы

Слова ў мастацкім творы не толькі расказвае, але і паказвае, малюе карціны жыцця, выяўляе пачуцці герояў, перадае іх настрой. Мастацкія творы захапляюць, хвалю-

юць і ўражваюць нас, бо, чытаючы іх, мы нібы становімся саўдзельнікамі падзей, быццам чуем і бачым усё апісанае ў творы. Дасягнуць выключнай выразнасці ў вобразнай перадачы падзей і раскрыцці чалавечых характараў майстрам прыгожага пісьменства дапамагаюць *вобразныя выяўленчыя сродкі мовы*, і найперш мастацкія азначэнні — *эпітэты*. Яны вылучаюць у прадмеце або з'яве асабліва значныя, істотныя прыкметы і ўласцівасці, якія немагчыма пакінуць па-за ўвагай.

*Эпітэт — мастацкае азначэнне, якое вобразна (жыва, наглядна, паэтычна) характарызуе прадмет, з'яву, чалавека.*

Значна дапамагаюць нашаму ўяўленню і *параўнанні*. Яны ўжываюцца для таго, каб паказаць незнаёмае, нябачанае раней праз супастаўленне яго са знаёмым, блізкім.

*Параўнанне — супастаўленне двух прадметаў або з'яў на аснове іх падабенства.*

Параўнанні вылучаюць новыя якасці, рысы, асаблівасці ў звыклым, даўно знаёмым, дапамагаюць ярчэй уявіць невядомыя рэчы і з'явы, а таксама выказаць свае адносіны да іх.

У будзённым жыцці мы з вамі гаворым: жыццё ідзе, гады бягуць, рабіна гарыць, вецер вые і г. д. Мы ў гэтым выпадку проста пераносім якасці, прыкметы, дзеянні з адной з'явы на другую, падобную да яе. Гэта — метафары. Яны вельмі блізкія да параўнанняў.

У параўнанні заўсёды відаць, што з чым супастаўляецца. А ў метафары параўнанне нібы схавана, стоена, пра яго мы толькі здагадваемся. Метафара выглядае, як скарочанае параўнанне: гады плывуць (як вада ў рацэ).

Метафара — адзін з самых распаўсюджаных тропаў (*троп — ужыванне слова ў пераносным значэнні*).

Яна вельмі лаканічная (кароткая, сціслая) па форме і разам з тым вельмі ёмістая, багатая па сэнсу. Літаральна двума-трыма словамі метафара стварае яркі мастацкі вобраз, які адразу знікне, калі яго паспрабаваць перавесці з мовы паэтычнай на звычайную.

*Метафара — гэта перанясенне ўласцівасцей адной з'явы на другую, чым-небудзь падобную да яе.*

Часам нежывому прадмету ці з'яве (дрэву, воблаку, сонцу, ветру, восені) для большай выразнасці, нагляднасці надаюцца якасці і ўласцівасці чалавека або жывой істоты. Узгадайце, напрыклад, народныя песні, у іх прадметы і з'явы прыроды надзелены розумам, мовай, уменнем рухацца, выконваць пэўныя дзеянні, адчуваць боль, смутак, радасць і інш.

Да прыёму ўвасаблення — прыпадабнення прадмета, з'явы чалавеку або жывой істоце (зверу, птушцы, жывёле, рыбе) — асабліва часта звяртаюцца паэты.

*Мастацкі прыём, калі нежывым, неадушаўлёным прадметам і з'явам надаюцца ўласцівасці чалавека або жывых істот, называюць увасабленнем.* Увасабленне — разнавіднасць метафары. Увасабленне дапамагае аўтарам паўней раскрыць свае пачуцці, сваё паэтычнае ўспрыманне прыроды і стварыць непаўторны мастацкі вобраз, а нам, чытачам, — выразней уявіць карціны навакольнага жыцця, лепш спасцігнуць аўтарскую задуму, убачыць у звычайнай, будзённай з'яве высокую паэзію.

***Язэп Пушча***

## Раніца

У сутонні п’яніцай
хістаецца пад плотам цень.
Умыўшыся яркай раніцай,
на сіні выган
выганяе
сонца пасвіць дзень.

Плаксівую смугу
памялом
змяло,
і промень сонца на шляху
пабег ў сутулае сяло.

З сявенькай працы на плячох
ратай спаткаў яго:
уцеха хлынула з вачэй
і гойснула ў сінь бягом.

Падшывалец вецер
лапоча песняй у лістве:
разбіўся мутны вечар
аб сонца ў сіняве!

1. Якім настроем прасякнуты верш?

2. Якія карціны паўстаюць у вашым уяўленні пры чытанні верша?

3. Прааналізуйце, пры дапамозе якіх мастацкіх сродкаў паэтычна абмаляваны *раніца*, *дзень*, *вечар*, *сяло*, *смуга*, *уцеха*, *вецер*, *промень* і іншыя вобразы верша. Якія з іх падаліся вам найбольш цікавымі і выразнымі? Намалюйце іх словамі.

4. Звярніце ўвагу на гучанне і будову верша. Падрыхтуйцеся выразна прачытаць твор. Якімі эмоцыямі і пачуццямі вы хацелі б падзяліцца са слухачамі?

***Васіль Вітка***

## Верасы

Што гэта: казка ці сон,
Ці лесу галасы?
Смычкоў суладны унісон
З размаху, наўскасы

Ударыў — і вясёлы дождж
За хмаркаю услед
Пабег, як хлопчык, басанож
У ясны, мілы свет,
Не разбіраючы дарог,
Да пушчы, нацянькі,
Дзе прабіваюць тоўсты мох
Грыбы баравікі,

Дзе сонца пырскае з суніц
І сонныя чмялі
За дзень ад паху медуніц,
Зусім абнемаглі,

Дзе ў пацерках густой расы,
Між цёплых баравін,
Нам песню дораць верасы
На дарагі ўспамін.

1. Якія карціны паўстаюць у вашым уяўленні пры чытанні верша?

2. Якія лясныя галасы хвалююць паэта?

3. З дапамогай якіх вобразаў аўтар перадае свае адносіны да лесу?

4. Якія вашы асабістыя ўражанні (пасля вандровак у лес) ажывіў гэты твор?

5. Паразважайце, якая яшчэ назва падышла б да гэтага верша.

6. Вызначце агульную танальнасць верша. Падумайце, якую выканальніцкую задачу вы пастáвіце для сябе, каб перадаць агульную настраёвасць твора?

7. Падбярыце краявід, блізкі, на вашу думку, па вобразах і настроі гэтаму вершу (выкарыстайце альбомы з рэпрадукцыямі карцін беларускіх мастакоў або фотаальбомы).

## Мастацкі вобраз у літаратурным творы

Мастацкая літаратура паказвае жыццё ў форме карцін, вобразаў, намаляваных словам. *Вобразнасць* — самая істотная адметнасць мастацкай літаратуры. Што ж такое мастацкі вобраз? Гэта форма паказу жыцця ў літаратурным мастацкім творы, карціна, якая выклікае ў чытача ўяўленне пра свет вакол нас, пра чалавека, прадмет, з’яву і абуджае нашы думкі, пачуцці, перажыванні. Разам з тым мастацкі вобраз ствараецца з дапамогай уяўлення, творчага вымыслу аўтара.

*Мастацкі вобраз — створаная ва ўяўленні пісьменніка карціна жыцця, якая адлюстроўвае яго думкі, пачуцці і эмацыянальна ўздзейнічае на чытача.*

У мастацкіх творах суіснуюць розныя вобразы: *вобраз-персанаж* (інакш: *літаратурны герой, дзейная асоба, вобраз-характар*) — вобраз чалавека або жывой істоты; *вобраз аўтара* — вобраз паэта ці апавядальніка, *вобраз-*

*пейзаж* (вобраз прыроды), *вобраз-з’ява*, *вобраз-прадмет*, у лірычных творах — *вобраз-перажыванне* — пачуццё, настрой, выказаныя ў вершы.

Мастацкі вобраз нараджаецца пры дапамозе слова. Па-майстэрску карыстаючыся словам, пісьменнік перадае ход падзей, пачуцці людзей, фарбы і адценні прыроды. Асобая роля ў стварэнні мастацкага вобраза належыць мастацкім *тропам* (словам, ужытым у пераносным значэнні) — эпітэту, параўнанню, метафары, увасабленню, алегорыі, сімвалу, гіпербале, іроніі і інш. Мастацкія тропы ўзнікаюць на аснове мнагазначнасці слова, яны павялічваюць яго сэнсавую ёмістасць, узбагачаюць мову новымі адценнямі слоў, развіваюць у чытачоў вобразнае ўяўленне, фантазію. Тропы дапамагаюць пісьменнікам ствараць яркія і наглядныя вобразы, выяўляць свае адносіны да жыццёвых з’яў і ацэньваць іх, а нам, чытачам, — паўней, жывей, выразней уяўляць абмаляваныя карціны.

1. Якая самая істотная адметнасць мастацкай літаратуры?
2. Што такое мастацкі вобраз у літаратурным творы?
3. Як узнікае мастацкі вобраз? Якія сродкі мастацкай выразнасці ўдзельнічаюць у яго стварэнні?
4. Чым адрозніваюцца мастацкія вобразы ў лірычным і эпічным творах?

## Кантрольныя пытанні і заданні

1. Прыгадайце творы, змешчаныя ў гэтым раздзеле. Чым узбагацілі яны ваша ўяўленне пра сваю зямлю?
2. Які з гэтых вершаў вам асабліва спадабаўся? Растлумачце свой выбар.
3. Падбярыце ў альбомах па мастацтву рэпрадукцыі пейзажных палотнаў беларускіх мастакоў (Вітольда Бялыніцкага-Бірулі,

Фердынанда Рушчыца, Паўла Масленікава, Віталя Цвіркі, Міколы Купавы, Уладзіміра Савіча, Уладзіміра Сулкоўскага, Эдуарда Рымаровіча і інш.), на якіх адлюстравана ваша любімая пара года. Падрыхтуйце вуснае сачыненне па адной з абраных карцін.

4. Як вы разумееце тэрмін «мастацкі вобраз»? Як ён ствараецца? Якія тропы садзейнічаюць перадачы аўтарскага мастацкага бачання?

5. Якія мастацкія вобразы, створаныя беларускімі пісьменнікамі, вас асабліва ўразілі? Падзяліцеся сваімі ўражаннямі.

6. Падрыхтуйце вуснае сачыненне-апісанне любімай пары года ці пейзажную замалёўку на абраную тэму на падставе прачытаных вершаў і ўласных назіранняў за прыродай (з выяўленнем асабістага перажывання).

7. Паспрабуйце самі скласці 2—3—4 вершаваныя радкі пра тую пару года, якая вам больш падабаецца.

# V. Слова хвалюе…

***Карусь Каганец***

## Скрыпач і ваўкі

Быў у нас на сяле скрыпач Ахрэм. Ён быў так сабе, просты гаспадар. Яшчэ змалку навучыўся ён на скрыпцы граць, і такі не абы як іграў. А людзям таго і трэба. Вось прыйшла восень, пачаліся вяселлі, — і клічуць Ахрэма то туды, то сюды іграць на вяселлях. І людзям весялей, і чалавеку заработак.

Вось аднаго разу паклікалі яго ў другую слабаду іграць, — так вёрст за сем ад нашае. Вядомае дзела, вяселле скора не робіцца. Прыйшлося Ахрэму вяртацца адтуль позна ўночы. Ісці трэба было лесам. Праз лес ішла ездавая

дарога, каторую трэба было абмінаць, бо сцежкаю было бліжэй, як тою дарогаю. Ахрэм і думае: «Пайду проста сцежкаю — усё ж бліжэй будзе». Дый пайшоў.

Ноч была і так цёмная, а то яшчэ ў лесе. Ішоў ён, ішоў ды неяк заблукаў ды разам як праваліцца, як праваліцца кудысь пад зямлю! Упаў і не так пабіўся, як злякаўся. Што яно такое?

Падумаўшы — здагадаўся: у лесе было шмат ваўкоў і шкоды было ад іх нямала, дык іх стралялі і лавілі. А лавілі іх так: выкапаюць яму глыбокую, дзе воўчых слядоў найболей, а яму прыкрыюць тонкім галлём і травою прытрусяць, каб не відаць было; за ямаю яшчэ часам і прынаду паложаць. Як воўк прынаду счуе і пабяжыць да яе, дык у яму і праваліцца. Вось у такую яму патрапіў і Ахрэм.

Як здагадаўся Ахрэм, дык трохі ад сэрца адлягло. Калі чуе — у яме штось як завые! Ахрэм так і пахаладзеў. Глянуў — ажно проціў яго як бы дзве свечачкі гараць. Ахрэм ведаў, што ў воўка ўпоцемку вочы свецяцца, і што гэта ваўчок папаўся ў яму і сядзіць. «О, гэта добры таварыш, — думае Ахрэм, — а ў мяне і паганага калка няма, адно скрыпка!» Што яму тутака рабіць? Вылезці з ямы ўпоцемку нельга ды і повідну не вельмі, бо яма глыбокая, а яшчэ пачні вылазіць, дык воўк цябе ззаду. Не, трэба сядзець ціха. Залез Ахрэм у куток, а воўк у другім. І думае Ахрэм: «Гэта ён цяпер спалохаўся, дык не чапае, а як ачухаецца, то з костачкамі з'есць мяне». І, сапраўды, крыху пачакаўшы, воўк пачаў ужо варушыцца, няйначай бліжэй падступаць. «Пагана, — думае Ахрэм, — нічога тут не зробіш! А ну, хіба на скрыпцы зайграю». Узяў, прылажыў скрыпку ды як разане смычком па струнах, а скрыпка як загалосіць, а воўк як адскочыць! «О, — думае Ахрэм: — гэта добра!» Дый давай іграць ды яшчэ вясёлае, да тан-

цаў. Воўку, мабыць, спадабалася, — пачаў ён пад музыку выць. Скрыпач грае, а воўк вые. Калі чуе Ахрэм, ажно з лесу яшчэ воўчыя галасы адазваліся. «Вось, — думае Ахрэм, — папрыбягаюць!» Але іграць не кідае, усё грае. І такая ў іх музыка: Ахрэм грае, воўк у яме вые, а другія ваўкі з лесу сабе голас падаюць. Такое выццё ўчынілі! Ахрэм усё іграе. Ніколі яшчэ ён так шчыра не іграў, як цяпер, бо думаў, што як кіне іграць, то воўк зараз да яго ды з'есць. Калі гэта адна струна — дзынь — дый парвалася. Няма чаго рабіць, — трэба іграць на трох. Калі і другая — дзынь — і тая парвалася. Бачыць Ахрэм, што ліха: пачаў не так ужо моцна іграць. Але як на тое ліха, яшчэ і з дзесятак разоў смычком не пацягнуў, як і трэцяя струна лопнула. Цяпер засталася адна. Бедны Ахрэм думае: «Вось, вось зараз і гэта лопне, — з'есць тады мяне ваўчуга?!» Іграе, гаротны, на той адной струне, а сам на неба пазірае: ці не світае часам? Ды моліцца: «Госпадзі! Пашлі хутчэй свет. Можа хто недалёчка будзе ісці ды пачуе».

І хто яго там ведае, што б было, але сапраўды стала на свет займацца, і так давялося, што з нашае слабады стралец засядаў у лесе на звера ды блізка праходзіў і пачуў, што скрыпка грае, а воўк вые. Ён пайшоў паглядзець, што яно за дзіва такое. Патрапіў на тое мейсца, дзе была яма, падыходзіць і чуе, што няйначай у зямлі іграе. А Ахрэм гэтаксама чуе, што хтось ідзе, дый думае: «Вось яшчэ ваўкі бягуць, — тут ужо мне канец». Калі чуе, аж хтось гукае: «А хто тутака грае?»

Ахрэм іграць кінуў ды як закрычыць:

— Я, я іграю!

— Ды хто?

— Ахрэм-скрыпач.

— Ды дзе ж бо ты граеш?

— У воўчай яме, уваліўся.

— Дык навошта ж ты граеш?

— Воўка забаўляю.

Падышоў стралец бліжэй, глянуў — і праўда: у адным кутку Ахрэм, а ў другім воўк. Зараз стралец спусціў Ахрэму дручка і выцягнуў яго, а тады ўжо воўка забіў.

З таго часу больш ужо Ахрэм ніколі поўначы сцежкаю нацянькі не хадзіў, бо казаў, што не хоча болей на воўчым вяселлі іграць.

1. Як вы думаеце, ці магло такое здарэнне адбыцца ў жыцці? Якія аргументы можаце прывесці, каб пацвердзіць сваю думку?

2. Падрыхтуйце пераказ тэксту ад імя скрыпача Ахрэма (паспрабуйце перадаць эмацыянальны стан героя, рух яго думак, перажыванняў, захоўваючы стыль і лексіку твора).

3. Прыгадайце адзін цікавы выпадак са свайго жыцця і раскажыце пра яго (з перадачай эмацыянальнага напружання, душэўнага стану ўдзельнікаў здарэння, а таксама асабістага стаўлення да падзеі).

***Сяргей Тарасаў***

## Фрэскі

Побач з бацькам Андрэйка ідзе па вузкай і бруднай гарадской вулачцы. Вымашчаная бярвеннем, заляпаная граззю, вулачка цягнецца ўздоўж рамесніцкіх хатак і двухпавярховых сядзіб гараджан. Яна то звужаецца, то зноў пашыраецца. Крок — тоўстае бервяно, крок — тонкае. А вось і зусім новыя, толькі-толькі абкораныя і пакладзеныя зверху, ад чаго пасярод вуліцы атрымалася невялікая прыступка.

Андрэйка ўважліва глядзіць пад ногі. І не таму, што яго цікавіць маставая і кожнае пад нагамі бервяно. Ён баіцца

паслізнуцца ці спатыкнуцца аб аполак — бяды тады не абярэшся. Чаго-чаго, а бруду тут хапае...

Хлопчык апрануты ў новыя порткі і чыста вымытую кашулю. Бацька нават дазволіў абуць новыя, шытыя чырвоным узорам чарэўі.

Хіба ж далі б яму такі абутак сярод лета, каб не ішлі яны... Ах, куды яны ішлі! Ад радасці Андрэйку хочацца на ўсю вуліцу крычаць. Глядзіце: ён ужо дарослы! Будзе самастойна працаваць! Стане майстрам!

Ад такіх думак, быццам крылы, распраўляліся плечы, грудзі напаўняліся паветрам, выпіналіся наперад, а нос аж задзіраўся ўгору. Тады ён забываўся глядзець пад ногі і некалькі разоў ледзь не чмякнуўся. Але ўтрымаўся. Гэта прымусіла зноў апусціць галаву.

Вось ужо сядзіба Вялікага пасада засталася ззаду. Яны выйшлі з бацькам на бераг Палаты. Рака весела бегла па камянях, віравала над ямамі і хавалася ў шматлікіх выгінах. То ў адным, то ў другім месцы звісалі над кручамі дрэвы, карані якіх пілі ваду проста з ракі.

На хісткім мастку, адным з тых, што так багата на Палаце, бацька з сынам перайшлі на другі бераг і там ступілі на шырокую сцяжыну, якая павяла іх праз лес.

Толькі зайшлі ў лес, магутныя сцены і высокія вежы Полацка разам з пяццю гмахамі Сафійскага сабора адразу схаваліся за густымі дрэвамі. Бацька неяк расказваў, што сабор быў пабудаваны сто гадоў назад знакамітым полацкім князем Усяславам Чарадзеем. Гэта — трэці па ліку сабор пасля Кіеўскай і Ноўгарадскай Сафіі.

...Сцежка вядзе ў Сяльцо. Зусім нядаўна, па загадзе цяперашняга князя і з дазволу полацкага епіскапа — уладыкі Іллі, там пачалі будаваць манастыр. Старэйшая дачка князя — Прадслава — пастрыглася ў манашкі і прыняла

імя Еўфрасінні. Гэта для яе будуюць палачане манастыр. Андрэйка, праўда, так і не зразумеў, што такое манастыр, хоць бацька і тлумачыў, што гэта такое месца, дзе асобна жывуць мужчыны і асобна — жанчыны, моляцца Богу, чытаюць, перапісваюць нейкія таямнічыя кніжкі.

Кніжкі Андрэйка бачыў, калі разам з бацькам хадзіў у святую Сафію. Толькі навошта вось дзеля гэтага будаваць новы дом, ды яшчэ за горадам — незразумела. Але калі так робяць дарослыя, значыць, трэба...

Нарэшце яны прыйшлі. На пляцоўцы між лесам і полем віравала жыццё. Гэтулькі людзей Андрэйка ніколі не бачыў. Хіба што падчас вялікіх кірмашоў. Звычайна гэта было ўвесну, як толькі спадала ў Дзвіне вада. Тады на бераг ракі высыпала палова горада, каб паглядзець на заморскія тавары. Чаго толькі ні прывозілі ў Полацк замежныя госці! Паважаныя візантыйцы няспешна назіралі, як згружалі дарагую парчу і шкло, мажныя барадатыя варагі ахапкамі зносілі мячы для вояў і бразготкі для жанчын. Мітусіліся і весела гаманілі кіяўляне. Яны звычайна прывозілі тавар для простага люду: шкляныя бранзалеткі, шыферныя оўруцкія праслачкі для верацён і іншую драбязу. Тады на беразе было весела, святочна, а тут...

Строгія твары, стрыманая гаворка. Высокім гмахам узвышалася царква. Яна яшчэ напалову была ў рыштаваннях. Крытая свінцом макаўка рассыпала вакол сябе зіхатлівыя промні сонечных зайчыкаў. Крыху далей яшчэ адна царква, ніжэйшая, быццам прыціснутая да зямлі. Відаць, што не першы год стаіць, бо месцамі пашарпаная.

Людскі паток віраваў каля новай, як казаў бацька, Спаскай царквы. Да яе туліліся драўляныя прыбудовы — манастырскія келлі. Навокал стукалі сякеры цесляў, а побач,

у спецыяльна адведзеным месцы, муляры мясілі вапну, рабілі раствор — цамянку і рыхтавалі тонкую пляскатую цэглу — плінфу.

Ідучы паўз пляцоўку, на якой сохла на сонцы сырая плінфа, Андрэйка ўбачыў вялізнага шэрага ката. Ён схаваўся за кучаю будаўнічага друзу і цікаваў за вераб'ямі, якія скакалі па цэгле, пакідаючы на ёй адбіткі сваіх маленькіх тонкіх лапак. Вось адзін верабейка неасцярожна наблізіўся да ката. Маланкавы скачок — і шэры разбойнік прымусіў усю чародку падняцца ў паветра. Кату не пашанцавала. Толькі на плінфах побач з маленькімі птушынымі трохкутнічкамі засталіся глыбокія, крыху размазаныя каціныя кіпцюры.

Бацька рассмяяўся:

— Вось і кот прыклаў лапы да будоўлі, — сказаў ён. — Высахне цэгла і ляжа ў сцены царквы разам са слядамі няўдалага палявання.

Тым часам падышлі да худога, сярэдняга росту мужчыны з доўгай чорнай барадою. Рукі і кашуля яго былі так запэцканы фарбаю, што, каб не сур'ёзны пагляд незнаёмца, можна было б прыняць яго за вулічнага скамароха.

— Дзень добры, Лукаш! — павітаўся бацька.

— Добры.

— Вось, як і дамовіліся, прывёў сына...

Бацька шырокай далонню падштурхнуў Андрэйку наперад.

Хлопчык, не падымаючы галавы, уважліва разглядаў свае чарэўі.

— Ці возьмеш?

— Чаму ж — можна ўзяць. Спачатку вучнем, потым падмайстрам, а там, глядзіш, і сам пісаць лікі навучыцца не горш за мяне. Толькі ці ёсць у яго душы іскра?

— Ёсць, ёсць! — запэўніў бацька. — Колькі ўжо бяросты скрэмзаў сваімі малюнкамі! Я нават тое-сёе захапіў. Вось глянь!

Ён дастаў з-за пазухі некалькі скруткаў бяросты, на якіх вострай палачкай, падобнай на тыя, якімі пісалі дарослыя, былі надрапаны Андрэйкавы малюнкі. На адным — смешныя, нязграбныя чалавечкі з вялікімі галовамі на танюткіх ножках. Побач, на доўгіх вяроўках, матлялі хвастамі два сабакі. Відаць, ім было сумна, і сабакі брахалі на месяц, які таксама быў надрапаны ў верхнім куточку бяросты.

На другім малюнку хлопчык намаляваў маці, тату і сябе. У маці былі доўгія падвязаныя валасы, бацька трымаў у руцэ малаток — ён быў каваль, — а сам Андрэйка стаяў побач і ўсміхаўся на ўвесь рот.

— Ну, браце, — здзівіўся Лукаш, — цябе не ў вучні, а ў майстры адразу можна браць, — і, цёпла ўсміхнуўшыся, спытаў:

— А як жа зваць цябе, майстра?

— Андрэй, — глуха прабубніў пад нос хлопчык.

— То вазьму цябе, Андрэй, усіх мудрэй, усіх хітрэй. Пажывём, паглядзім, што з цябе атрымаецца. А пакуль будзеш фарбы расціраць ды розуму набірацца.

На гэтым мужчыны развіталіся, і Андрэйка застаўся з Лукашом.

— Ты, дружа, не губляйся, — пачуў ён голас майстра, калі бацькава постаць знікла наляснай сцяжыне. — Такіх, як ты, тут многа — не засумуеш. І работы хопіць. Хадзем пакажу, што рабіць маеш.

І яны пайшлі да царквы, што стаяла ў рыштаваннях. Каля самага ўвахода нечакана спыніліся.

З вузкага праёма царкоўнай брамы насустрач выйшла жанчына, з галавы да пят апранутая ва ўсё чорнае. У вочы

кінуўся надзвычай белы, з лёгкім, ледзь прыкметным румянцам твар. Яна была зусім маладая, маладзей за Андрэйкаву маці.

Жанчына паглядзела на хлопчыка, потым на Лукаша. Шырока пасаджаныя вялікія блакітныя вочы вабілі незвычайнай сілаю. Глыбокі, пранізлівы позірк прыгожых вачэй апаліў, працяў Андрэйку наскрозь, прымусіў схіліць галаву. Тое ж адбылося і з Лукашом. Па постаці, па гэтых таямнічых загадкавых вачах хлопчык зразумеў, што перад ім сама Еўфрасіння — князёўна Прадслава, для якой і будуецца гэты манастыр.

З хвіліну стаялі моўчкі. Нарэшце пачуўся ціхі, крыху ўсхваляваны, але цвёрды голас:

— Я бачыла тваю работу, майстра... Ці не занадта дазваляеш сабе?

Лукаш ніжэй апусціў галаву.

— Я ўсяго толькі грэшная манахіня, — працягвала яна, — смяротны чалавек, які нарадзіўся і памрэ. Ты ж павінен пісаць лікі святых — тых, хто быў і вечна будзе. Ты мяне разумееш?

— Разумею.

— Тады перапішы лікі нанава...

— Не.

— Чаму?

Нарэшце Лукаш падняў галаву і зірнуў на Еўфрасінню. Позіркі іх сустрэліся. Ён маўчаў. Потым ледзь чутна вымавіў:

— А ты не разумееш, Прадслава?

Словы гэтыя быццам апяклі яе, штурханулі ў грудзі. Твар ледзь заружавеўся, але выраз яго не змяніўся. У вачах успыхнулі і адразу згаслі кволыя агеньчыкі. На хвіліну здалося, што і яна, гэтая строгая манахіня, зараз апусціць вочы.

— Лукаш, — у галасе ігуменні пачулася цеплыня. — Лукаш, ты ж ведаеш: няма больш князёўны і няма больш Прадславы. Гэта не вернецца, як і не вернуцца нашы гульні на бацькавым дворышчы... Забудзь! Так трэба. Ты чуеш мяне?

— Чую.

— Перапішы лікі..

— Не буду.

— Тады... я магу загадаць табе, але я прашу. Проста прашу: не рабі так болей.

— Добра.

І яны разышліся.

Пераступіўшы ганак царквы, майстра ўспомніў пра Андрэйку. Той ішоў услед і ледзь не таркануўся яму ў спіну, калі Лукаш нечакана спыніўся.

— Хадзем сюды, не хвалюйся, — апошняе сказаў не столькі хлопцу, колькі сабе самому.

Зніклі вулічная гамана, галасы людзей. Уласныя крокі рэхам луналі пад столлю. Праз нейкі час вочы Андрэйкі звыкліся з цемрай, і ён са здзіўленнем заўважыў, што і ўнутры царква ў рыштаваннях. Яны ўзнімаліся да самага верху, але канца не было відно. Здавалася, стаіш пад бязмежнай прасторай начнога неба, на якім ніводнай зорачкі.

У некалькіх месцах на драўляных бэльках свяціліся агеньчыкі — гарэлі свечкі. Каля іх у розных паставах сядзелі людзі. Яны распісвалі сцены па свежай тынкоўцы.

— Вось глядзі, Андрэйка, калі-небудзь і ты гэтак будзеш пісаць. Толькі навучыцца гэтаму не проста, як скажам, шыць чарэўі, ляпіць гаршкі ці каваць, як робіць твой бацька. Можна ўсё жыццё расціраць фарбы для тых, хто піша лікі. Сапраўдным майстрам трэба нарадзіцца...

У некалькіх месцах праз вокны прабіваліся яркія промні святла. Круглымі каляровымі плямамі яны падалі на сцены, зіхацелі, пераліваліся ўсімі колерамі вясёлкі.

Андрэйка наблізіўся да адной сцяны, каб разгледзець яшчэ не прасохлыя фрэскі, і — сумеўся. Адтуль на яго глядзела маладая жанчына. Белы, з лёгкім румянцам авальны твар, апраўлены ў манаскі клабук, трошкі завостраны падбародак, шырока пасаджаныя блакітныя вочы. Вочы Еўфрасінні-Прадславы... Яны пранізліва, з глыбокім сумам глядзелі на хлопчыка, быццам пра нешта пыталі.

Андрэйка разгубіўся. З супрацьлеглай сцяны на яго зноў пазіралі тыя ж вочы. Але выраз іх ужо змяніўся. Не было таго суму і ўнутранага сузірання. Яны свяціліся надзеяй, узнёсласцю і чысцінёй.

Такога дзіва хлопчык дагэтуль не бачыў. Усхваляваны, ён зірнуў на Лукаша, і раптам у яго душы нешта абарвалася. Гэта «нешта» ніяк не клалася на словы. Яно трымцела, штурхала малечае сэрца, ірвалася вонкі. Андрэйку хацелася закрычаць, але не было сілы. І ён заплакаў. Дробныя пякучыя слёзы пакаціліся па твары...

Дзве вузкія далоні з тонкімі пальцамі мякка леглі на яго плечы.

— Ну што ты! Не варта... Бачу, з цябе атрымаецца сапраўдны майстра. — І ціха дадаў: — Можа, сапраўды, нічога не было... А тое, што было,— трэба забыць. Вось толькі вочы...

1. Калі адбываецца дзеянне, адлюстраванае ў апавяданні? Якія выразныя прыкметы часу сустракаюцца ў творы?

2. Хто такі Андрэйка? Якія пачуцці і з якой нагоды перапаўнялі яго душу?

3. Якім паўстае ў творы старадаўні Полацк? Знайдзіце ў тэксце адпаведныя радкі і зачытайце іх.

4. Чым зацікавіла хлопчыка будоўля манастыра?

5. Перачытайце эпізод сустрэчы Андрэйкі з князёўнай Прадславай. Чым уразіла хлопчыка Еўфрасіння? Што незвычайнае ён адчуў, заўважыў у яе знешнасці?

6. Прыгадайце размову Еўфрасінні з Лукашам. Пра што прасіла мастака ігумення? Як у гэтым дыялогу выявіўся характар жанчыны?

7. Якім вы ўяўляеце мастака Лукаша? Ці зразумеў ён Андрэйку, адчуў яго незвычайнасць? Як пра гэта гаворыць аўтар?

8. Чым надзвычай здзівілі, так моцна ўразілі Андрэйку фрэскі? Як перадае душэўны стан хлопчыка пісьменнік?

9. Якой вам уяўляецца Еўфрасіння Полацкая? Што вы ведаеце пра славутую беларускую асветніцу?

## Пра апавядальныя творы

Апавяданне і аповесць — эпічныя (апавядальна-апісальныя) жанры, яны маюць шмат агульнага, нават паходзяць ад аднаго слова «апавядаць», гэта значыць паведамляць, расказваць пра што-небудзь.

У аснове апавядання ляжыць нескладаны сюжэт (у ім распавядаецца пра які-небудзь выпадак, здарэнне ў жыцці аднаго ці некалькіх герояў), аднак яно вызначаецца глыбокім зместам. Апавяданне бывае невялікае па памеры — займае звычайна некалькі старонак. Галоўнае месца ў апавяданні адводзіцца расказванню, аповеду пра падзею (ці падзеі), аднак сустракаюцца ў ім таксама дыялогі, маналогі, апісанні.

*Апавяданне — невялікі празаічны твор, у якім расказваецца пра асобную падзею, выпадак або здарэнне ў жыцці героя.* У апавяданні няшмат персанажаў, дзеянне адбываецца на працягу невялікага адрэзка часу.

Апавядальнікам у творы звычайна выступае сам пісьменнік (*аўтар-апавядальнік*). Ён быццам збоку пільна на-

зірае за дзеяннем і яго героямі і праўдзіва пра ўсё паведамляе. Аднак апавядальнікам можа быць адзін з удзельнікаў падзей — нехта з персанажаў ці сам галоўны герой (*герой-апавядальнік*). У гэтым выпадку апавядальнік больш выразна раскрывае свае погляды на падзеі, выказвае свае адносіны да іншых персанажаў: пазіцыя аўтара ляжыць на паверхні, яе лягчэй зразумець.

У апавяданні кожнае слова, кожная дэталь маюць значэнне, яны дапамагаюць лепш зразумець характары герояў, усвядоміць падзеі, глыбей успрыняць усё тое, што хацеў сказаць аўтар сваім творам.

Апавяданне прыйшло ў мастацкую літаратуру з вуснай народнай творчасці, яму папярэднічалі казкі, легенды, паданні і іншыя жанры. Апавяданне адносіцца да малых форм эпасу. Ад аповесці адрозніваецца тым, што яно меншае па аб'ёме і мае прасцейшую будову. У аповесці звычайна развіваецца некалькі сюжэтных ліній, адносна самастойных, у той час як апавяданне паказвае часцей нейкую адну падзею з жыцця героя.

*Аповесць — мастацкі твор, у якім расказваецца пра шэраг падзей, што адбываюцца на працягу значнага перыяду жыцця галоўнага героя, паказваюцца яго ўзаемаадносіны з іншымі персанажамі.*

Аповесць — надзвычай пашыраны жанр у беларускай прозе. Яна прыцягвае нашу ўвагу рухам падзей, зменай эпізодаў, апісаннем думак, перажыванняў, паводзін герояў.

1. Чым вылучаецца апавяданне сярод іншых літаратурных жанраў? Якія асноўныя прыкметы мае апавяданне?

2. Які літаратурны твор называецца аповесцю? Узгадайце аповесці, якія вы прачыталі раней. На прыкладзе аднаго з гэтых твораў назавіце асноўныя адметнасці жанру аповесці.

3. Чым аповесць адрозніваецца ад апавядання?

*Васіль Быкаў*

## Сваякі

— Не! — сказала яна, стукнуўшы аб падлогу вілачнікам. — І не думайце!

Седзячы ля стала, яны пераглянуліся. Старэйшы — высокі, худы, па-юнацку нязграбны Алесь адразу нахмурыўся і зацяўся ў сабе, а на зусім яшчэ хлапечым пухлаватым твары пятнаццацігадовага Сёмкі мільганула нешта ўпартае і злоснае.

— Усё роўна пойдзем!

— Паспрабуйце! Паспрабуйце, ірады! Бач, удумалі! Смаркачы няшчасныя! Я вам пакажу партызанаў!

Гэта была пагроза, але ў ёй адчувалася не так сіла і ўпэўненасць, як бездапаможнасць, ад якой яна ўсхліпнула і з вілачнікам падскочыла да хлопцаў. Яны павінны былі б разбегчыся, як гэта рабілі заўжды дагэтуль, але цяпер нават не крануліся з месца, і гэта зусім раззлавала яе. Сёмка толькі ўзняў руку, яна выцяла яго некалькі разоў, не гледзячы куды, потым адзін раз — Алеся. Старэйшы прыняў яе ўдар з каменнай абыякавасцю на змрочным худым твары, нават не ўздрыгнуў, толькі мацней сцяў вусны, і яна зразумела, што ўсё гэта — дарма. Дарма ўвесь яе гнеў, яе лаянка, яе запазнелая спроба вярнуць сваю ўладу над хлопцамі. Роспач адразу падламіла яе і, кінуўшы вілачнік, яна выйшла ў сенцы.

Некалькі пакутных хвілін яна корчылася на сундуку ад бездапаможнасці і крыўды, не ў стане зразумець, чаму яны такія ўпартыя ў гэтым відавочным і пагібельным сваім намеры? Яна разумела і нават апраўдвала, калі на гэта ішлі дарослыя — акружэнцы і свае мужыкі, але што ў той

калатнечы магло прывабіць падлеткаў, амаль што дзяцей? Што яны зробяць у лесе, апроч як па-дурному загінуць, як загінуў той, што тыдзень назад з ночы ляжаў да поўдня на аколіцы, застрэлены нямецкай засадай, такі маладзенькі, прыгожы дзяцюк, у акрываўленай вайсковай сарочцы. Так і яны будуць валяцца дзе-небудзь, і на іх будуць страхавіта глядзець незнаёмыя людзі, і п’яныя паліцаі будуць перакочваць іх сваімі падкутымі ботамі, а на іх босых нагах будуць апантана бегаць прагныя веснавыя мухі...

Не, ужо таму не быць! Хопіць таго, што без пары без часу склаў голаў бацька, а ў іх яшчэ, слава богу, ёсць маці, яна не можа дапусціць іхняй пагібелі. Ёй, пэўна, вядома, хто падбіў іх на гэтую гібельную справу, яна знойдзе яго і не пакіне ніводнай валасіны ў ягонай фасоністай белай чупрыне.

З раптоўнай рашучасцю яна падхапілася з сундука, выбегла на падворак, але тут жа вярнулася, сюды-туды кінулася па сенцах, шукаючы якой падпоркі і, не знайшоўшы нічога зручнага, сарвала з крука каромысла. Ахопленая помслівым зларадствам, яна туга падперла каромыслам дзверы ў хату і кінулася на вуліцу, на бягу трохі аправіла касынку і ўжо не выцірала слёз, якія ўсё яшчэ цяклі па яе шчоках.

Яна бегла па вуліцы, разганяючы пад платамі курэй, босымі нагамі ўзнімаючы ў доле пыл, і галаву яе распірала ад гнеўных, народжаных яе, мацярынскаю крыўдай слоў. Яна скажа гэтаму Яхіму, што ён душагуб, ірад бязлітасны, яна дапытае, навошта яму спатрэбіліся гэтыя зялёныя хлапчукі? Калі ўжо ўдумаў, дык хай бы сабе і ішоў сам куды толькі яму захочацца — хоць у партызаны, хоць у паліцыю, ці самому д’яблу ў зубы, толькі без іх. Хай ён зараз жа аб’явіць ім, што нікога з сабой не возьме, інакш

яна паломіць на ягонай галаве ўсе чапельнікі, збэсціць яго на ўсю вёску.

Са злосці яна дужа штурхнула дзверы гэтай старэнькай пакаселай хаціны, не зачыняючы іх, ірванула за клямку другія — з хаты патыхнула прахалодай земляной падлогі і бязлюднаю цішынёй. Тады яна тузанула пасцілку ў запеччы — з кучы цёмнага ашмоцця прыўзнялася белая галава старога Лукаша, ягоныя падслепаватыя вочы хваравіта заміргалі насустрач.

— Дзе завадатар ваш?

— Гэта Яхімка, ці што? А хто ж яго ведае. Хіба цяперака дзеці пытаюцца ў бацькоў...

— А ўночы ён спаў дома?

— Не ведаю я. Быццам не чутно было.

Вядома ж, што мог сказаць ён, гэты амаль аслеплы, забыты богам стары, мусіць, Яхіма не так проста было злавіць, яна адчула, што ўвесь запас яе гневу вось-вось мінецца без жаднай карысці і зноў не стрымала сябе. Праўда, слёз ужо не было, былі толькі ўдушлівыя камякі ў грудзях, і пакуль яна, прыпёршыся да печы, перасільвала іх, Лукаш цярпліва стагнаў у запеччы, спакутаваны ўласнай хворасцю.

І ўсё ж яна іх не аддасць, яны — яе дзеці, яна — для іх маці і не пагодзіцца на іх пагібель, хутчэй сама ляжа трупам на гэтым іх вар'яцкім шляху, але засцеражэ іх ад смерці.

Яна ўвесь час амаль бегла — праз вёску, міма пунь, хлеўчыкаў, свіронкаў, з дзяцінства знаёмых хацінак, пасля — па выгане з маладой вясновай траўкай, уздоўж свежа і весела прыбранага першай веснавой зелянінай раўка. Як за апошнюю сваю магчымасць, яна ўчапілася цяпер за думку — прасіць Дразда, што жыў у суседняй цераз поле

вёсцы. Праўда ад зімы ён хадзіў паліцаем, з выгляду быў па-начальніцку важны і строгі, але яна ведала яго маці ды і яго ад самага дзяцінства, усё ж ён ёй дваюрадны пляменнік, не абы-хто чужы. Яна раскажа яму аб сваім горы, і ён павінен чымсь пасобіць, як мужчына, і галоўнае — свой чалавек. Хай ён іх напалохае, пасадзіць на колькі дзён у свіронак, хай нават нядоўга патрымае ў турме, але каб толькі не сышлі ў лес і на старасці не асіраацілі яе.

Яна толькі баялася, каб Дрозд не паехаў куды, не быў заняты, не адмовіў і тым не адабраў у яе апошнюю магчымасць утрымаць іх. Але сонца апусцілася ўжо нізка, марудна садзілася ў далечыні за шырокую хмару над лесам, — у такую пару, ведала яна, служачыя ў мястэчку разыходзіліся з устаноў і займаліся сваімі справамі. Праўда, яна спахапілася, што нічога не ўзяла з сабой, усё ж трэба б прынесці які-небудзь гасцінец ды і бутэльку таксама. Але за ёю не прападзе, няхай толькі паможа.

Ён быў дома, яна адразу сцяміла гэта, як толькі збочыла з вуліцы ў вузенькі, абсаджаны вішаннікам завулак да яго ладнай з трысценкам дамоўкі. З двух расчыненых вокнаў неслася гучная музыка, і за радам вазонаў на падаконніку варушылася нейчае мужчынскае з пагонам плячо.

Яна яшчэ раз паправіла на галаве хусцінку, скарэлымі ад заўсягдашніх мазалёў рукамі крадком выцерла вочы і, як мага цішэй, узышла на ганак. Дзверы ў хату былі расчынены, ён сядзеў на ўслоне і адразу павярнуў да яе насаты голены твар, на якім перш-наперш адзначылася здзіўленне.

— Што табе, цётка?

Тое, што ён назваў яе звыкла па-вясковаму цёткай, надало ёй смеласці, пад ягоным строгім, нібыта нават зласнаватым позіркам яна ступіла па засцілцы ад парога і сказала:

— Прыйшла да цябе, Пятровіч, па дзелу.

Патэфон на канцы стала змоўк, хтось павярнуў у ім блішчасты рычаг, і некалькі мужчын з насцярожанаю ўвагай уставіліся ў яе. Яна крыху збянтэжылася пад гэтымі поглядамі і не ведала, як ёй вытлумачыць сваю такую, здавалася, простую і зразумелую патрэбу. Недзе ў адчуванні яе на імгненне варухнулася прыкрасць, нават шкадаванне, што прыйшла сюды, але якога іншага выхаду на запас у яе не было.

— Ды я каб параіцца. Сыны ў мяне...

— Што сыны? Гавары канкрэтна.

Яна пакутліва шукала словы, каб як мага карацей і зразумела растлумачыць ім, што яе прывяло сюды.

— Ну гавары, гавары, не бойся. Тут усе свае.

— Сыны ў мяне... Нядобрае ўдумалі.

— Што, з бандытамі знюхаліся?

Яны ўсе разам нібыта страпянуліся за сталом, павярнуліся да яе, а Дрозд рашуча ўскочыў — рослы цяжкі мужчына ў спадняй блакітнай майцы — і дошкі ў падлозе хістка зазыбаліся пад ім.

— Ну, гавары!

Яна, выразна разумеючы, што павінна адважыцца на самае галоўнае, дзеля чаго гатова была на ўсё, амаль узмалілася:

— Пятровіч, родненькі, толькі ж прашу, не зрабі ж ім благога. Ну, можа, напалохай іх, не карай толькі. Маладыя ж яшчэ, блазнота зусім, старэйшаму васемнаццаты пайшоў са ўздвіжання. Хіба ж яны разумеюць...

— Ага! Так-так. Ну ясна. Дзе яны цяпер?

— Дома. Я ж заперла іх.

— Заперла? Маладзец, цётка. Хадзем!

Ён таропка нацягнуў на сябе свой паліцэйскі мундзір, сарваў са сцяны вінтоўку. Іншыя таксама вылезлі з-за стала, і ў хаце адразу зрабілася цесна. Яна адступіла, у сярэдзіне ў яе нешта здрыганулася і апала, і пакуль Дрозд падпярэзваўся тоўстай вайсковай дзягай, яна, сашчапіўшы на грудзях рукі, прасіла:

— Пятровіч, сынок, толькі ж вы па-добраму каб...

— Мы па-добраму! Культурна! Барсук, прыхапі канец.

Яны выйшлі на двор і, каб было бліжэй, хутка пусціліся па мяжы ў поле. Сонца ўжо схавалася за хмарай, па-вясноваму голае шэрае поле тужліва азмрочылася, але яшчэ было відно і ціха.

Тут, на волі, яна лепш разгледзела іх. Апроч Дразда, яшчэ двое былі ў нямецкіх мундзірах і пілотках, а адзін, задні, у сваім — пінжаку і шэрых картовых штанах навыпуск. Гэты, у штацкім, здалося, быў ёй знаёмы, і яна, забегшы трохі наперад, спытала:

— Гляджу гэта і пазнаю нібыта. Ці не з Залесся будзеце?

— З Залесся, матка, — проста адказаў ён басам, але размовы не падтрымаў. Яна прыгледзелася да астатніх двух крутых стрыжаных патыліц, але гэтыя, бадай, былі чужыя.

Так яны перайшлі пагорак, клін сенажаці, мінулі лазовыя зараснікі ля ручая. Каля балотца-выгарыны калупаўся з плугам кульгавы Пракапчук, селянін з іх вёскі, ён прыпыніў каня і доўга глядзеў здаля на жанчыну і чатырох паліцаяў з вінтоўкамі. Яна нічога не сказала яму, нават не азвалася і прайшла міма, але зараз жа ёй стала ніякавата ад гэтай насцярожанасці знаёмага чалавека. Праўда, яна тут жа перасіліла ў сабе гэта непрыемнае страхавітае адчуванне. Хай, хай папалохаюць, не

заб'юць жа, бо немцам яны благога яшчэ не зрабілі, завошта ж караць іх?

Яна ўвесь час бегла ззаду, у полі і на выгане, і толькі калі зайшлі на падворак, ля калодзежа Дрозд прапусціў яе ўперад і нават лёгенька штурхануў, маўляў, ідзі, а мы следам. Яна звыкла і рухава, як і заўжды, прыступіла на шырокі пляскаты камень, затым на парог і ў той жа час зразумела, што падпорка яе не ўтрымала, каромысла валялася ў доле, і дзверы ў хату былі расчынены. Аднак зараз жа яна згледзела Сёмку, і яе ўразіў выраз сполаху, бадай-што, жаху, на яго яшчэ вельмі дзіцячым твары. Нагнуўшыся, сын стаяў над кубёлкам, у якім яны хавалі мясное, з кавалкам сала ў руцэ. Каля ног хлопца ляжала торбачка з завязкамі, згледзеўшы якую, яна ўсё зразумела і коратка зларадна сабе ўсміхнулася. Але ў той жа час Сёмка крыкнуў, выпусціў сала і, угнуўшы галаў, кінуўся ў дзверы, на бягу моцна штурхануўшы яе ў бок. Ззаду закрычалі — Дрозд або хто іншы, і ў той жа момант аглушальна грымнуў адзін, другі, трэці стрэлы. У ёй усё абвяла, абмякла, яна пахіснулася, але стрымала сябе і, адчуўшы, як нешта крута збочыла да недарэчна і непатрэбна страшнага, выбегла з сенцаў.

— Сыночак! Сыночак! Пастой!

Яна кінулася да паліцая ў шэрай нямецкай пілотцы, які стаяў з карабінам каля паркана, хоць ужо не страляў. Ён апусціў карабін долу, вылаяўся, груба адштурхнуў яе і палез цераз перакладзіну ў гарод. Яна не разумела яго, як не разумела нічога з таго, што тут адбываецца. Сёмкі нідзе не было, і толькі калі паліцай шырока пакрочыў наўкось па забаранаваным гародзе, яна ўбачыла сынаву галаву, плечы і раскіданыя ў бакі рукі — ён нерухома ляжаў на глеі ў трох кроках ад буйна квітнеўшага на ўзмежку вішанніку.

Тады яна закрычала і рухнула на прапахлы ўсімі дваровымі пахамі дол, усведамленне велізарнай несправядлівасці збіла яе з панталыку, яна ўжо не магла сцяміць, як здарылася такое. Яна білася галавой аб цвёрдую, як бетон, утаптаную зямлю падворка, біла яе сваімі не па-жаночы вялікімі кулакамі, зайшоўшыся ў амаль здзічэлай, шалёнай роспачы ад такой непапраўнай бяды. З гэтага стану яе вырваў знаёмы і ў той жа час зусім нейкі інакшы голас яе старэйшага сына.

— Халуі прадажныя!

Усё яшчэ не ўстаючы з долу, яна ўзняла галаў і праз слёзы ўбачыла, як Дрозд і з ім два паліцаі вывалаклі сына з сенцаў і пачалі груба круціць яго рукі, каб звязаць іх вяроўкай — канцом, што ўзялі ў Дразда.

— Бобікі. Будзе і на вас вяроўка!

— Маўчаць, шчанюк!

Паліцай, які быў у штанах навыпуск, коратка і моцна штурхануў яго каленам у жывот, Алесь хіснуўся, але не ўпаў, і яна, зусім ужо губляючы над сабой уладу, закрычала:

— Сыночак!

Ён, аднак, нават не зірнуў у яе бок, твар яго быў гняўлівы і цвёрды, ён матнуў нагой у бацінку і выцяў паліцая.

— Смерць Гітлеру!

— Ах так, шчанюк!

Дрозд дужа ўдарыў яго прыкладам, і ён упаў, — няўклюдна, са звязанымі рукамі, плячамі на пляскаты ля парога камень. Яна падскочыла да пляменніка і, хапаючы яго за ногі ў брудных нячышчаных ботах, спрабавала спыніць, не даць біць сына. Але гэтыя ногі выцялі і адкінулі яе самую. Яна перавярнулася, захлынуўшыся ад болю ў грудзях.

— Ах так, шчанюк! — сказаў Дрозд. — Да сценкі яго!

Тыя два дужа рванулі сына за звязаныя рукі з долу, размашыста кінулі да патрэсканых бёрнаў сцяны, а Дрозд узняў свой карабін. Яна зноў падхапілася з месца, у гэты раз — ужо да сына, але над галавой яе грымнула, аглушыла. Алесь неяк от дзіўна і жахліва напружыўся, вусны яго скрывіліся і галава бездапаможна ўпала падбародкам на грудзі. Ён споўз спіной па сцяне і ў недарэчна скурчанай позе застыў ля падмурка.

Тады яна зразумела, якую недаравальна жахлівую бяду наклікала на іх і на сябе таксама, ухапіла ля парога першае, што трапіла ёй на вочы — хварасціну, якой выганяла ўранку карову, і з безагляднаю лютасцю накінулася на Дразда.

— Гад, пошасць, забойца! Што ты нарабіў! Ірад, нечалавек!..

Яна мяціла па галаве і па твары паліцая, але той уваб-раў галаву ў плечы, засланіўся локцем, і яна біла яго па гэтым ненавісным з паласатай павязкай локці, па чорнай пілотцы, пакуль Дрозд цяжкім прыкладам не адкінуў яе ад паркана.

— Прэч, гадаўка!

Аглушаная, яна зайшлася ад болю і змоўкла. Паліцай прывалок з гарода распластанае цела Сёмкі, кінуў яго на падворку і, задышліва адкашляўшыся, палез у кішэнь за махоркай.

— А здорава ты яго — пад дых! —ваўкавата пахваліў яго Дрозд. Паліцай злосна вылаяўся:

— А што ж! Не ведаў, ад каго. Ад мяне не ўцячэ!

Маці курчылася на маладой мураўцы, усё бачыла, але бадай нічога не заўважала і ні на што не рэагавала. Потым, калі трохі пацішэў балючы звон у галаве, паднялася,

спачатку на калені, затым на свае босыя, скарэлыя ногі, акінула няўцямным, здзічэлым позіркам двор з нерухомымі целамі яе сыноў. У яе ўжо вельмі нямнога засталося сілы, яна трымалася за паркан і так, перабіраючы рукамі, знясілена пайшла па-над ім да вуліцы. Паліцаі яе не спынялі і не крычалі, ды яна і не прыслухоўвалася ўжо ні да чаго ў гэтым свеце, страх яе сканаў увесь без рэшты. Яна дабрыла да калодзежа, упала, жыватом на край яго прысадзістага аслізлага зруба і, убачыўшы ў ягонай глыбіні далёкі пробліск святла, нібы за нявыкананай справядлівасцю таропка рынулася ў змрочную зыбкую пройму.

1. Падзяліцеся сваімі ўражаннямі ад твора.

2. Якімі вы ўяўляеце Алеся і Сёмку? Прасачыце, што гаворыць пісьменнік пра кожнага з хлопцаў. Чаму, на вашу думку, аўтар так скупа апісвае іх?

3. Якой паказана маці ў творы? Што вы можаце сказаць пра яе адносіны да сваіх сыноў? Што падштурхнула маці звярнуцца па дапамогу да пляменніка Дразда? Прасачыце за ходам разважанняў старой жанчыны, за яе адчуваннямі, перажываннямі, сумненнямі пры сустрэчы з паліцаямі.

4. Якімі аўтар паказвае паліцаяў? Дайце характарыстыку Дразду. Падмацуйце свой аповед радкамі з тэксту.

5. Перачытайце эпізод, калі маці прывяла ў хату Дразда з хаўруснікам. Пракаменціруйце, як трымалі сябе пры гэтым хлопцы?

6. Як вы думаеце, чаму так жахліва памылілася маці ў сваім жаданні дапамагчы сынам?

7. Як ставіцца аўтар да сваіх герояў? Абгрунтуйце свае меркаванні.

8. Вызначце ідэйны змест твора. Як ён увасоблены ў загалоўку?

## Пра кампазіцыю

Майстэрства пісьменніка праяўляецца не толькі ў выбары жыццёва значнай тэмы, але і ў расстаноўцы галоўных і другарадных персанажаў, у тым, у якой паслядоўнасці будуць апісвацца падзеі, учынкі герояў, іх разважанні і перажыванні і г. д. Вы ўжо ведаеце, што сюжэт — гэта падзейны бок твора. Ён не ахоплівае ўвесь тэкст, звычайна ў ім ёсць і <u>пазасюжэтныя</u> элементы: *апісанні* (пейзаж, партрэт, душэўныя перажыванні герояў), *чысты аповед* (звесткі пра тое, дзе і калі адбываецца дзеянне), *аўтарскія разважанні*. Мастацкі твор — непадзельнае цэлае, усе яго часткі (эпізоды, сцэны, апісанні, дыялогі, маналогі, аўтарскія адступленні) размешчаны ў пэўным парадку. Уся складаная будова твора, размяшчэнне і спалучэнне ўсіх яго частак, раздзелаў, эпізодаў, сцэн называецца *кампазіцыяй*.

Кампазіцыю твора пісьменнік выбірае ў залежнасці ад сваёй задумы. Падзеі часта падаюцца ў такой паслядоўнасці, як яны маглі б адбывацца ў жыцці. Але часам пісьменнік свядома «парушае» звыклы парадак падзей і пачынае твор, як кажуць, «з канца» ці з самага напружанага моманту, часам нават з апісанняў або аўтарскіх адступленняў.

Прааналізуем, як будуе сваё апавяданне «Сваякі» Васіль Быкаў. Пачынаецца твор адразу з дыялога (размовы) маці з сынамі Алесем і Сёмкам. Чысты аповед пра час і месца дзеяння адсутнічае, хоць з кантэксту зразумела, што падзеі адбываюцца ў час вайны. Далей ідзе апісанне душэўнага стану маці, яго змяняе маналог-разважанне старой жанчыны пра недарэчнасць, непатрэбнасць таго, што задумалі хлопцы, — на яе думку, «па-дурному загінуць». Маці пачынае пакутліва шукаць выйсця і, як ёй здаецца, знаходзіць яго, вырашыўшы, што «хутчэй сама ляжа трупам на гэтым іх вар’яцкім шляху,

але засцеражэ іх ад смерці». І жанчына бяжыць да Дразда, дваюраднага пляменніка. Аўтарскі аповед, які перарываецца эпізодам прыходу маці ў хату Дразда — іх размовай, просьбай старой, зборам паліцаяў у дарогу, — працягваецца аж да прыходу паліцаяў у сялянскую хату. І нарэшце — апісанне жахлівых душэўных і фізічных пакут маці, яе нялюдскай, недаравальнай смерці па віне паліцаяў.

Кампазіцыя мастацкага твора залежыць ад задумы аўтара і абумоўлена тым, пра што ён збіраецца расказаць (жыццёвым матэрыялам), да якіх высноў падвесці чытача, да якіх разважанняў падштурхнуць.

Кампазіцыя таксама залежыць ад жанру (віду, формы) літаратурнага твора. Больш простую кампазіцыю маюць верш, апавяданне. Суадносіны паміж часткамі, эпізодамі, сцэнамі, элементамі больш складаныя ў аповесці, дзе шмат падзей, герояў, дзеянне расцягнутае ў часе, месца дзеяння неаднаразова змяняецца, а сам твор мае большы аб’ём.

1. У чым праяўляецца майстэрства пісьменніка?

2. Што такое кампазіцыя літаратурнага твора? Ад чаго яна залежыць?

3. Прыгадайце адзін з прачытаных твораў і прааналізуйце яго кампазіцыю.

***Васіль Вітка***

## Трывога ў Ельнічах

Бываюць от жа ж рызыканты. З такім гаварыць — што на вей-вецер.

Якраз пра гэтакага джыгуна расказалі мне сёлета ў Ельнічах, адкуль я родам.

Яўстрата Скачыляса, чалавека ціхманага, мала хто калі ўдзень і бачыць. Мужчына немаладога веку, ён працуе ўжо каторы год калгасным вартаўніком. Нават у цёплыя летнія ночы Яўстрат надзявае кажух і зімовую шапку, адно вуха якой звісае на каўнер, а другое вытыркае наперад, быццам насцярожана ўслухоўваецца ў цішыню, і са стрэльбаю на рамяні прыцемкам выходзіць з хаты. Хоць і негаваркі чалавек, а пачуўшы гурт, ён заўсёды падыдзе, пастаіць, паслухае, а то, бывала, і слова ўставіць і знікне ў цемры гэтак жа непрыкметна, як і паявіўся.

Пра Яўстрата ў Ельнічах ніхто слова благога не скажа. І пра самога, і пра трох яго сыноў. Праўда, толькі пра трох, бо чацвёрты, самы меншы, Юзік — такі ж крутасвет, што проста дзіва, у каго ён і ўдаўся. Можа, таму, што меншых заўсёды болей песцяць і пялегуюць, Юзік з самага малку ўзяў над усімі такую патолю, што нікога не прызнаваў.

Колькі там было таго Юзіка, а як пайшоў у школу, дык дзецям жыцця не стала ад яго. То грымакоў у плечы надае, то выхапіць з чужога партфеля кніжку і пашматае, то якога кепства ў школе наробіць. Ну, проста вока не спускай з гэтага вісуса! І ні просьбы, ні грозьбы не памагаюць. Пачаў настаўнік бацьку скардзіцца, а Яўстрат усё далікаціцца. Колькі разоў хадзіў перапрошваць за сына, а ўшчуваць шкадаваў, абыходзіўся гаворкаю. А той нібыта і слухае, а выскачыў за парог — і зноў за сваё.

Немаведама, дакуль бы гэта ішлося, каб не здарэнне, якое ўзрушыла ўсю вёску.

Дзяцей якраз адпусцілі на лета. Пачыналася самая радасная пара, калі ўсё наўкола аж кіпіць жыццём. Дрэвы так раскупчасціліся атожылкамі з шырокімі лапушнымі лістамі, што цяжка было знізу разгледзець, што робіцца на верхавіне. А якраз на верхавіне таполі, што расла це-

раз вуліцу, напроці Яўстратавай хаты, адбываліся важныя падзеі.

Яшчэ напрадвесні Яўстратаў сусед Адам Патрубейка з сынам Толікам усцягнулі на таполю старое кола. Вельмі ж Толіку хацелася, каб на таполі пасяліліся буслы. І яны не падвялі хлопца. Прыляцелі, зрабілі сабе дамоўку і атайбаваліся жыць. Даверлівыя да людзей, яны кружылі зусім нізка над хатай, а часам спускаліся і на падворак. З вуліцы можна было бачыць, як спаважна яны пахаджаюць сабе між курэй, скоса пазіраючы на задзірыстага рыжага пеўня, які чамусьці не любіў буслінага панібрацтва.

Калі разумныя, добрыя навасельцы рабілі гняздо, калі выседжвалі малых, а потым, занятыя клопатам з ранку да позняга змяркання, нястомна насілі ім спажыву — у тыя дні якраз паміж Толікам і Юзікам пачалося сяброўства. На першы погляд, гэта было неспадзяванкай, бо яшчэ зусім нядаўна Юзік хапаўся з Толем загрудкі. Не раз качаліся яны на пераменках сярод школьнага дзядзінца і ўваходзілі пасля званка ў клас з павырыванымі гузікамі, а то і з расквашанымі насамі. І от жа цяпер яны не маглі ўжо адзін без аднаго і дня перабыць. А здружылі іх буслы. Хлопцы вельмі ж упадабалі цікавых і дасціпных птушак і дзень у дзень наглядалі за імі.

Спярша, калі птушаняты былі яшчэ малыя, бусел з бусліхай па адным вылятлі з дому, а як дзеці падраслі, адлучаліся ўжо разам і то ледзьве ўпраўляліся, каб удосталь накарміць сямейку.

Хлопцы аж заліваліся ад смеху, як чацвёра цыбатых буслянят прабавалі станавіцца на край гнязда і, спалохаўшыся высачыні, туліліся да маці. А тая сярдзіта клекатала, відаць, сварылася на маладых гарэзнікаў.

Аднаго разу Юзік сказаў:

— Ведаеш, Толік, давай узлезем на гняздо і возьмем па бусляняці: я — сабе, і ты.

Толік не згадзіўся.

— Што ты! Яны ж з голаду памруць.

— А мы будзем іх карміць.

— Як гэта ты будзеш карміць? — пачаў рагатаць Толік. — Хіба будзеш на балоце жаб лавіць ды ім насіць?

Юзік не мог трываць, калі хто з яго смяяўся. Тады ён нахмурваў бровы і адно кідаў злосныя позіркі.

— Ведаю, чаму ты не хочаш!.. — ускіпеў ён. — Ты думаеш, што гэта твае буслы? Твае, га?.. А я от вазьму і скіну к чорту ўсё гэтае кола!.. — і Юзік, ухапіўшыся аберуч за ніжні сук, спрытна падцягнуўся і палез па шурпатым камлі ўгару.

— Не дам! — закрычаў Толік.

Ён падбег і з усяе сілы тузануў Юзіка за кашулю. Той шарганууся тварам аб кару і аб'ехаў уніз. Усхапіўшыся на ногі і адчуўшы, як балюча шчыміць падрапаны твар, Юзік гатоў быў рынуцца з кулакамі на свайго нядаўняга сябра. Але Толік паспеў ужо ўскочыць у сенцы. Юзік пачуў, як бразнула клямка, а перад самым яго носам шчоўкнула і засаўка.

— Папомніш ты мяне, Патрубейчык! — памахаў кулаком перад дзвярыма раз'ятраны Юзік.

— Юзік — адарваны гузік! — смела абазваўся з-за дзвярэй Толік і палез на вышкі. А там, стаўшы ля круглага акенца, якое з-пад лабка выходзіла на вуліцу, пачаў цікаваць, што ж будзе рабіць Юзік.

Чакаць доўга не прыйшлося. З Патрубейкавага двара Юзік кінуўся ў свой. З малога акенца Толю добра было відно, як ён ускочыў у свае сенцы і, не бавячыся там, выбег назад. У руках у Юзіка была стрэльба. Не самаробная, не выструганая з палена, з якімі яны яшчэ нядаўна гулялі

ў партызаны, а сапраўдная, тая, з якой Яўстрат Скачыляс хадзіў на начную варту.

Толік ад нечаканасці аж сумеўся: што ён надумаў, гэты шаленец? А Юзік выйшаў з варот, стаў, падняў стрэльбу і навёў яе... Куды б вы думалі? У самы лабок Патрубейкавай хаты, у самае акенца, за якім стаіўся Толік.

— А-а-а! — немым голасам закрычаў Толік і кінуўся з вышак у хату. — Татачка, міленькі! Юзік хоча мяне застрэліць! — ледзь паспеў вымавіць ён.

І ў гэты час грымнуў стрэл. Пачуўся спалоханы крык Яўстрацíхі, Юзікавай маці:

— А за што ж ты яго, Юзічак? А ці ж табе ён замінаў? А ці ён табе свет заступіў? Гэта ж такое няшчасце на маю галаву-у-у!..

Толеў бацька, не цямячы, што здарылася, здзіўлена ўтаропіўся ў сына. А Толік, з палёгкай уздыхнуўшы, весела закрычаў:

— Ён у мяне не пацэліў! — і кінуўся з хаты на двор. — Ён мяне не забіў, цётка Настуля! — крыкнуў Толік Юзікавай маці і ў гэтую ж хвіліну ўбачыў самога Юзіка. Той, увесь спалатнелы, з апушчанай галавой, стаяў каля свайго агародчыка. Стрэльба ляжала каля яго ног. Толіку так шкада зрабілася свайго сябра, што ён не вытрымаў.

— Юзік... — ціха паклікаў ён.

Юзік нават не паварушыўся.

— А-а, дык ты яшчэ шкадуеш гада такога! — пачуў Толік дакор сваёй другой суседкі і толькі цяпер убачыў, што каля вулічных акон іх хаты сабраўся цэлы натоўп. Паміж людскіх галасоў Толік чуў устрывожаныя пытанні і гнеўныя адказы:

— Хто гэта яго?

— Яўстратаў, хто ж яшчэ можа.

— А родненькія мае! І як у яго рука паднялася?

— У яго спытай. Бачыш, вунь стаіць каля падваротні і зыркае спадылба, як ваўчаня...

Услухоўваючыся ў людскую гаману, Толік яшчэ раз паглядзеў на Юзіка. Сэрца яго сціснулася ад жалю. Ён ніяк не мог уцяміць, чаму людзі з такім гневам гавораць пра хлопца. «Ну, можа, у злосці ён і падумаў быў, каб забіць мяне. Але ж як ён, небарака, цяпер мучыцца, як ён перажывае...»

І Толік павярнуўся да натоўпу. Ён хацеў закрычаць людзям: «Глядзіце, вось жа я! Жывы!», але словы так і захлынуліся ў горле. Тое, што ён убачыў у гэтую кароткую хвіліну, было самым страшным. Страшнейшым за тое, што ён думаў.

Людзі расступіліся. Пасярод вуліцы ляжаў бусел. Падкурчыўшы пад сябе пасінелыя ногі і выцягнуўшы доўгую дзюбу, ён шырока распластаў свае крылы, быццам намагаўся яшчэ падняцца. Але падняцца не мог. Ён быў мёртвы.

Толік адчуў, як хістанулася вуліца. Вялізныя цёмныя абручы паплылі перад ім. Каб не ўпасці, ён стуліўся ўвесь і здаўся сабе зусім маленькім і бездапаможным. Але з усяго цяжару, які зваліўся на яго, Толік выразна адчуў толькі, што ў гэты спякотны дзень раптам зрабілася холадна, як зімой.

Ён не памятаў, як бацька завёў яго ў хату, не чуў, як гаварылі, што Юзік, выскачыўшы са стрэльбаю, сам яшчэ не ведаў, што будзе рабіць. Ён ірваўся адпомсціць сябру. І, убачыўшы бусла, які ляцеў над самай хатай Патрубейкавых, злажыўся і ўсадзіў у яго цэлы набой шроту.

Вуліца гула, як устрывожаны вулей. Калгаснікі сарамацілі і дакаралі Яўстрата і Настусю Скачылясаў, а каторыя дык адкрыта казалі, што такому шыбеніку, як іх сын, не можа быць месца ў Ельнічах, што ад такога якой заўгодна бяды можна дачакацца. І каб Юзік не ўцёк, то невядома, як бы ўся гэта гаворка і павярнулася.

За сваімі трывогамі людзі і не заўважылі, якая трывога ахапіла чыстае летняе неба. Над вуліцаю, над старою таполяю Патрубейкавых у адчаі і роспачы клекатала ўжо не адна асірацелая бусліха, а цэлая чарада буслоў, што дазналіся пра няшчасце. Малыя бусляняты стаялі галодныя ў гняздзе і палахліва туліліся адно да аднаго. Растрывожаныя буслы лёталі ўжо траха не над самымі галовамі людзей. Пэўна, з усіх паселішчаў, з усіх вёсак зляталіся яны сюды. І як толькі людзі разышліся, буслы адразу ж апусціліся на вуліцу. Яны абступілі нябожчыка, і доўга не сціхаў іх журботны клёкат.

Людзі, прыпаўшы да шыбаў, глядзелі на вуліцу. Патрубейчыха, пад вокнамі якой адбывалася гэтае сумнае развітанне, не вытрывала, выбегла і загаласіла:

— А людцы, а суседзейкі, а нешта ж трэба рабіць...

Яўстрат Скачыляс выйшаў са свайго двара з рыдлёўкаю. А за ім на тым жа часе высыпалі з хат старыя і малыя. Буслы залапаталі крыламі, падняліся і зноў пачалі кружыць у паветры.

Скачыляс падышоў да забітае птушкі, уткнуў рыдлёўку ў задзірванелую вулічную абочыну і стаў капаць яму. Усе бачылі, што маўклівы Яўстрат пакутліва перажывае няшчасце і невыказную крыўду на сына. І гатоў быў хоць гэтым цяжкім абавязкам павініцца перад людзьмі і перад горкім сумленнем.

— А Яўстратачка ж ты мой! — пляснула рукамі Патрубейчыха. — А што ж ты надумаў... А не па-суседску ж ты, галубок, робіш...

Скачыляс кінуў капаць. Ён не разумеў, чым яшчэ мог пакрыўдзіць суседку.

— Гэта ж на век вечны перад самымі вокнамі такі цяжкі дакор будзе. А за што? Хіба ж мы вінаватыя? — заплакала Патрубейчыха.

І ўсе згадзіліся: сапраўды, гэта было б чорнай несправядлівасцю.

Яўстрат пастаяў, падумаў, абвёў вачыма натоўп, нагнуўся над буслам, падняў яго, прыхапіў рыдлёўку і выправіўся ў самы канец свайго агарода. Людзі цераз Скачылясаў двор рушылі ўслед за гаспадаром. Каля густога вішняку, дзе толькі што пачыналі на пробу капаць маладую бульбу, Яўстрат пахаваў бусла. Доўга маркотныя, прыціхлыя птушкі снаўдаліся на Яўстратавым агародзе, не баючыся людзей, і ў роспачы лапамі граблі свежае бульбянішча.

Надвечар з гнязда скінулася двое буслянят. Яны яшчэ не паспелі ўвабрацца ў пер'е. Цяжка было сказаць, ці то не вытрымалі яны вялікага гора, ці то змарыліся за цэлы дзень з голаду. Хутчэй за ўсё бусліха, ведаючы, што цяпер адна не выкарміць сям'і, сама асудзіла іх на пагібель. Але бусляняты былі жывыя. Калі Толік, узрушаны гэтым новым няшчасцем, унёс малых у хату і накарміў пшоннаю кашай, а потым пасадзіў у запечку і накрыў кажушком, яны павесялелі і дзюбкамі пачалі скубці яго за рукавы...

Пасярод ночы, калі ў Патрубейкавых спалі, у акно пастукалася Юзікава маці.

— Толік! — трывожна паклікала яна.

Толік усхапіўся з ложка і выбег на двор.

— А мой жа ты Толічак, мой залаценькі. Няма ж нашага Юзічка, і не ведаем, дзе шукаць. Бацька з ног збіўся...

І хоць на вуліцы было не так і цёмна, Толік вярнуўся ў хату і запаліў ліхтар «лятучая мыш». А Яўстраціха, як апантаная, зноў кінулася да сваёй хаты. Не знаходзячы прыстанку, яна тупала босымі нагамі вакол круглага каменя, што ляжаў ля сенечных дзвярэй, і, плачучы, прычытвала сама сабе.

— А як жа ж таго дня дачакацца... А я ж ужо ўсіх сваіх абабегала... А хлопчык жа ты мой, а любенечкі, — за-

плакала яна яшчэ галасней, убачыўшы Толіка з ліхтаром. — А каб жа ён хаця чаго не надумаў... А прабягу ж я яшчэ па людзях, а мо што пачую... — і вуліцаю падалася ў цемру ночы.

Толік завярнуў у Яўстратаў двор. Не на жарт устрывожаны, куды мог знікнуць Юзік, ён успомніў, з якім вінаватым выглядам стаяў яго бяздумны сябрук удзень перад людзьмі. Абавязак сяброўства, няхай сабе нялёгкага і крыўднага, вымушаў Толіка зараз жа, не бавячыся ні хвіліны, ісці на гэтыя начныя пошукі.

Перш за ўсё Толік палез на гарышча Яўстратавай хаты. Каля акенца ў лабку ён пераканаўся, што Юзік доўга стаяў тут. Абярэмак леташняй саломы быў нашчэнт перацёрты нагамі. Значыць, Юзік да самых прыцемкаў чуў і бачыў адгэтуль усё, што адбывалася на вуліцы і двары.

Спусціўшыся па лесках з вышак і высвечваючы перад сабою ліхтаром дарогу, Толік выйшаў на падворак. У палахлівай нерашучасці ён спыніўся ля калодзежа, пастаяў можа з хвіліну, потым, так і не зазірнуўшы ў яго цёмную прорву, адкінуў лёгкія плеценыя веснічкі і разораю падаўся ў канец агарода. Збіваючы каленамі халодную расу з бульбяніку, ён неўзабаве дайшоў да таго места, дзе Яўстрат пахаваў бусла.

Зыркі круг ліхтара ўпаў на невялікі прагалак каля вішняку. Так, Юзік быў тут. Угнуўшы плечы, ён сядзеў на вытаптаным, учарнелым грудку, а непадалёк ад яго ў разоры на адной назе стаяла бусліха. З высокага бульбяніку выткнулася яе галава. І Толік убачыў, як ад рэзкага святла бусліха на момант заплюшчыла вочы і адразу ж зноў адкрыла іх — самотныя і дакорлівыя.

Юзік не паварухнуўся. Нахіліўшыся з ліхтаром, Толік убачыў, што хлопец як бы застыў у зняменні. А можа, ён

спаў? Праўда, Толік яшчэ ніколі не бачыў, каб спалі з адкрытымі вачыма. Гэта была тая цяжкая гадзіна ў жыцці яго сябра, калі ён упершыню сам заглянуў у сваю яшчэ незразумелую, збітую з тропу душу, якая цяпер ужо не магла так лёгка супакоіцца і бесклапотна знябыцца.

Толік крануў сябра за плячо. Юзік маўчаў. Тады Толік схапіў яго за локаць і з усяе сілы пацягнуў за сабою.

Юзік падняўся. Як малое дзіця, што толькі-толькі намагаецца рабіць першыя крокі, няўпэўнена пераастаўляючы ногі, ён пайшоў за Толікам. Так ішлі яны моўчкі адзін за адным разораю, потым дваром аж да самае хаты Скачылясаў. Ля сенечнага парога Юзік ледзь чутна вымавіў:

— Што ж цяпер будзе, Толік?

— Не ведаю.

Яны абодва змоўклі і доўга не абзываліся. Потым Толік падняў шкляны каўпак ліхтара і патушыў святло. З вішнёвага зарасніку выбіваўся ранні досвітак.

— Так яна там і прастаяла ўсю ноч?

— Усю ноч, — вінавата ўнурыўся Юзік.

— А двое малых сядзяць у мяне ў запечку. Упалі з гнязда, — сказаў Толік. — Прыйдзецца гадаваць.

— Прыйдзецца, — згадзіўся Юзік.

1. Падзяліцеся сваімі ўражаннямі ад твора.

2. Раскажыце пра сяброўства Юзіка і Толіка. Якімі вы ўяўляеце хлопцаў? Што гаворыць пісьменнік пра кожнага з іх?

3. Ахарактарызуйце паводзіны Юзіка. Што сталася сапраўднай прычынай яго жорсткасці? Як паставіліся бацькі хлопчыка да ўчынку сына?

4. Дайце падрабязную характарыстыку сябрам — Юзіку і Толіку.

5. Падрыхтуйце творчы пераказ апавядання — ад імя аднаго з хлопчыкаў-герояў (на выбар).

## Мастацкае расказванне

Усім вядома, што даўней легенды і казкі бытавалі ў вусным выглядзе: нашы продкі слухалі адно аднаго, запаміналі і перадавалі іншым. Дзякуючы таленавітым расказчыкам, людзям з народа, і руплівым збіральнікам фальклору ў XIX—XX стагоддзях — даследчыкам, навукоўцам, пісьменнікам — мы сёння захапляемся і ганарымся вуснай народнай творчасцю беларусаў.

Валодае майстэрствам, талентам расказчыка не кожны чалавек. Для гэтага патрэбны пэўныя здольнасці і найперш жаданне навучыцца выказваць свае думкі. Бо, каб захапіць слухачоў і дамагчыся іх увагі, неабходна не проста распавесці пра які выпадак або здарэнне, а расказаць пра яго цікава, эмацыянальна, па-мастацку. Пераказаць легенду або прачытаны твор пажадана так, быццам апавядальнік сам быў сведкам тых падзей, пра якія ідзе гаворка. Варта пастарацца, каб тое, пра што вы будзеце гаварыць, зацікавіла слухачоў, усхвалявала іх, прымусіла слухаць. Расказванне — своеасаблівы тэатр аднаго акцёра, дзе вядучая роля належыць слову, яго вобразнасці і сэнсавай напоўненасці, а таксама эмацыянальнасці і інтанацыйнай выразнасці маўлення апавядальніка.

Навучанне мастацкаму расказванню пачынаецца з дзяцінства, са школы. Спачатку неабходна ўважліва прачытаць твор або праслухаць яго ў выкананні іншых (ці падрабязна прадумаць, калі збіраецеся распавесці пра нешта сваё), асэнсаваць, падзяліць на часткі, вылучыць пачатак, момант найвышэйшага напружання, заключэнне. Да кожнай з акрэсленых частак падабраць назвы, якія могуць стаць планам выказвання. Потым папрактыкавацца расказаць кожную частку паасобку, нешта падправіць, да-

даць цікавыя дэталі ці падрабязнасці, прадумаць сэнсавыя акцэнты, выбраць інтанацыю. Пасля такой падрыхтоўкі можна прыступаць да расказвання. І слухачы аддзячаць вам увагай і захапленнем.

1. Што такое мастацкае расказванне?
2. Якімі якасцямі і здольнасцямі павінен валодаць расказчык?
3. Як, на вашу думку, можна авалодаць майстэрствам мастацкага расказвання? З чаго трэба пачынаць гэту працу? Што для гэтага неабходна?
4. Прыгадайце цікавае здарэнне, што адбылося з героем нядаўна прачытанага вамі твора, і падрыхтуйце пра гэта невялікую вусную замалёўку.

### Кантрольныя пытанні і заданні

1. Узгадайце творы, змешчаныя ў гэтым раздзеле. Які з іх вас найбольш захапіў? Растлумачце свой выбар.
2. Прыгадайце апавядальны твор, які вы нядаўна прачыталі самастойна. Якой тэме ён прысвечаны? Хто яго аўтар? Вызначце ў ім выразныя прыкметы жанру апавядання.
3. Паспрабуйце вусна скласці невялікае апавяданне пра падзею, якая вас вельмі ўразіла, усхвалявала, запомнілася вам.

## VII. Слова ўражвае…

***Уладзімір Шыцік***

### Настаўнік

Школа стаяла на высокім пясчаным беразе вялікага возера. А вакол шумеў прыгожы парк. Ліпы, клёны, ясені былі акуратна падстрыжаны. Садоўнік казаў, што менаві-

та ў гэтым і ёсць прыгажосць. А я, калі глядзеў на пасыпаныя жоўтым пяском сцежкі і яркія, як агонь, клумбы, успамінаў карціну, што вісела ў школьным вестыбюлі. Прыгожая, яна ўсё ж ніколі ні ў каго не выклікала жадання пабываць на той палянцы, што раптам адкрылася сярод лесу, ці акунуць руку ў серабрысты крынічны ручаёк.

Карціна ёсць карціна, у ёй не хапае жыцця, а можа, проста руху. Так і з паркам. У сваёй падстрыжанай прыгажосці ён страціў галоўнае. Нам чамусьці больш падабаўся востраў на возеры. Лес там захаваўся ў сваім першабытным выглядзе. Кусты былі густыя, як зараснікі ў джунглях. Непрыбраныя вываратні нагадвалі ў паўзмроку сілуэты нейкіх дагістарычных жывёлін.

Кожны клас меў на востраве свой улюбёны куток. Там збіраліся, гулялі, марылі, спрачаліся. Нашым месцам была абкружаная густым арэшнікам палянка, пасярэдзіне якой расла серабрыстая таполя. Яна была вельмі старая, бо, нават пабраўшыся за рукі ўпяцёх, мы ледзь маглі абхапіць яе ствол. Метры за два ад зямлі ва ўсе бакі адыходзілі тоўстыя галіны. Мы любілі сядзець тут надвячоркам, схаваныя змрокам і гушчаром ад усяго свету.

Мы ўяўлялі сябе падарожнікамі, якіх лёс закінуў на невядомую планету. У галінах таполі гудзеў вецер, азёрныя хвалі з шумам набягалі на бераг, а нам было і радасна, і крыху боязна.

Хлопцы з іншых класаў прыходзілі на востраў са сваімі настаўнікамі. Мы ж амаль заўсёды адны. Не таму, што не любілі свайго настаўніка. Ён быў добры, ласкавы. Але часам ён не разумеў або не хацеў разумець нас. Мы, як і ўсе ў нашай школе, трызнілі аб космасе. Выхавацелі астатніх груп расказвалі дзецям пра падарожжы да планет і зорак, вазілі іх на касмадромы, а адпраўляю-

чыся на экскурсіі ў Аўстралію ці на Вогненную Зямлю, абавязкова заказвалі месцы на ракетаплане. Ад нашага ж настаўніка мы чамусьці ніколі не чулі ні слова пра самыя цікавыя палёты. Нават калі ў час аднаго ўрока прыйшло паведамленне, што вяртаецца экспедыцыя з Тау Кіта, ён, як звычайна, не пракаменціраваў навіну. Мы слухалі радыё, а настаўнік адышоўся да акна і, колькі ішла перадача, задуменна глядзеў на пустынны азёрны плёс.

Уся Зямля радавалася, і толькі ён адзін, здавалася, заставаўся абыякавым. Гэта нас здзіўляла і, што казаць, крыўдзіла. Бо мы паважалі і любілі свайго настаўніка. Ён быў уважлівы да кожнага з нас, расказваў многа цікавага. А ведаў ён столькі, колькі, як нам часам думалася, на Зямлі больш не можа ведаць ніхто. Але абыякавасць да космасу мы не маглі дараваць нікому. І ў нас з'явілася ад настаўніка таямніца...

Ці ведаў настаўнік пра яе? Напэўна. Ён разумеў нас лепш за нас саміх. Мы часам забывалі, што яму ўжо недзе пад дзевяноста — такі ён быў выдумшчык і завадатар. Толькі быццам знарок не хацеў заўважаць нашы касмічныя мары і планы. Калі нават на ўроках здаралася праходзіць тэмы, звязаныя з гісторыяй асваення космасу, ён абавязкова кідаў фразу:

— Штурм космасу — не рамантыка, сябры. Гэта цяжка нават дарослым.

— Навошта настаўнік нас палохае? — больш за ўсіх абураўся Сашка Шарай.

Разважлівы Мішка Патупчык супакойваў яго:

— Каб зразумець космас, трэба пабываць у прасторы.

Мы згаджаліся з Мішкам. Адкуль было нашаму настаўніку ведаць, што такое палёт да зорак, калі ён зусім зямны чалавек. Ну хто яшчэ ў наш час, акрамя нашага настаўніка, мог узяць кіёк і пайсці на цэлы дзень у стэп? Ён клікаў і нас

з сабой. Аднаго разу мы было пайшлі. І што ўбачылі? Бясконцае поле, на якім каласілася аксамітная пшаніца, і жаваранкаў у небе. Што тут незвычайнага? Толькі наш настаўнік захапляўся ўсім гэтым. Ён спыняўся на якім-небудзь пагорку, падставіўшы твар сонцу, і слухаў, як шапацела збажына, як аднекуль з сіняй бездані неба лілася жаўруковая песня вясны і цяпла. Твар настаўніка нібы памаладзеў, і на вуснах блукала трапяткая даверлівая ўсмешка. А мы сумавалі. І дадому вярнуліся стомленыя, маўклівыя. Настаўнік паглядзеў на нас з нейкім жалем і, развітваючыся, уздыхнуў.

Неўзабаве надышлі экзамены. Мова і фізіка, літаратура і матэматыка... Настаўнік быў увесь час з намі, дапамагаў нам, і мы зноў здзіўляліся, як ён многа ведае.

А потым быў экзамен па гісторыі. Каб зрабіць настаўніку прыемнае, я вырашыў напісаць пра старажытную Русь, пра гарачыя бойкі нашых продкаў са стэпавымі качэўнікамі. Мне хацелася, каб настаўнік убачыў любы свайму сэрцу шырокі стэп, поўны сонца і прасторы.

Сачыненне, відаць, спадабалася настаўніку. Ён слухаў, заплюшчыўшы вочы, ківаў часам, нібы ў знак згоды, галавой, а калі я скончыў чытаць, ён не стаў, як рабіў гэта часта, дапаўняць. Ён не пахваліў мяне, не ў яго правілах было хваліць чалавека, які выканаў свой абавязак. Ён лічыў гэта натуральным. Ступень сваёй задаволенасці ён выказваў толькі адзнакамі. Мне вышэйшы бал не паставіў. Чаму? Нешта, відаць, было не так. Але трэба прадумаць гэта спачатку самому, што было «не так».

Крыху расчараваны ацэнкай, я не адразу пачуў, аб чым расказвае Сашка. А прыслухаўшыся, абурыўся. Яшчэ загадзя мы дамовіліся не закранаць у сваіх работах таго, што мае дачыненне да касмічных палётаў. І раптам Сашка парушыў дагавор. Навошта гэты выклік настаўніку?

Відаць, пра гэта падумалі і астатнія хлопцы. Бо ў класе ўсталявалася незвычайная цішыня. Я не адрываў позірку ад настаўніка, шукаў на яго твары крыўду, абурэнне ці што-небудзь такое яшчэ. І не знаходзіў. Ён і Сашку слухаў, як нядаўна мяне, — уважліва, засяроджана.

Сашка быў разумны хлопец. Я слухаў і думаў, дзе ён назбіраў столькі звестак? Але самае галоўнае нас чакала, аказваецца, наперадзе. Сашкаў голас раптам зазвінеў, як струна, якая вось-вось парвецца:

— У жыцці было нямала выпадкаў, калі космас пакараўся юным!

Гэта было прыгожа сказана. Але ў мяне асабіста не было ўпэўненасці, што так здаралася на самай справе. Як ні кажыце, а ў космас адпраўляюць толькі дарослых. Бо трэба спачатку школу скончыць, і спецыяльнасць набыць, і падрыхтоўку прайсці. Ці ж мала гадоў на гэта пойдзе? Канечне, і мне і Сашку не хочацца чакаць, пакуль мы вырасцем. Гэта ж калі яшчэ будзе!.. Аднак ёсць на свеце рэчы, якія, на жаль, ад нас не залежаць. І я падумаў, што Сашка дарэмна зрабіў свой выпад.

А Сашка падышоў да настаўнікавага стала і націснуў кнопку. На вокны апусціліся чорныя шторы. У класе на секунду стала цёмна. Мы не паспелі нават крыкнуць Сашку, каб ён не дурэў, як засвяціўся экран. На гэтым экране кожны вучань можа пісаць, чарціць схемы, застаючыся за сваёй партай. Толькі трэба націскаць адпаведныя клавішы.

Я падумаў, што Сашка вернецца зараз да сваёй парты і намалюе нейкую ілюстрацыю да даклада. Але я памыліўся. Сашка мінуў сваю парту і падышоў да праекцыйнага апарата, нешта ўставіў туды, пакруціў, і экран ажыў. Мы ўбачылі рубку касмічнага карабля, цэнтральны пульт, над якім схіліўся пажылы сівы чалавек, а побач з ім стаяў...

хлопчык. Яму было крыху меней, чым нам, гадоў дзесяць або адзінаццаць.

З нашых грудзей вырваўся дружны ўздых захаплення і, напэўна, зайздрасці. Бо аб тым, што выпала гэтаму хлопчыку, мы не асмельваліся нават марыць уголас, калі збіраліся каля сваёй таполі.

— Цішэй вы! — крыкнуў Сашка. Ён назваў экспедыцыю, зорку, ля якой яна пабывала, год, калі вярнулася на Зямлю. Напэўна, гэта былі цікавыя звесткі. Але для мяне іх у той час быццам не існавала. Я не мог адарваць вачэй ад маленькага касманаўта. Я ўявіў сябе на яго месцы, і ў грудзях зрабілася горача. Я ледзь не выскачыў з-за парты — такая радасць ахапіла мяне.

Праз імгненне я адчуў, што нечага не разумею. У рубцы шмат прыбораў, на экранах свецяцца чужыя зоркі, у тэлескоп, напэўна, можна ўбачыць і планеты гэтых зорак. А хлопчык нібы нічога гэтага не заўважае. Ён пазірае некуды ўбок, і ўся яго фігура выказвае пакорлівую цярплівасць. Можа ён хворы?

Тым часам Сашка скончыў сваё выступленне. Ён зноў падышоў да стала настаўніка, націснуў кнопку. Шторы папаўзлі ўверх. У клас хлынула вясёлае сонечнае святло.

— Ты больш нічога не дабавіш, Саша? — спакойна, як заўсёды, калі мы, на яго думку, сказалі не ўсё, што павінны былі сказаць, спытаў настаўнік.

Сашка спыніўся, не дайшоўшы да парты:

— Было мала часу, каб дакапацца ў архіве да далейшых падзей. Але ўпэўнены, што хлопчык, калі вырас, стаў славутым касманаўтам, лепшым за іншых. У яго ж такая практыка!

Сашка пераможна агледзеў нас і сеў на сваё месца.

Мы чакалі, што настаўнік зараз паставіць адзнаку і выкліча наступнага. Мы памыліліся.

Настаўнік нечакана папрасіў:

— Уключы, Саша, праектар, — а сам зацямніў клас.

На экране зноў з'явілася рубка зоркалёта, штурман і хлопчык.

Нейкі час настаўнік маўчаў. А калі загаварыў, у класе адразу стала ціха, аж да звону ў вушах.

— У той час, калі хлопчык пачаў помніць сябе, — гаварыў настаўнік, — «Алтай» вяртаўся ў Сонечную сістэму. Да дому заставалася шэсць незалежных гадоў. Для вас гэтыя словы «незалежныя гады» — нібы музыка. Яны ж ужываюцца толькі ў прасторы, дзе вакол гарацць незнаёмыя зоркі, існуюць невядомыя планеты, дзе можна чакаць сустрэчы з чужымі цывілізацыямі. Усё гэта існуе і для касманаўтаў. Але для іх акрамя гэтага яшчэ ёсць і час. Той самы, незалежны, у адной назве якога крыецца ўсё. Яго нельга ні паскорыць, ні замарудзіць. Ён такі, які ёсць.

Гэта ведалі дарослыя. А хлопчыку тады было яшчэ ўсё роўна. Яму на караблі было цікава ўсё: і як самі па сабе адчыняюцца дзверы, варта толькі падысці да іх, і як робат-нянька ходзіць за ім следам, не даючы забрацца па лесвіцы ў машынную частку, і многае іншае. Хлопчык нарадзіўся на караблі. У яго было шмат цацак: яму іх рабілі і дарослыя, і робат. Цацкі былі працягам карабельнага жыцця. Гэта былі маленькія ракеты, усюдыходы, робаты і многае іншае, што, толькі большага памеру, знаходзілася ў карыстанні дарослых. Хлопчык не здзіўляўся. Ён лічыў, што так і павінна быць. Дарослыя большыя, таму ў іх і цацкі большыя. Ён толькі часам пытаўся, чаму дарослых на караблі многа, а ён заўсёды адзін.

Нарэшце (а здарылася гэта пасля доўгай дыскусіі дарослых, пра гэта хлопчык даведаўся значна пазней) яму паказалі фільмы аб Зямлі.

У першы раз родная планета не ўразіла яго. Ён глядзеў спакойна, а пасля спытаў: «Зямля — гэта як дэндрарый?» На зоркалёце быў такі куток, дзе раслі сапраўдныя дрэвы. Яму нічога не тлумачылі, толькі фільмаў больш не паказвалі.

А яму чамусьці вельмі захацелася паглядзець яшчэ хоць адзін такі фільм. І аднойчы, падгаварыўшы робата, хлопчык пайшоў у бібліятэку. Робату гэтага не забаранілі, не ўвялі ў праграму, і ён хутка знайшоў нейкі фільм, зняты на Зямлі.

Хлопчык зноў убачыў тое, што ён лічыў вялікім дэндрарыем. «Для дарослых», — падумаў ён, уражаны памерамі. І тут жа схамянуўся: сярод дрэў ішоў такі ж хлопчык, як ён, а мо і яшчэ меншы. Гэта было незвычайна, дзіўна і чамусьці выклікала незразумелае жаданне некуды пабегчы. Хлопчык застаўся на месцы, ён ведаў, што адсюль можна пабегчы толькі ў дэндрарый. А гэтага яму не хацелася зараз. Ён упершыню падумаў, што дэндрарый — тая ж цацка, але для дарослых.

Пакуль ён так разважаў, дзяцей на экране пабольшала. Яны бегалі, скакалі, лавілі адно аднаго. І смяяліся — гучна, весела, як ніхто не смяяўся на зоркалёце. Хлопчык перастаў глядзець на экран і сказаў робату: «Хачу да дзяцей». На караблі больш дзяцей не было, і робат павёў хлопчыка да бацькі.

Бацька ўважліва выслухаў яго блытаны расказ пра фільм, потым паклаў яму на галаву вялікую і цёплую руку і неяк цераз сілу сказаў: «Засталося шэсць незалежных гадоў. Тады...» Ён не растлумачыў, што будзе тады. І хлопчык спытаў: «А калі будзе гэта тады?» Бацька моўчкі павёў яго ў каюту, паваражыў над электроннай машынай, і з яе выпаўзла белая стужка з мноствам чорненькіх рысачак. Бацька пакорпаўся ў сваіх кішэнях, потым у шуфлядцы і нарэшце знайшоў маленькую палачку. Гэтай палачкай ён зрабіў на стужцы з першай рысачкі крыжык і аддаў яе сыну. «Кожны

дзень, — пачаў быў ён, але ўспомніўшы, што хлопчык не ўяўляе сабе дзень, паправіўся: — Кожны раз, як прагучыць вялікая сірэна, будзеш ставіць тут адзін крыжык. Як паставіш усе, тады мы прыляцім на Зямлю, і ты пойдзеш да дзяцей». Ён яшчэ раз пагладзіў сына па галаве і выйшаў.

А хлопчык пачаў разглядаць стужку. Ён хутка наставіў бы на ёй крыжыкаў і пабег бы на Зямлю ў вялікі дэндрарый. Але бацька загадаў чакаць сігналу сірэны. Хлопчык ведаў, што старэйшых трэба слухацца. Ён толькі аднойчы паставіў лішні крыжык. Усе астатнія разы рабіў, як казаў бацька, хаця ўрэшце яму ўжо надакучыла чакаць.

Рысачак заставалася так многа, што ён не мог іх нават пералічыць і не верыў, што іх калісьці не стане. Рысачкі сніліся яму, калі ён клаўся спаць. І, устаўшы, клікаў робата і адпраўляўся ў бібліятэку. Цяпер там быў толькі адзін фільм, той самы, што ён глядзеў некалі самавольна. Але іншага хлопчыку і не трэба было. Ён мог і гэты глядзець многа раз запар, кожны раз знаходзячы нешта новае, жаданае і цікавае...

Настаўнік змоўк. У блакітным паўзмроку мы бачылі толькі яго постаць, высокую, шыракаплечую, і гордую галаву з пасівелымі валасамі.

Маўчалі і мы, захопленыя расказам, здзіўленыя тым, што, аказваецца, наш настаўнік ведае і гэтую нелюбімую ім тэму. Нарэшце Мішка парушыў цішыню:

— Ён потым сустрэўся з дзецьмі?

Настаўнік павярнуўся да экрана, і мы ўбачылі, як ён паківаў галавой. Потым пачулі:

— Зоркалёт вярнуўся пазней. Была аварыя. А хлопчык... Ён тады ўжо вырас.

Нам стала шкада хлопчыка, які ні разу не пагуляў са сваімі равеснікамі. Адзін Сашка сказаў:

— Ну і што? Затое яму лягчэй было вярнуцца ў космас.

— Ён застаўся на Зямлі, — адказаў настаўнік.

І мне здалося, што яго голас задрыжаў. Але мне гэта, напэўна, толькі здалося. Праз момант настаўнік дадаў:

— Бо што можа быць лепшае за нашу цудоўную, цудоўную Зямлю!

— А той хлопчык, — вырвалася ў мяне, — дзе ён зараз?

Фіранкі папаўзлі ўверх. Зноў стала светла. Настаўнік стаяў за сталом, пазіраючы вышэй нашых галоў. І мне здалося... Мне здалося, што наш настаўнік вельмі падобны на таго штурмана, бацьку хлопчыка... і на самога хлопчыка...

1. Пра якія падзеі расказваецца ў апавяданні? Ці маглі яны адбывацца на самай справе?

2. Пра што марылі вучні незвычайнай школы? Раскажыце пра іх захапленне космасам.

3. Якім паказаны ў творы настаўнік? У чым прычыны яго абыякавасці да касмічных вандровак?

4. Чаму настаўнік не падтрымліваў сваіх вучняў у іх імкненні хутчэй трапіць у космас? Што ён ведаў пра міжпланетныя падарожжы?

5. Прыгадайце, што такое фантастыка? Якія адзнакі фантастыкі вы заўважылі ў гэтым апавяданні?

***Раіса Баравікова***

## Стужка ордэнская

*(Скарочана)*

І лёгкакрылы матыль
можа навеяць успаміны...

*З нататніка астранаўта*

Я ўжо даўно не быў у космасе, як, дарэчы, і доктар Савіч. Займаліся выключна зямнымі справамі. На сваёй ся-

дзібе доктар адвёў мне невялікі ўчастак зямлі, куды я перавёз з карабля свой батанічны сад і цяпер цэлымі днямі быў заняты доследамі. Многія расліны не прыжываліся ў зямным грунце, і мне даводзілася іх бясконца перасаджваць у розную глебу.

Быў пачатак верасня, а адна расліна — ну проста бы вылепленая са снегу, — якую я выкапаў на адной з планет далёкага сузор'я Вялікага Пса, так і не памяняла свайго белага колеру і толькі-толькі выпусціла першы лісток на Зямлі, у што я ўжо не верыў. Таму і хацеў як мага хутчэй паказаць яго доктару Савічу. Але той ужо сам гукаў мяне:

— Сы-ымон! Сымо-он, не паверыш: у нас госць!

Я, вядома ж, пайшоў да альтанкі, адкуль чуўся голас доктара, і пабачыў там Антона, камандзіра нашага экіпажа, з кім найчасцей даводзілася вылятаць у космас. Антон прыехаў да нас з прапановай, і калі мы выслухалі яго, дык адразу і пагадзіліся паляцець да сузор'я Цяльца ў накірунку Крабападобнай туманнасці.

Справа ў тым, што ўжо недзе з год таму назад Міжнародная асацыяцыя зоркавых палётаў паслала туды экспедыцыю паназіраць з невялікай адлегласці за гэтай загадкавай газавай туманнасцю, і карабель, дзе пілотам быў саксонец Ганс Мюлер, на адной з планет (трэба меркаваць, сузор'я Цяльца) пацярпеў катастрофу. Ніхто з членаў экспедыцыі, а іх было толькі чацвёра, не загінуў, але на Зямлю яны вярнуцца не маглі. Зоркалёт пад уздзеяннем невядомых энергій распаўся на некалькі частак. Саксонец настойваў на тым, каб па іх паляцелі менавіта мы — беларусы. Маўляў, пабачым там нешта надзвычай цікавае для сябе. Адным з членаў той экспедыцыі была псіхолаг Галя, якую мы неаднойчы бралі з сабою ў касмічныя падарожжы. Як было не паляцець?

І праз паўгода, дзесьці ўжо пад канец зімы, мы стартавалі...

Яшчэ была бачная ў зімовым небе прамяністая зорка Альдэбаран, якую нехта аднойчы назваў «вокам быка». Туды, да яе, і пралёг наш маршрут. Але да Альдэбарана мы не даляцелі, хаця былі зусім блізка ад гэтай зоркі і яе планетнай сістэмы. Так блізка, што маглі бачыць дзве планеты на сваіх экранах. Нечакана на сувязь з намі выйшаў саксонец, і наш робат-пілот адхіліўся ўправа ад іх, прытрымліваючыся тых каардынатаў, якія нам даў Ганс. І ўжо неўзабаве мы завіслі над зусім невялікім астэроідам, усяго кіламетраў пятнаццаць у дыяметры. З вышыні ён меў форму глыбокай талеркі: па краях — горы, а ў сярэдзіне — зялёная пляма, на ўскрай якой мы і апусціліся.

Перад намі ляжаў трапічны пальмавы лес, ды такі высокі, што белыя з чырвонымі дахамі пабудовы між пальмаў выглядалі як казачныя домікі, у якіх жывуць гномы. Але каля гэтых казачных дамкоў мы пабачылі не гномаў, а самых сапраўдных людзей-ліліпутаў у вельмі стракатым адзенні. Калі б яны мелі за спінамі крылы, дык іх можна было б прыняць і за казачных эльфаў. Наш карабель не прыцягваў іхняй увагі. Ён не быў для іх дзівам, і нас гэта, у адрозненне ад іх, здзіўляла. Можна было падумаць, што яны тут бачаць зоркалёты з іншых светаў штодня.

Ужо недзе з паўгадзіны мы ўзіраліся ў мясцовасць і вось пачулі радасныя крыкі: «Анто-он! Доктар Саві-іч! Сы-ымон!» Да карабля беглі Ганс Мюлер і Галя. Мы з палёгкаю ўздыхнулі. Робат-пілот не памыліўся, пасадзіў карабель там, куды і павінен быў пасадзіць. І пасля кароткіх слоў прывітання, пасля радасных абдымкаў, калі мы спусціліся на паверхню, саксонец прапанаваў прайсці да абломкаў іх карабля, дзе яны размясцілі некалькі пала-

так. Па дарозе ён расказаў, што тут з імі знаходзяцца яшчэ астрафізік — бельгіец Алекс — і бортмеханік…

Мы ўжо падыходзілі да палатак і адразу пабачылі даволі высокага чалавека, які спрабаваў падняць кавалак жалеза. Падобна, што гэта была дэталь насавой часткі карабля.

— Гэ-эй, бортмеханік, — крыкнуў саксонец. — Што ты там робіш?

— Я так разумею, мы хутка стартуем адсюль, — адказаў той. — Не пакідаць жа гэтае жалеззе тут! Трэба перанесці яго ў горы. Ліліпутам цяжка будзе гэта зрабіць.

Я быў не супраць падняцца ў горы. Карцела хутчэй агледзець гэтую малюпасенькую маляўнічую планетку, таму і сказаў:

— Я дапамагу!

І мы пацягнулі з бортмеханікам той цяжкі кавалак жалеза пад гару. Пальмы ўжо скончыліся. Мы паднімаліся, дакладней, прадзіраліся праз густы зараснік незямных карлікавых дрэў. І тут раптам зусім блізка пачуўся крык. У голасе былі і жах, і боль.

— Чакай, — сказаў я бортмеханіку. Кінуў жалезіну і пачаў прабірацца праз гушчар у напрамку голасу. Хутка я пабачыў у густой траве ліліпутку. Яна ляжала ніцма і кідалася з боку ў бок, спрабуючы скінуць з плячэй звярка, падобнага на зямную кошку.

— Р'ісь! Р'ісь! — крычала ліліпутка, а звярок упіўся зубамі ў яе шыю, і з раны сцякала кроў. Я паспрабаваў ухапіць звярка, але ён зашыпеў і ашчэрыўся.

— Ко-оця, мой ты харошы коця, — раптам вырвалася ў мяне, чаго я і сам не чакаў, і тут жа паспрабаваў пагладзіць звярка. Гэта яму спадабалася. І вось нарэшце я змог узяць яго на рукі і ўжо збіраўся дапамагчы падняцца ліліпутцы, якая цяпер толькі тоненька ўсхліпвала і ўсё яшчэ спуджана паўтарала:

— Р’ісь! Р’ісь!

Але тут з зарасніку выскачыў бортмеханік, а праз некалькі хвілін з’явіліся і ліліпуты. Адзін з іх падышоў да мяне, нешта сказаў, чаго я, вядома ж, не зразумеў. А астатнія трое падхапілі ліліпутку на рукі і зніклі ў зарасніку. За імі кінуўся і той, што нешта сказаў мне.

— Звер мог яе загрызці, — адазваўся бортмеханік.

— Ды які ж гэта звер? Самая сапраўдная кошка!

— Яна дзікая. Адпускай яе.

А кошка ўжо і сама выслізнула з маіх рук, церанулася аб нагу і пабегла ў зараснік.

— Ну што, бортмеханік? — сказаў я. — Дзе тая жалезіна? Пойдзем цягнуць яе далей...

І дзесьці праз гадзіну мы спусціліся з гары назад да палатак, дзе нас ужо чакаў прыгатаваны абед. Але есці селі не адразу. Я расказаў пра здарэнне.

— Цяпер да нас абавязкова прыйдуць ліліпуты, каб неяк табе аддзячыць, — сказаў саксонец.

— А чаму толькі яму? — не то абурана, не то з крыўдаю запытаўся бортмеханік.

— Хто ўратаваў ліліпутку, таму і падзяка, — адказаў Ганс. — Яны міралюбныя. Я за гэты даволі доўгі час, што тут мы прабылі, пачаў трошкі разумець іх мову.

— А я з некаторымі з іх нават пасябравала, — усміхнулася Галя.

— Ну і што яны з сябе ўяўляюць? — пацікавіўся доктар Савіч.

— Усю сваю тэрыторыю, а гэта, лічыце, невялічкі горад, яны называюць сваім каралеўствам, — пачаў расказваць Ганс. — У іх ёсць кароль. Вельмі стары і нямоглы, да ўсяго, кепска бачыць. У яго сем дачок і дванаццаць сыноў. Ну, а што да астатніх жыхароў, іх тут тысячы дзве, не

болей. Нярэдка складваецца ўражанне, што яны перасяленцы з нейкай іншай планеты, якія калісьці таксама пацярпелі тут катастрофу.

— І як жа яны называюць сваё каралеўства? — запытаўся Антон.

— Не паверыце: Бычыны хвост. Такое дзіўнае супадзенне, — адазваўся бельгіец. — Самі яны, мяркую, не ведаюць, што гэты астэроід знаходзіцца ў сузор'і Цяльца.

— Дарэмна ты так мяркуеш, — запярэчыла Галя. — У іх ёсць зоркавыя карты.

У гэты момант пачуліся музычныя гукі, быццам хтосьці некалькі разоў стукнуў па клавішах фартэпіяна. Мы ўсе пабачылі двух ліліпутаў, якія падыходзілі да нас. І Галя перавяла гаворку на іншае.

— Не ведаю, ці ўмеюць яны спяваць, — яна запытальна паглядзела на саксонца. — А вось іграюць бліскуча і без інструментаў. Пэўна ў іх языкі такія музычныя?

— Учора я прайшоўся па адной з іхніх вуліц, — сказаў саксонец, — і, пакуль ішоў, увесь час чуў гукі скрыпкі. У доміках расчыняліся вокны, з іх выглядвалі ліліпуты, і адразу ж пачынала гучаць вельмі прыемная мелодыя.

Мы ўсе ўздрыгнулі, здалося, што нехта зусім блізка ўдарыў у літаўры. Пасля гэтага ліліпуты звярнуліся да нас з прамовай. Ганс адразу ж пачаў перакладаць.

— Ты, Сымон, — звярнуўся ён да мяне, — уратаваў ад дзікага звера прынцэсу, малодшую дачку караля. І за гэты геройскі ўчынак кароль хоча ўзнагародзіць цябе ордэнам. Заўтра ён гэта зробіць тут, у нас. Прыйдзе сюды са сваёй світай. Але кароль не любіць, калі яму нешта падказваюць. Таму, каб каралю самому адразу было бачна, каму ўручаць ордэн, табе спачатку прышпіляць ордэнскую стужку. І паколькі кароль кепска бачыць, стужка будзе каляровая, вельмі яркая.

Саксонец прамовіў апошнія словы і паглядзеў на ліліпутаў. Яны варухнулі губамі, і зноў пачуліся літаўры. Пасля гэтага ліліпуты развіталіся і пайшлі, а мы ўсе, не без хвалявання, пачалі чакаць наступнага дня, які пачаўся для нас з непрыемнага паведамлення. Прыйшоў адзін з ліліпутаў і сказаў, што ордэнскія стужкі, якія знаходзіліся ў кабінеце іх вайсковага міністра, гэтай ноччу некуды зніклі, але цырымонія ўзнагароджання не адмяняецца. Таму, як толькі з'явіцца кароль са світай, нам усім трэба будзе стаць у строй і, калі кароль падыдзе да нас, я павінен буду зрабіць некалькі крокаў наперад, каб атрымаць ордэн.

Усё так і адбылося. Праз некалькі гадзін мы пабачылі шэсце, якое накіроўвалася да нашых палатак. Мы глядзелі на ліліпутаў і адначасова чулі цэлы аркестр. Усё навокал грымела, пілікала, звінела, пакуль шэсце не наблізілася да нас. Мы ўсе ўжо стаялі роўным строем. Я на некалькі крокаў выйшаў наперад і пабачыў, што тое ж самае зрабіў бортмеханік. Але кароль упэўнена ішоў да мяне, не звяртаючы ніякай увагі на бортмеханіка. І тут я згледзеў, што на маіх грудзях на світэры трапеча матыль, крылы якога нагадваюць ордэнскую стужку, а кароль ужо з нейкімі словамі (і не цяжка было здагадацца, што гэта былі словы падзякі) працягнуў мне чаканку ў форме медаля. Я зірнуў на яе, і ў мяне нават не знайшлося слоў, каб нешта сказаць у адказ, настолькі я быў уражаны. Адно глядзеў і глядзеў на гэты свой ордэн. А кароль і яго світа тым часам пакідалі ўжо нас. Зноў зазвінелі, запілікалі, загрымелі гукі аркестра, а я ўсё ўзіраўся ў выяву на чаканцы.

— Пакажы, што ты там разглядваеш, — папрасіў доктар Савіч.

— Не паверыш, — сказаў я. — На гэтай чаканцы наш Кастусь Каліноўскі!

І ўсе пачалі разглядваць чаканку, перадаючы з рук у рукі. Толькі бортмеханік пайшоў у адну з палатак і ўжо ледзь не да самага старту амаль не выходзіў з яе.

— Зазлаваўся, што не яму далі ордэн, — зазначыла Галя.

А да мяне падышоў Ганс Мюлер.

— У іх не толькі такія чаканкі ёсць, — сказаў ён. — Шмат іншых. Мне паказваў іх вайсковы міністр адразу пасля таго, як мы пацярпелі тут катастрофу. Запомнілася выява жанчыны, пад якой прачытаў надпіс: Еўфрасіння Полацкая. Хто яна?

— Вядомая асветніца, святая. З нашай глыбокай гісторыі, — адказаў я. — А Кастусь Каліноўскі — наш нацыянальны герой, які таксама застаўся ў нашай гісторыі. Але як гэтыя чаканкі тут апынуліся? Адкуль узяліся?!

На мае пытанні адказаў Антон:

— Пра гэта можна толькі здагадвацца. Думаю, яны з тых лятальных апаратаў, якія пасылаліся ў космас на самым пачатку, вельмі даўно. У іх часта ўкладваліся дыскі з запісамі пасланняў да чужых цывілізацый у іншыя светы і, канечне ж, чаканкі з выявамі нашых самых славутых людзей. Напэўна, адзін з тых апаратаў трапіў сюды, на гэты астэроід. І цяпер атрымалася ўсё як нейкае дзіва.

— Матыль таксама з серыі цудаў, — зазначыў доктар Савіч. — Не выпадкова ж ён сеў табе на грудзі якраз у той момант, калі з’явіўся кароль. Думаю, ён умее мысліць, ва ўсялякім выпадку адрозніваць, хто герой, а хто толькі хоча выглядаць героем.

Той матыль так і застаўся на світэры ў мяне на грудзях. І я ўзяў яго з сабою на карабель, бо тым жа днём мы вырашылі пакінуць астэроід. І, калі ўжо ўзляталі, знізу, з паверхні да нас даносіліся гукі чароўнай музыкі — гэта ліліпуты развітваліся з намі, а ў адсеку, дзе размясціла-

ся Галя, пачуўся крык. Я кінуўся да адсека, дзе ўжо быў доктар Савіч, і пабачыў у кутку раз'юшанага звярка, якога не мог не пазнаць. Адразу ж згадалася ліліпутка і той яе поўны жаху крык: «Р'ісь! Р'ісь!»

— Гэта, мае дарагія, рысь, — сказаў я, і ў мяне апошняе слова вымавілася больш цвёрда, чым у ліліпуткі. Але мне трэба было сказаць рысяня, таму што за час нашага палёту назад на Зямлю звярок вырас і стаў сапраўднай рыссю. Але перад тым, як мы прызямліліся на нашым касмадроме за Раўбічамі, у нас яшчэ была пасадка на Месяцы…

Сум і шкадаванне не пакідалі мяне на Зямлі. Я радаваўся, што мы прывезлі з далёкага чужога свету матыля, якога назвалі стужкай ордэнскай. Цешыла мяне думка, што недзе ў нашых глухіх лясах блукае дзікая рысь, якую, як паказаў час, так і не ўдалося прыручыць.

1. Хто ўваходзіў у склад касмічнага экіпажа беларусаў для палёту ў сузор'е Цяльца? З якім заданнем астранаўты выправіліся туды?

2. Якім паўстаў перад зямлянамі незнаёмы астэроід?

3. Хто яны, жыхары далёкай зямлі?

4. Якая бяда здарылася з ліліпуткай? Што можна сказаць пра ўчынак Сымона?

5. Прыгадайце, як кароль узнагароджваў Сымона ордэнам. Які цуд здарыўся ў той момант? Знайдзіце і зачытайце адпаведныя радкі.

6. Якім чынам чаканкі з выявамі славутых людзей Беларусі трапілі на далёкую планету?

7. Як адчуваў сябе Сымон пасля касмічнай экспедыцыі?

8. Пра што даведаўся і што зразумеў Сымон у выніку наведвання невядомага астэроіда? А якія думкі і меркаванні ўзніклі ў вас?

9. Чаму, на вашу думку, твор атрымаў такую назву?

*Анатоль Бутэвіч*

## Прыгоды віруса Шкодзі

*(Урывак)*

Не далёка і не блізка, а ў разумных глыбінях космасу заснавалася Чароўнае каралеўства — Сусветнае Сеціва. Адбывалася там незлічонае мноства дзівосных дзіваў, чарадзейных мараў і забаўных забаў.

І былі ў сеціўцаў такія чароўныя прылады, што камп'ютарамі называюцца. Усяго хапала жыхарам, ніякага гора не ведалі. А пра справы свае дзівосныя праз Інтэрнэт усяму сусвету расказвалі.

Каралём у іх быў Віндаўс Вялікі Першы, які дбайна аберагаў спакой і дабрабыт сваіх падданых.

Ды панадзіўся ў каралеўства хцівы вораг з незнаёмай планеты. Нехта вірус Шкодзя. З'яўляўся тады, калі яго ніхто не чакаў і не бачыў. А шкоду рабіў вялікую. То дамочкі сеціўцам папсуе, то спаліць і пераблытае электронныя праграмы ў камп'ютарах. З-за гэтага і жыццё ў каралеўстве разладзіцца. Не працуюць транспарт, пошта, знікае сувязь з Інтэрнэтам. А Шкодзя толькі засмяецца і — ходу. Неўзабаве ўжо ў іншым горадзе шкоду чыніць.

Так і жыў-дармаеднічаў вірус. Навучыўся за чужы кошт дабрабыт свой ладзіць. Нават радаваўся, задаволены.

Моцна гаравалі сеціўцы. Чаго толькі ні прыдумвалі, каб збавіцца ад назойлівага госця. Але нічога не дапамагала. Сабраў тады кароль Віндаўс Вялікі Першы лепшых вучоных і загадаў антывірусную праграму прыдумаць, меры перасцярогі знайсці.

Не адзін дзень і не адну ноч патрацілі вучоныя. Але нічога не прыдумалі. Не дапамог нават Інтэрнэт, які на ўсё здатны.

Вырашылі тады хітрасцю ўзяць. Угаварылі Віндаўса Вялікага аддаць за Шкодзю сваю дачку. Яна выведае сакрэт смерці віруса і ўратуе сеціўцаў. Доўга вагаўся кароль, але дзе ты дзенешся, калі ўсяму каралеўству небяспека пагражае.

Зірнуў Шкодзя і ледзьве дар свой шкодніцкі не страціў — на ўвесь сусвет прыгажуня.

— Што хочаш аддам, — кажа, — толькі будзь маёй жонкай. Мы з табой такія справы будзем рабіць, якіх ніхто не здолее. Станем самымі багатымі, самымі магутнымі і самымі вядомымі ў сусвеце.

— А хіба цяпер ты не багаты? — пакеплівае каралеўна. — Як жа я за бедняка пайду?

— Чаму гэта я бедны? — злуецца Шкодзя. — Я магу прысвоіць усе сеціўскія ўладанні, магу знішчыць жыхароў Сусветнага Сеціва. Нават караля...

— А хто ж тады будзе жыць на гэтых прасторах?

— Мы з табой. І дзеці нашы. Сам я несмяротны, і дзеці нашы несмяротнымі будуць.

— Я мо і пайшла б за цябе, — хітруе каралеўна, — але не веру ў тваю несмяротнасць.

— Не верыш? — распаляецца вірус. — Хочаш — дакажу?

— Хачу.

І прызнаўся Шкодзя, што мае ён тры смерці. Схаваны яны ў трох працэсарах, якія найгалоўнейшымі элементамі кожнага камп’ютара з’яўляюцца, імгненна апрацоўваюць любыя звесткі, усё на свеце ведаюць і запамінаюць.

Адна смерць у залатым працэсары знаходзіцца, які ў цёмнай пячоры вялізнай гары на залатым ланцугу вісіць. Сам Кашчэй Несмяротны на варце стаіць.

Другая смерць схавана ў сярэбраным працэсары, які да дна нетутэйшага акіяна прыкуты. Сцеражэ яго нядрэмны і ненаедны Акіянскі Цмок.

Трэцяя смерць тоіцца ў жалезным працэсары, які на зоркалёце ў міжсусветнай прасторы няспынна лётае, дыванам-невідзімкай ахінуты. І пакуль усе тры смерці не сыдуцца разам, ніхто не пераможа віруса Шкодзю.

Прызнаўся ён каханай, што толькі адзін раз за трынаццаць гадоў збірае разам працэсары, каб праверыць, ці жывуць там яго смерці. Зорнай ноччу робіць гэта, на вялікую поўню.

— Наступная ноч праз тыдзень будзе, — кажа Шкодзя. — Тады я і пакажу табе мае таямніцы.

— Пасля таго і справім заручыны, — прапанавала каралеўна.

Пераможна ўсміхнуўся вірус, рукі ад шчасця пацёр.

А тут і зорная ноч з вялікай поўняй наступіла. З'явіўся Шкодзя да сваёй абранніцы. Бацька яе, падслухаўшы расказ віруса, марна часу не губляў. Загадаў змайстраваць магутную лазерную стралу, якая любыя замкі адмыкае, самыя моцныя сховы адчыняе.

Пачаў вірус паказваць каралеўне свае падарункі, багаццямі незлічонымі хваліцца. А ёй не церпіцца чароўныя працэсары пабачыць.

Пляснуў у далоні Шкодзя, і з залатым працэсарам з'явіўся Кашчэй Несмяротны. Другі раз пляснуў, і Акіянскі Цмок з сярэбраным працэсарам паўстаў перад ім.

Не стрымаліся сеціўцы, выстралілі лазернай стралой. Мёртвы ўпаў Кашчэй, ажно гул па сусвеце пайшоў. Следам Цмок Акіянскі зваліўся, адно вадаспады бурлівыя завіравалі. А магутная страла распаласавала працэсары. Вылецелі адтуль дзве смерці, за пазуху віруса схаваліся. І адразу згорбіўся ён, аслеп на адно вока, левая рука перастала слухацца.

Аднак дарэмна паспяшаліся сеціўцы. Не дачакаліся, пакуль Шкодзя здыме дыван-невідзімку з трэцяга працэсара. Сабраў вірус апошнія сілы, схапіў ацалелы працэсар і ў чорны сусвет кінуўся. Забыўся і пра нявесту сваю — абы жывым застацца.

Схаваў трэцюю смерць на самай далёкай ад Сонца планеце. Замест ключа код спецыяльны прыдумаў, у галаве сваёй трымае, нікому не давярае, нават ахоўнікам.

Хоць і баіцца лазернай стралы вірус, а шкоднічаць не перастаў. Нахабна помсціць сеціўцам за сваю абразу. Толькі з'яўляецца ў Сусветным Сеціве ў плашчы-невідзімцы. І справы свае чорныя стараецца таемна рабіць.

Сеціўцы ж на чале з каралём Віндаўсам Вялікім Трэцім дагэтуль не ведаюць, як адолець назойлівага Шкодзю.

А ты гатовы ім дапамагчы?

1. Што ўяўляе сабой чароўнае каралеўства — Сусветнае Сеціва?

2. Хто ён, *хціві вораг з незнаёмай планеты*? Чаму сеціўцы баяцца яго?

3. Як сеціўцы вырашылі абхітрыць і перамагчы віруса Шкодзю?

4. У чым сакрэт яго несмяротнасці?

5. Чаму Шкодзя раскрыў таямніцу сваёй смерці?

6. Як вірус выратаваўся ад гібелі? Ці дараваў ён сеціўцам?

7. Паразважайце, чым можна дапамагчы жыхарам каралеўства пазбавіцца ад назойлівага і небяспечнага госця — камп'ютарнага віруса?

## Кантрольныя пытанні і заданні

1. Прыгадайце асноўныя адметнасці апавядальных твораў (на прыкладзе твора Уладзіміра Шыціка «Настаўнік»).

2. Каб падрабязней даведацца пра далейшы лёс доктара Савіча і калі вас зацікавілі касмічныя падарожжы, прачытайце кнігу Р. Баравіковай «Казкі астранаўта» ў час летніх канікул.

3. Калі б вам прапанавалі працягнуць аповед пра віруса Шкодзю, якія далейшыя прыгоды вы выбралі б для яго? Як мог скласціся яго далейшы лёс?

4. Якая роля мастацкай выдумкі ў творы Анатоля Бутэвіча «Прыгоды віруса Шкодзі»?

5. Падрыхтуйце калектыўную замалёўку на фантастычную тэму.

# VIII. Слова ўсміхаецца...

## Пра байку

Байка — адзін з найбольш любімых у народзе жанраў мастацкай творчасці.

*Байка — твор павучальнага ці сатырычнага характару, напісаны часцей за ўсё вершаванай мовай.*

Героі баек — жывёлы, расліны, рэчы, якія нагадваюць людзей, іх паводзіны і норавы. У байках высмейваюцца чалавечыя заганы і недахопы, дрэнныя з'явы ў навакольным жыцці. *Мараль* (вывад, выснова) у байцы — гэта ацэнка паводзінаў і ўчынкаў персанажаў, якую выказвае ў творы аўтар. Часцей мараль падаецца ў канцы байкі. Смех у байках з'едлівы, выкрывальны, пацяшальны.

1. Што такое байка?
2. Калі і дзе ўзнікла байка?
3. Чым байка адрозніваецца ад іншых камічных (гумарыстычных) твораў?

***Кандрат Крапіва***

### Кукарэку

Важак курынай чарады
Фарсісты, хоць не малады,
Такі быў зух,
Што рызыкі хапіла б і на двух,
Як прадзеды яго спрадвеку,
І ён штодзень галёкаў кукарэку:
Перад світаннем, нацямочку,
На седале правёўшы ночку,

Ён звонкі голас падаваў,
Каб, хто жывы, ўставаў.
І — дзіва дзіўнае! — як па сігналу,
Усё навокал ажывала:
Спявалі птушкі ў бары,
Тарахкалі ў калгасе трактары,
На ферму да кароў спяшаліся даяркі, —
У рух прыходзіла сяло,
І сонца, ўстаўшы з-за гары,
Дарыла першы промень яркі.
Тут Пеўню ў галаву прыйшло,
Што гэта ён такую мае ўладу,
Што без яго загаду
І сонца б не ўзышло.
Ну хто б такому даў бы рады?
Натхнёны думкаю такой,
Ён храбра вёў курэй на грады,
Дзе грэблі цэлай талакой.
Калі ж драпежніцкі атрад
Аднойчы шуганулі з град
І цырымоніцца не сталі,
А нават пугай адхвасталі,
Ён гэтага не мог сцярпець
І даў зарок: — Не буду болей пець
Ні досвіткам, ні днём.
Няхай жа ўсё спіць мёртвым сном,
Пакуль я з гадзік памаўчу.
Ох, я іх правучу! —
І сеў на седала — вучыць.
Мінае ноч, а ён маўчыць.
Змяняе золак цемру ночы
І спеў птушыны ўжо гучыць,
А ён заплюшчыў вочы
І маўчыць.
Ужо і сонейка ўзышло,
Усё навокал ажыло.

І злосць і дзіва недарэку:
— Ды як жа так! Без кукарэку?!
Я раіў бы любому чалавеку,
Які часамі рэй вядзе
І не ў курынай грамадзе,
Не захапляцца ўласным «кукарэку»,
Калі ўсе ведаюць напэўна,
Што сонца ўзыдзе і без Пеўня.

1. Якая думка прыйшла аднойчы ў галаву «важаку курынай чарады»?
2. За што пакаралі «драпежніцкі атрад»?
3. Якую помсту людзям прыдумаў Певень?
4. Якія людскія недахопы высмейваюцца ў байцы? Як называюць падобных людзей у народным асяродку?
5. Якімі словамі сам аўтар называе Пеўня?
6. Перачытайце і пракаменціруйце мараль байкі.
7. Прачытайце твор па асобах. Пры чытанні байкі перадайце аўтарскую інтанацыю, яе адценні, характар паводзінаў персанажаў.
8. Падбярыце вядомыя вам прыказкі, якія б адпавядалі апісанай у байцы сітуацыі.
9. Паспрабуйце стварыць інсцэніроўку па гэтай байцы. Падбярыце выканаўцаў, прадумайце позы, жэсты, міміку дзейных асоб, абмяркуйце ўсе дэталі пастаноўкі: дэкарацыі, касцюмы.
10. Падрыхтуйце вусную гумарыстычную замалёўку на падставе ўласных назіранняў або сітуацыі, расказанай у любой іншай байцы.

***Алесь Звонак***

## Гарбуз

Здараецца ж такое: на гародзе
Пад сонцам вырас велікан-гарбуз!
Прыгожы, круглы, важкі — дзіва, й годзе! —
Нібыта не гарбуз. А важны туз!

Глядзеў звысоку ён пры ўсім народзе
На землякоў, нібы на чарвякоў:
— Вы — драбяза, ды пры такой пародзе
Вас не адрозніш нават ад гуркоў!

Так выхваляўся ён, так надзімаўся —
Чуваць было, бадай, за тры вярсты!
Ды вось бяда — нябога не ўтрымаўся
І лопнуў, нібы выстрал халасты.

Выснова гэткая: калі зазнаўся —
То сам, як той гарбуз, нутром пусты!

1. Чым вылучаўся гарбуз сярод насельнікаў агарода?
2. Раскажыце, як трымаў сябе гарбуз.
3. Чым завяршылася пахвальба гарбуза? Што стала з ім? Ці выпадкова яго напаткала такая доля?
4. Як ставіцца аўтар да свайго героя? Як вы думаеце, хто падразумяваецца пад вобразам гарбуза?
5. У якіх радках заключана мараль байкі? Пра якога чалавека звычайна гавораць, што ён *нутром пусты*?
6. Знайдзіце ў байцы параўнанні. Як яны дапамагаюць ахарактарызаваць героя і яго паводзіны?
7. Намалюйце ілюстрацыю да байкі.

## Кантрольныя пытанні і заданні

1. Прыгадайце байкі, якія вам запомніліся. Прачытайце (ці раскажыце іх на памяць) на факультатыўных занятках.
2. Прыгадайце смешнае ці павучальнае здарэнне з вашага жыцця. Паспрабуйце скласці пра гэта гумарыстычную замалёўку ці байку.

# Кароткі слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў

**Алегорыя** — іншасказанне; мастацкі прыём, калі нейкая думка ці паняцце перадаюцца праз канкрэтны вобраз — паводзіны жывёлы, асаблівасць расліны, прадмета.

**Апавяданне** — невялікі празаічны твор, у якім расказваецца пра асобную падзею, выпадак або здарэнне ў жыцці героя. У апавяданні няшмат персанажаў, дзеянне адбываецца на працягу невялікага адрэзка часу.

**Апавядальнік** — асоба, ад імя якой вядзецца аповед. Калі расказвае пісьменнік непасрэдна ад свайго імя — гэта *аўтар-апавядальнік*. Калі пра ўбачанае і перажытае апавядае адзін з герояў твора, удзельнік падзей, яго называюць *героем-апавядальнікам*.

**Апісанне** — спосаб паказу жыцця, мастацкая характарыстыка абставін, месца дзеяння, абмалёўка знешняга выгляду героя, карцін прыроды.

**Аповед** — паведамленне, расказ пра падзеі, паводзіны, учынкі герояў і іх узаемаадносіны; рух і развіццё дзеяння ў творы.

**Аповесць** — мастацкі твор, пераважна празаічны, у якім расказваецца пра шэраг падзей, што адбываюцца на працягу значнага перыяду жыцця галоўнага героя, паказваюцца яго ўзаемаадносіны з іншымі персанажамі.

**Байка** — гэта невялікі, часцей вершаваны твор сатырычнага зместу з алегарычным сюжэтам і вывадам (мараллю).

**Вобраз мастацкі** — створаная ва ўяўленні пісьменніка карціна жыцця, якая адлюстроўвае яго думкі, пачуцці і эмацыянальна ўздзейнічае на чытача. Мастацкім вобразам можа быць герой твора — чалавек, жывёла, нават прадмет, з’ява прыроды; а можа быць пейзаж, мастацкае апісанне нейкай рэчы, з’явы.

**Гіпербала** — моцнае перавелічэнне ўласцівасцей, якасцей прадмета або з’явы з мэтай мастацкай выразнасці.

**Гукапіс** — гукавыя паўторы ў вершаванай мове, якія ўзмацняюць яе мілагучнасць і сэнсавую выразнасць.

**Гумар** — паказ чаго-небудзь у камічнай, дабрадушна-смешнай форме.

**Дэталь** — рыса, выразная падрабязнасць у паказе паводзін, апісанні знешнасці героя, абстаноўкі. Надае карціне, эпізоду эмацыянальную афарбоўку.

**Зваротак** — эмацыянальны зварот аўтара да чытача, героя, да з'яў прыроды і інш.

**Ідэя** — абагульненая думка, асноўны сэнс мастацкага твора, тое галоўнае, што хацеў сказаць аўтар.

**Інсцэніроўка** — перапрацоўка літаратурнага твора для сцэны, пастаноўка спектакля па гэтым творы.

**Інтанацыя** — характар вымаўлення фразы, у якім выяўляюцца пачуццё, душэўны стан, адносіны чалавека да прадмета размовы ці чытання. Інтанацыя складаецца з мелодыкі, тэмпу і тэмбра маўлення.

**Іронія** — мастацкі прыём, спосаб камічнага паказу, у аснове якога ляжыць стоеная насмешка: сцвярджаецца супрацьлеглае таму, што думаюць пра асобу ці прадмет.

**Кампазіцыя** — уся складаная будова літаратурнага твора, размяшчэнне і спалучэнне ўсіх яго частак, раздзелаў, эпізодаў, сцэн.

**Легенда** — фантастычнае апавяданне, заснаванае на паэтызацыі, услаўленні гістарычных падзей і народных герояў.

**Літаратурны герой** — мастацкі вобраз чалавека, які паказаны ў творы. Ужываюцца таксама паняцці: персанаж, дзейная асоба, літаратурны характар.

**Метафара** — перанясенне ўласцівасцей адной з'явы на другую, чым-небудзь падобную на яе.

**Міф** — народнае паданне, у якім увасоблены (або жывой істоты) уяўленні нашых продкаў пра паходжанне свету, жыццё прыроды і месца ў ёй чалавека.

**Паралелізм** — кампазіцыйны прыём, пры якім два вобразы, чым-небудзь падобныя або процілеглыя, раскрываюцца ў супа-

стаўленні, паралельна, у выглядзе разгорнутага *параўнання*. Сустракаецца так званы *адмоўны* паралелізм.

**Параўнанне** — мастацкі прыём, характарыстыка прадмета, з’явы пры дапамозе супастаўлення яго з іншым на аснове іх падабенства.

**Паўза** — перапынак у гучанні фразы.

**Паэма** — буйны вершаваны твор, часцей сюжэтны, які расказвае пра важныя падзеі, выяўляе глыбокія перажыванні аўтара і яго герояў.

**Паэтычны твор** — мастацкі твор, напісаны вершаванай мовай.

**Пейзаж** — апісанне ці малюнак прыроды ў літаратурным творы, які дае магчымасць уявіць месца дзеяння, характарызуе душэўны стан героя.

**Рэмарка** — аўтарская заўвага ў тэксце п’есы, дзе даюцца тлумачэнні пра паводзіны героя, яго знешні выгляд, узрост, адзенне, рухі, жэсты, міміку, а таксама апісваюцца абстаноўка на сцэне, дэкарацыі, асвятленне, музычнае суправаджэнне і інш.

**Рэпліка** — словы, з якімі адзін персанаж п’есы звяртаецца да другога.

**Рытм** — раўнамернае паўтарэнне, чаргаванне націскных і ненаціскных складоў. Адна з найважнейшых адзнак верша.

**Рыфма** — сугучнасць канчаткаў вершаваных радкоў.

**Сатыра** — вострае, з’едлівае выкрыццё адмоўных з’яў жыцця і недахопаў чалавечага характару.

**Сімвал** — умоўнае абазначэнне думкі, ідэі, перажывання, з’явы праз мастацкі вобраз, які нечым нагадвае іх.

**Сюжэт** — паслядоўнае разгортванне падзей, у якіх выяўляюцца характары і ўзаемаадносіны герояў.

**Тэма** — жыццёвая з’ява або кола з’яў, пра якія ідзе ў ім размова.

**Увасабленне** — мастацкі прыём, калі нежывым, неадушаўлёным прадметам і з’явам надаюцца ўласцівасці чалавека або жывых істот.

**Эпітэт** — мастацкае азначэнне, якое вобразна характарызуе з’яву, прадмет, чалавека.

# Літаратура


Беларуская міфалогія : энцыклапедыч. слоўнік. — Мінск, 2006.

Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2 т. — Мінск, 2005—2006.

Лакотка, А. І. Сцежкамі дзядоў: Этнаграфічныя нарысы : кніга для вучняў / А. І. Лакотка, С. В. Барыс. — Мінск, 1986.

Легенды і паданні / склад. М. Я. Грынблат, А. І. Гурскі. — Мінск, 1983.

Народная культура Беларусі : энцыклапедыч. даведнік / пад агул. рэд. В. С. Цітова. — Мінск, 2002.

Народная спадчына : энцыклапедыч. даведнік / пад рэд. В. С. Цітова. — Мінск, 2002.

Народныя казкі-байкі, апавяданні, мудраслоўі / уклад. і рэд. Н. С. Гілевіча. — Мінск, 1983.

Пятроўская, Г. Л. Жывая спадчына / Г. Л. Пятроўская. — Мінск, 1988.

Роднае слова захапляе, узбагачае, выхоўвае / скл. М. Б. Яфімава. — Мінск, 1991.

Этнаграфія Беларусі : энцыклапедыя. — Мінск, 1989.

# Змест


**Дарагі дружа!** . . . . . . . . . . . . . . 3

**I. Слова прамаўляе...** . . . . . . . 5
*Генадзь Бураўкін.*
Край мой . . . . . . . . . . . . . . . . 5
Мастацтва выразнага чытання лірычнага верша . . . . . 6
*Янка Сіпакоў.*
«Дружа мой!..» . . . . . . . . . . . . 8
*Сяргей Законнікаў.*
«Зямля мая...» . . . . . . . . . . . . 9
Кантрольныя пытанні і заданні . . . . . . . . . . . 10

**II. Слова заварожвае...**
Міфы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 10
*Анатоль Бутэвіч.*
Перуновага племені дзеці. (Скарочана) . . . . . . . . 11

**III. Слова захапляе...** . . . . . . 33
Фальклор і літаратура . . . . . . 33
*Людміла Рублеўская.*
Янук, рыцар Мятлушкі . . . . 34

**IV. Слова распавядае...** . . . . 49
*Якуб Колас.* Даль . . . . . . . . . 49
*Ханс Крысціян Андэрсен.*
Садоўнік і гаспадары . . . . . 52
Кантрольныя пытанні і заданні . . . . . . . . . . . 61

**V. Слова чаруе...** . . . . . . . . . . . . 61
*Аркадзь Куляшоў.*
Пра восень . . . . . . . . . . . . . . 61
*Аляксей Пысін.*
«Не адчувае лес зямлі...» . . 63
Выяўленчыя сродкі мовы ў мастацкім творы . . . . . . . . . 63
*Язэп Пушча.* Раніца . . . . . . . 66
*Васіль Вітка.* Верасы . . . . . 67
Мастацкі вобраз у літаратурным творы . . . . . . 68
Кантрольныя пытанні і заданні . . . . . . . . . . . 69

**VI. Слова хвалюе...** . . . . . . . . . 70
*Карусь Каганец.*
Скрыпач і ваўкі . . . . . . . . . . 70
*Сяргей Тарасаў.* Фрэскі . . . . 73
Пра апавядальныя творы . . . . 81
*Васіль Быкаў.* Сваякі . . . . . . 83
Пра кампазіцыю . . . . . . . . . . . 93
*Васіль Вітка.*
Трывога ў Ельнічах . . . . . . . 94
Мастацкае расказванне . . . . 104
Кантрольныя пытанні і заданні . . . . . . . . . . 105

**VII. Слова ўражвае…** . . . . 105
*Уладзімір Шыцік.*
Настаўнік . . . . . . . . . . . . . . 105
*Раіса Баравікова.*
Стужка ордэнская. (Скарочана) . . . . . . . . . . . . 114
*Анатоль Бутэвіч.*
Прыгоды віруса Шкодзі. (Урывак) . . . . . . . . . . . . . . 123
Кантрольныя пытанні і заданні . . . . . . . . . . 126

**VIII. Слова ўсміхаецца...** . . . 127
Пра байку . . . . . . . . . . . . . . . . 127
*Кандрат Крапіва.*
Кукарэку . . . . . . . . . . . . . . . 127
*Алесь Звонак.* Гарбуз . . . . . 129
Кантрольныя пытанні і заданні . . . . . . . . . . 130

**Кароткі слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў** . . . . . . . . . . . . . . . 131

**Літаратура** . . . . . . . . . . . . . . 134

В у ч э б н а е   в ы д а н н е

Беларуская літаратура
Факультатыўныя заняткі

**ЦІТОВА** Людміла Канстанцінаўна

**«СЛОВА — РАДАСЦЬ, СЛОВА — ЧАРЫ…»**

**6 клас**

***Дапаможнік для вучняў агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання***

Рэдактар *Н. Ф. Крыцкая*
Мастацкі рэдактар *В. П. Калінін*
Камп’ютарная вёрстка *Л. В. Касцюкевіч*
Стыльрэдактар *В. В. Круглік*

Падпісана ў друк 8.09.2010. Фармат 60x84 $^1/_{16}$. Папера афсетная.
Гарнітура Times. Афсетны друк.
Ум. друк. арк. 3,72. Ул.-выд. арк. 3,78. Тыраж 3400 экз. Заказ .

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Літаратура і Мастацтва».
ЛИ 02330/0494044 ад 03.02.2009.
Вул. Захарава, 19, 220034, г. Мінск.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства
«Друкарня “Перамога”».
ЛП 02330/0494182 ад 03.04.2009.
Вул. Таўлая, 11, 222310, г. Маладзечна, Рэспубліка Беларусь.